Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 ЛІСТАПАДА 2008 г.
АЎТОРАК
№ 212 (26325)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

МЫ І НАШЫ ДЗЕЦІ

У вас цяжкасці ва ўзаемаадносінах са сваім дзіцем? Вы заўважаеце, што апошнім часам ваш сын ці дачка сталі вельмі раздражнёнымі, а прычыну гэтага не можаце зразумець. Як быць? Як увогуле захаваць псіхічнае здароўе падрастаючага пакалення і як засцерагчы нашых дзяцей ад непатрэбных комплексаў і шкодных звычак? Аб усім гэтым можна будзе пагаварыць на «прамой лініі» з **галоўным пазаштатным спецыялістам па дзіцячай псіхіятрыі, асістэнтам кафедры псіхіятрыі і медыцынскай псіхалогіі БДМУ кандыдатам медыцынскіх навук Інай Віктараўнай ПЯТНІЦКАЙ.**

«Прамая лінія» адбудзецца **13 лістапада, у чацвер, з 16.00 да 17.00 па тэлефонах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.** Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах: 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).

Расійская карпарацыя «Растэхналогіі» мае намер рэалізаваць у Беларусі ўзаемавыгадныя праекты

Беларусь бачыць вялікія перспектывы супрацоўніцтва з расійскай дзяржаўнай карпарацыяй «Растэхналогіі». Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў 10 лістапада на сустрэчы з генеральным дырэктарам карпарацыі Сяргеем Чэмезавым.

Расійская дзяржаўная карпарацыя «Растэхналогіі», створаная ў ліставадзе 2007 года, аб'ядноўвае больш як 400 прадпрыемстваў самага шырокага спектра — ад металургіі, цяжкага машынабудавання, хіміі да авія- і прыборабудавання.

«Ваша карпарацыя вельмі цікавая нам, таму што займаецца прыкладна тым жа, чым 85 працэнтаў эканомікі нашай краіны. Нам вельмі выгадна супрацоўніцтва з Расіяй па гэтых напрамках. Таму нам цікавая сённяшняя сустрэча і перспектывы супрацоўніцтва», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што існуе двухбаковая зацікаўленасць у тым, каб пачаць глабальнае супрацоўніцтва з карпарацыяй «Растэхналогіі». «Нам цікава структураванне вашай карпарацыі. Гэта вельмі выгадна і важна, па-першае, таму што гэта пэўны вопыт, а па-другое, нашы прадпрыемствы маюць магчымасць непасрэдна кантактаваць з вамі», — адзначыў беларускі лідар.

Цяпер шэраг буйных беларускіх заводаў і навукова-вытворчых аб'яднанняў падтрымліваюць устойлівыя кааперацыйныя сувязі з прадпрыемствамі гэтай расійскай карпарацыі. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў прадпрыемстваў ёсць жаданне падтрымліваць гэтыя кантакты для развіцця кааперацыйных сувязяў і ў далейшым. На думку кіраўніка дзяржавы, гэта добрая магчымасць, каб развівацца разам, і для гэтага «неабходны дадатковы імпульс, сігнал да супрацоўніцтва».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ўзаемадзеянне з расійскай карпарацыяй Беларусі выгадна і ў святле сітуацыі ў сусветнай эканоміцы.

Гаворачы аб сусветным фінансавым крызісе, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта момант, калі павінны прымацца самыя сур'ёзныя рашэнні, калі павінна быць большая лібералізацыя эканомікі і большая свабода, каб выйсці з крызісу». Ён таксама дадаў, што ў Беларусі дзяржава не страціла пры гэтым эканамічны руль кіравання.

«У Беларусі людзі павінны працаваць, як працавалі да гэтага часу. Абвала ў краіне няма, асабліва ў фінансах», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, людзі давяраюць уладзе і банкаўскай сістэме, на што дзяржава адказвае стапрацэнтным гарантаваннем укладаў насельніцтва. «Сёння ў дзяржаве грошай больш, чым у насельніцтва ва ўкладах», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што стабільная сітуацыя ў Беларусі прывабная і для расіян і ўкраінцаў, якія размяшчаюць свае ўклады ў беларускіх банках.

У сваю чаргу генеральны дырэктар карпарацыі Сяргей Чэмезаў падкрэсліў, што «ўжо наспела неабходнасць, якая прымушае аб'ядноўвацца». Ён паведаміў, што ў складзе карпарацыі створана 19 холдынгаў, у якія ўваходзіць больш як 400 прадпрыемстваў. Сяргей Чэмезаў дадаў, што ўсе прадпрыемствы зацікаўлены ў супрацоўніцтве з Беларуссю.

Каментуючы вынікі сустрэчы, генеральны дырэктар «Растэхналогіі» адзначыў, што расійская карпарацыя прапанавала Беларусі стварыць сумесныя прадпрыемствы. «Для нас, напрыклад, вельмі цікавы МАЗ, Мінскі завод колавых цягачоў, — сказаў ён. — Хацелася б стварацьсумесныя вытворчасці, але не для таго, каб канкурыраваць паміж сабой на агульным рынку, а размяркоўваць яго, каб мы маглі канкурыраваць з еўрапейскімі, амерыканскімі, кітайскімі кампаніямі».

Сяргей Чэмезаў падкрэсліў, што напрамкі супрацоўніцтва паміж беларускімі і расійскімі прадпрыемствамі разнапланавыя: ад узаемадзеяння ў абаронным прамысловасці да супрацоўніцтва ў грамадзянскім аўтамабілебудаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Барака Абаму з перамогай на выбарах Прэзідэнта ЗША

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Барака Абаму з перамогай на выбарах на пасаду Прэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

УКЛАДЧЫКІ АЦЭНЯЦЬ ГАРАНТЫІ...

Экспертыза «Звязды»

Дэкрэт Прэзідэнта Беларусі, у адпаведнасці з якім прадстаўляюцца поўныя гарантыі дзяржавы на вяртанне банкаўскіх укладаў фізічных асобаў, і ануляванне сістэмы дэкларавання не трэба разглядаць як нешта экстраардынарнае, лічыць намеснік дырэктара «Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі» Георгій Грыц. Гэтае рашэнне, на яго думку, вельмі добра ўпісваецца ў палітыку па лібералізацыі эканомікі ў цэлым, якую абазначыў кіраўнік дзяржавы і якая актыўна рэалізуецца Урадам.

Паводле меркавання эксперта, прыняцце дэкрэта і ўказа накіравана на прыцягненне ў краіну рэсурсаў як на ўнутраным, так і знешнім рынках.

— У нас прынятая праграма карэннай мадэрнізацыі прамысловасці, і для гэтага патрэбны вялікія фінансавыя рэсурсы, — гаворыць Георгій Грыц. — На сусветных рынках практычна не засталося свабодных фінансавых рэсурсаў, а па-другое, яны істотна падаражэлі (стаўка ЛІБОР за апошнія паўгода выраслa ў 2 разы — амаль да 5 працэнтаў). Таму зробленыя захады — на карысць рэспублікі і вельмі важныя для эканомікі. Што датычыцца прынятых рашэнняў па стапрацэнтным гарантаванні ўкладаў і адмене дэкларавання па іх, то такіх унікальных умоў я не ведаю ні ў адной краіне свету.

Гаворачы аб тых прывабных умовах па захоўванні зберажэнняў у беларускіх банках, якія створаны, эксперт заўважае, што ў бліжэйшы час насельніцтва рэспублікі будзе больш актыўна ўкладваць грошы ў айчынныя фінансавыя ўстановы. У сярэднетэрміновай перспектыве, калі весці гутарку аб знешніх рэсурсах, на яго погляд, хутчэй за ўсё, трэба разлічваць на расійскія грошы, таму што ў РФ умовы для ўкладчыкаў менш спрыяльныя: страхаванне там абмяжоўваецца зусім іншымі сумамі, больш за тое — у гэтай краіне працуе сістэма дэкларавання. Разам з тым, у бліжэйшыя два-тры гады масавага ўнясення ўкладаў фізічнымі асобамі з-за мяжы ён не прагназуе. І тлумачыць, што для гэтага патрэбна атрымаць пэўны крэдыт даверу. — Тая ж Швейцарыя, — гаворыць Георгій Грыц, — якая фарміруе да 10 працэнтаў свайго бюджэту за кошт банкаўскай сферы, стагоддзямі фарміравала імідж краіны як банкаўскага афшору. Таму не трэба спадзявацца, што сюды адразу ж пойдуць з Амерыкі ці Англіі інвестары са сваімі мільярдамі. Хоць у гэтым напрамку захады зроблены зусім правільныя: каб навучыцца плаваць, неабходна зайсці ў ваду.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Нацбанк з 12 лістапада павышае стаўку рэфінансавання да 11 працэнтаў гадавых

Стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка Беларусі з 12 лістапада павышаецца на 0,25 працэнтнага пункта да 11 працэнтаў гадавых. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка.

Гэта рашэнне прынята ў мэтах павышэння даходнасці зберажэнняў у нацыянальнай валюце і далейшага ўмацавання фінансавай стабільнасці. Адпаведная пастанова ад 6 лістапада гэтага года № 163 прынята праўленнем Нацыянальнага банка.

ISSN 1990 - 763X

Адразу шэсць Гран-пры VI Міжнароднага дабрачыннага дзіцячага конкурсу творчасці, прыгажосці і таленту «Свет талентаў 2008», які прайшоў у Кіеве з 27 кастрычніка па 2 лістапада, прывезлі юныя беларускія прыгажуні, выхаванкі імідж-дызайн студыі «Вадалея» пры Рэспубліканскім Палацы культуры ветэранаў. Беларуская каманда (**Настасся БЯЛЕВІЧ, Настасся ГАМОЛКА, Настасся НІКІФАРАВА.**) заваявала Кубак абсалютнага чэмпіёна.

Фота БЕЛТА.

ТРЫ НАСТАССІ

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА: Спецыяльна для «Звязды»

«НАКОПЛЕНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ — У НОВУЮ ЭНЕРГІЮ РАЗВІЦЦЯ ЗАКАНАДАЎСТВА»

У сфарміраванай на нядаўніх парламенцкіх выбарах Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі чацвёртага склікання праходзіць першая сесія. З якой «стартавай пляцоўкі» дэпутаты пачалі выконваць свае паўнамоцтвы? Чаго можна чакаць ад народных выбраннікаў у заканатворчай, міжнароднай і міжпарламенцкай дзейнасці? На гэтыя і іншыя пытанні «Звяздзе» адказаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.

Фота БЕЛТА.

— Уладзімір Паўлавіч, вы ўжо акліматызаваліся на новай высокай пасадзе?

— Калі з досвітку да позняга вечара знаходзішся ў кругаверці спраў, то пра акліматызацыю не разважаеш. Усё адбываецца само сабой.

— Спрацавала кіраўніцкая загартоўка нядаўняга старшыні Віцебскага аблвыканкама, ды і сенатарская, напэўна, дапамагла?

— Вопыт за плячыма не насіць — чатырнаццаць гадоў усё-такі давялося ўзначальваць вобласць, тры скліканні запар выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Хоць і кажуць, што вопыт — справа нажыўная, нажываецца ён вялікай працай і незваротным, на жаль, часам. Аднак без перажытага і напрацаванага немагчыма стаць самадастатковым.

— Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — людзі самадастатковыя?

— Гэта абавязковая ўмова «прапуску» ў парламент. Пры існуючай у нас мажарытарнай выбарчай сістэме выбаршчыкі выказваюць сваё стаўленне не толькі да праграмы кандыдата ў дэпутаты, але і да яго дзелавых і асобасных якасцяў. Дэпутацкія мандаты атрымалі людзі, якія зарэкамендавалі сябе з самага лепшага боку як у працы, так і ў грамадскай дзейнасці. Яны з'яўляюцца выдатнымі прафесіяналамі сваёй справы, эфектыўнымі кіраўнікамі прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, устаноў адукацыі, навукі і аховы здароўя, здабылі высокі аўтарытэт плённай працай у рашённых, гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх органах дзяржаўнага кіравання, у тым ліку ў мясцовых Саветах. Лічу вельмі важным, што захавалася пераемнасць з Палатай прадстаўнікоў трэцяга склікання — амаль трэць яе дэпутацкага складу працуе ў новым парламенце. Гэта надае ўпэўненасці, што нам пад сілу прымерваецца да больш высокай планкі заканадаўчых задач, якую паставіў Прэзідэнт Беларусі А.Р. Лукашэнка.

— Але ж цяпер дэпутатам давядзецца развітацца са сваімі пасадамі і працаваць на прафесійнай аснове ў Палаце прадстаўнікоў?

— Абавязковая ўмова. Яны пра гэта ведалі, калі балатаваліся ў дэпутаты парламента. Трэба закасваць рукавы на новай дзялянцы, якая вымагае не менш ведаў, энергіі і руплівасці.

— Як вы лічыце, якія думкі ўзнікнуць у дэпутатаў-навічкоў, калі яны як след «запрагуцца» ў заканатворчую работу?

— Што яна вельмі складаная і вельмі працаёмкая.

— ...і руцінная?

— Можа і так, але я не ўкладваў бы ў гэта слова ў дачыненні да заканатворчасці негатыўны сэнс. Без дбайнай уседлівасці, карпатлівай прапрацоўкі мноства нарматыўных, інфармацыйных, аналітычных, статыстычных і іншых матэрыялаў законы не ствараюцца. Па сваім парламенцкім вопыце ведаю, што дэпутатам даводзіцца нярэдка даволі істотна прыкладаць руку да аўтарскай рэдакцыі прававога дакумента, пакуль ён, пасля шматлікіх кансультацый і ўзгадненняў, прымаецца ў канчатковым варыянце. Так што «руціна» — гэта нябачная старонняму вельмі важная праца, якая ў многім вызначае плённасць усяго заканатворчага працэсу.

— Палата прадстаўнікоў чацвёртага склікання ў даволі сціслы тэрмін вырашыла галоўныя арганізацыйныя пытанні. Вызначаны персанальны склад усіх 14 пастаянных камісій, выбрана іх кіраўніцтва, сфарміраваны Савет палаты. Дэпутаты раз'ехаліся па сваіх выбарчых акругах, а неўзабаве пачнуць абмеркаванне законапраектаў. Працуеце без раскачкі?

— Ёсць Закон «Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь» і Рэгламент Палаты прадстаўнікоў, якімі мы і кіруемся. Хто, як не парламентарыі, павінны паказваць прыклад законапаслухмянасці? Да таго ж час нашых парламенцкіх паўнамоцтваў абмежаваны, было б неразумна яго марнаваць, трэба максімальна насычаць яго канкрэтнымі справамі на грамадскую карысць, на карысць нашай дзяржаве, дзеля чаго мы і абраны дэпутатамі.

Перш за ўсё гэта заканатворчасць, на якой нам трэба засяродзіць першарадную ўвагу, каб мы стваралі законы новага пакалення, на што арыентаваў Нацыянальны сход Прэзідэнт. Падкрэсліваю: сапраўды новага пакалення.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Халаднавата і без ападкаў

На працягу тыдня захаваецца ўплыў зоны павышанага ціску, таму ападкаў не будзе, толькі ў сераду і чацвер у заходніх раёнах чакаюцца кароткачасовыя дажджы, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў. У сераду і чацвер уначы ад мінус 3 да плюс 4, удзень — 2—8 градусаў цяпла. З пятніцы да нядзелі мы зноў трапім у зону павышанага ціску. У гэтыя дні ў асобных раёнах туман, слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 3, удзень — 1—7 градусаў цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

НЕЗВЫЧАЙНЫ СКАРБ

У лесе ля гарадскога пасёлка Зябраўка Гомельскага раёна знойдзена вялізнае захаванне злучэння аднаго з самых загадкавых з рэдказямельных металаў — осмію.

Як паведаміў пошукавец гомельскага ваенна-патрыятычнага клуба «Гонар» Вячаслаў Чумакоў, экспертыза беларускай Акадэміі навук пацвердзіла, што рэчыва, якое знаходзіцца ў трох ямах у самаробнай упаковцы, створанай са смалы-жывіцы, змешанай з пяском — хларыд осмію. Яго колькасць пакуль цяжка вызначыць дакладна, але гэта не менш чым тона. Па адной з версій, супрацоўнікі НКУС у 1941 годзе перавозілі рэчыва з Магілёва, па другой — з Гомельскага банка. Такім чынам яны спрабавалі схаваць гэты скарб ад фашыстаў.

ДАВЕДКА: Осмій (Os), хімічны элемент VIII групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева, атамны нумар 76, атамная маса 190,2; адзін з плацінавых металаў. Некаторыя ізатопы каштуюць надзвычай дорага. Першы і адзіны экспарцёр чыстага осмію-187 — Казахстан, са студзеня 2004 года афіцыйна прапануе гэта рэчыва па цэнах 10 000 доларaў за 1 грам. Высокая цвёрдасць і выключная тугаплаўкасць дазваляюць выкарыстоўваць осмій і пакрыцці ім у вузлах шаравання. Ёсць звесткі аб прымяненні осмію ў ваенных мэтах, як частка артылерыйскіх снарадаў і боегаловак ракет. Таксама прымяняецца ў электроннай апаратуры авія- і ракетнай тэхнікі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

СТАЎКА ЭКСПАРТНАЙ ПОШЛІНЫ НА НАФТУ ЗНІЖАНА ДА $287,3 ЗА ТОНУ

Стаўка экспартнай пошліны на сырую нафту ў Беларусі з 1 лістапада зніжана з $372,2 за 1 тону да $287,3. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове ўрада № 1668, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна.

Памер пошліны скарэктаваны ў сувязі з аналагічным зніжэннем экспартнай пошліны на нафту з 1 лістапада ў Расійскай Федэрацыі. Да ўзроўню расійскіх зменшаны і экспартныя пошліны на нафтапрадукты.

ЧТПУП «Минская межрайбаза ОПС» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (зал образцов промышленных товаров) общ. пл. 2496,2 кв.м, расположенного: г. Минск, пер. Загородный 3-й, 4а. Имеется ж/д ветка. Начальная цена с НДС – 5 134 950 304 бел. руб. Задаток 100 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению горисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **11.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ

по продаже:

- предприятия по производству блоков из пено- и газобетона в составе зданий и оборудования в г. Осиповичи по ул. Проектируемой, 8;
- здания специализированного склада общ. пл. 2496,2 кв.м, г. Минск, пер. Загородный 3-й, 4а. Имеется ж/д ветка и коммуникации;
- изолированного помещения общ. пл. 379,8 кв.м (цокольный, 1, 2 и 3 этажи), г. Минск, ул. Комсомольская, 11/7;
- 2-этажного кирпичного здания, г. Минск, ул. Фабрициуса, 8 (ОАО «Калибр»). Пл. зем. участка 0,1109 га;
- производственно-складской базы в д. Буденовка Ошмянского р-на, зем. уч. – 3,6 га.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.11.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 129,00
1 еўра	2 738,75
1 латвійскі лат	3 867,39
1 літоўскі літ	793,26
1 чэшская крона	108,47
1 польскі злоты	748,99
1 расійскі рубель	78,96
1 украінская грыўня	368,66

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	26,9639
10 UAH	34,5677
1000 BYR	12,7579
EUR	46,6907

Курс у гандлёвых кампаніях (на 10.11.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

БПС-БАНК

С 11 ноября 2008 г. ОАО «БПС-Банк» предлагает физическим лицам срочный банковский депозит в иностранной валюте

«ЮБИЛЕЙНЫЙ»

(доллары США, евро, российские рубли) на следующих условиях:

- период размещения: с 11.11.08 по 30.12.08;
- срок привлечения – 1 год;
- размер процентов – 12,5 % годовых (доллары США, евро, российские рубли);
- возможность внесения дополнительных взносов без ограничения периодичности внесения и суммы;
- ежемесячная капитализация процентов с возможностью их востребования;
- при досрочном востребовании депозита проценты начисляются по установленной ставке для текущих счетов физических лиц в иностранной валюте;
- открытие депозита на имя другого лица.

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк», на веб-сайте (www.bpsb.by) или по телефону – 148 (многоканальный).

Возврат средств физических лиц в ОАО «БПС-Банк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 11.07.2007 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк»

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 12 декабря 2008 года

Общество с дополнительной ответственностью «АЙРОН» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже квартир со строительной отделкой в доме № 26 по ул. Игуменский тракт в г. Минске

№ лота	Наименование объекта				Площадь, кв.м			Начальная цена, руб.	Размер задатка, руб.
	№ квартиры	количество комнат	этаж	подъезд	общая площадь по СНБ	общая	жилая		
1	6	3	2	1	81,7	75,4	45,9	205 600 000	20 560 000
2	8	1	3	1	51,0	48,2	20,7	131 430 000	13 143 000
3	13	3	4	1	103,1	97,6	48,2	266 130 000	26 613 000
4	14	1	4	1	51,1	48,3	20,6	131 700 000	13 170 000
5	19	3	5	1	103,0	97,5	48,6	265 860 000	26 586 000
6	20	1	5	1	51,0	48,2	20,4	131 430 000	13 143 000
7	21	1	5	1	51,6	48,8	20,9	133 060 000	13 306 000
8	26	1	6	1	51,4	48,6	20,7	132 520 000	13 252 000
9	27	1	6	1	51,1	48,3	20,5	131 700 000	13 170 000
10	32	1	7	1	51,2	48,4	20,6	131 970 000	13 197 000
11	37	1	8	1	51,6	48,8	19,3	133 060 000	13 306 000
12	38	1	8	1	47,4	44,6	16,5	121 610 000	12 161 000
13	39	1	8	1	51,0	48,2	20,7	131 430 000	13 143 000
14	44	1	9	1	52,0	49,2	19,1	134 150 000	13 415 000
15	46	1	9	1	51,2	48,4	18,4	131 970 000	13 197 000
16	52	1	10	1	86,6	81,0	43,3	220 870 000	22 087 000

1) Аукцион состоится **12 декабря 2008 г.** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5 (КЗ «Минск», 3-й этаж, малый зал, ауд. 310, регистрация участников — в 10.00.

2) К участию в аукционе допускаются физические и юридические лица. При этом иностранные граждане и лица без гражданства могут приобретать квартиры в собственность, если они имеют на территории республики постоянное место жительства и законный источник существования, а юридические лица — если они зарегистрированы в качестве таковых на территории Республики Беларусь.

3) Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы в УП «Минский городской центр недвижимости»: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с объектом; соглашение о правах и обязанностях сторон; ксерокопию паспорта; заверенные банком копии платежных поручений подтверждающих внесение: а) задатка в сумме 10 % начальной цены; б) платы за регистрацию в размере 1/4 минимальной заработной платы (52 200 руб.). Оплата осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО БПС-Банк по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Квартиры находятся в залоге. Квартиры продаются только для использования под жилье. Победитель аукциона обязан вступить в товарищество собственников. Договор купли-продажи квартир с Победителем аукциона должен быть нотариально удостоверен и зарегистрирован в Республиканском унитарном предприятии «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Расходы, связанные с совершением нотариальных действий и государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности оплачиваются Победителем аукциона.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме Победителей аукциона, в течение 10 рабочих дней по письменному заявлению или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия. В заявлении должен быть указан лицевой счет с указанием полных банковских реквизитов для возврата денежных средств (задатка), непосредственно принадлежащий участнику аукциона.

Победителю аукциона задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

При подаче документов на участие в аукционе физическое лицо предъявляет паспорт (его представитель — паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально), юридическое лицо — нотариально заверенную копию свидетельства о государственной регистрации, а также копию устава (представитель юридического лица — паспорт, документы, подтверждающие его полномочия и доверенность удостоверенную нотариально).

Все участники аукциона перед подачей заявления на участие в торгах должны детально ознакомиться с утвержденными Условиями проведения аукциона и объектом.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе квартир осуществляется в установленном порядке по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 30 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона на расчетный счет Продавца. Договор купли-продажи квартир подписывается в течение 14 календарных дней со дня истечения срока, отведенного для оплаты, при условии внесения Победителем аукциона полной оплаты за квартиру и оплаты за подготовку и проведение торгов организатору аукциона УП «Минский городской центр недвижимости».

Победитель аукциона помимо оплаты за объект обязан в сроки, указанные в протоколе о его результатах, произвести оплату услуг Организатору аукциона сверх цены продажи в размере 1 % от окончательной стоимости квартиры.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются с **17 ноября 2008 г.** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 в понедельник – четверг с 8.45 до 18.00, в пятницу с 8.45 до 16.45 по 11 декабря 2008 г. до 17.00 включительно. (Перерыв на обед: с 13.00 до 14.00). Телефон для справок: 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by. Осмотр квартир проводится с 17 ноября 2008 г. по будним дням в присутствии сотрудников ОДО «АЙРОН» с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск ул. Игуменский тракт, 26. Телефон для справок по вопросу осмотра квартир: (029) 762 65 76.

УНП 190398583

Фінансавая сістэма Беларусі гатова вытрымаць любую нагрузку і забяспечыць вяртанне ўкладаў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка па традыцыі напярэдадні Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі ўручыў вялікай групе заслужаных грамадзян краіны дзяржаўныя ўзнагароды за працоўныя заслугі і важкі ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта «самая прыемная з місій, ускладзеных на кіраўніка дзяржавы».

Уручаючы дзяржаўныя ўзнагароды беларускім медыкам, Прэзідэнт адзначыў, што гэты Год здароўя быў вельмі плённы для ўрачоў, і падзякаваў ім за асваенне новых прыёмаў дыягностыкі і лячэння хворых, за ўкараненне перадавых метадаў у медыцынскую практыку, за дасягненні ў навуковых даследаваннях, накіраваных на ўмацаванне здароўя грамадзян. Аляксандр Лукашэнка ўручыў ордэн Пашаны намесніку галоўнага ўрача па хірургічнай рабоце 9-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска Алегу Румо, які прымаў удзел у першай у Беларусі аперацыі па перасадцы печані.

«Беларусь заўсёды славілася сваімі інтэлектуальнымі напрацоўкамі, і цяпер, калі прыярытэтам становіцца інавацыйнае развіццё народнай гаспадаркі, асаблівую значнасць набывае навука і практычнае прымяненне яе дасягненняў», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да вучоных і педагогаў.

У аснове дынамічнага развіцця эканомікі, паляпшэння жыцця людзей ляжаць самаадданая, якасная праца на кожным вытворчым участку, адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён дадаў, што тут нямала добрых прыкладаў, на якія павінны раўняцца ўсе калектывы. У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка выказаў словы ўдзячнасці работнікам Барысаўскага завода аўтатрактарнага электраабсталявання.

Звяртаючыся да будаўнікоў, Прэзідэнт сказаў аб неабходнасці ў разы павялічыць аб'ёмы будаўніцтва жылля ў рэспубліцы ў бліжэйшым будучым. «Многія будаўнічыя арганізацыі дабіваюцца нядрэнных вынікаў. Штогод павялічваецца колькасць уводзімых у строй жылых дамоў, прамысловых, сацыяльна-культурных і іншых важных аб'ектаў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — У бліжэйшай перспектыве нам давядзецца выходзіць на будаўніцтва жылля не 2-3 млн кв.м, як раней, і не 5, а 10 млн кв.м у год. Таму задачы вельмі вялікія».

У той жа час ён канстатаваў, што да будаўнікоў ёсць прэтэнзіі. «У бліжэйшы час мы гэты недахоп выправім вельмі строгімі патрабаваннямі да будаўнікоў і, вядома, адпаведнай увагай і павышэннем заработнай платы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў ордэны і медалі супрацоўнікам пагранічнай службы, міліцыі. «Беларусь — міралюбівая краіна, занятая стваральнай працай. Усе нашы памкненні і ўчынкі прысвечаны галоўнай мэце — забеспячэнню дастойных умоў жыцця для беларускага народа. Аднак у нас, як і ў іншых дзяржаў, ёсць пэўныя праблемы. Галоўнае для нас стабільнасць, грамадскі парадак, і тыя людзі, якія прысутнічаюць сёння тут, унеслі ўклад у забеспячэнне нармальнай стабільнасці ў грамадстве, захаванне грамадскага парадку і ахову знешніх граніц», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што нацыянальная бяспека, законнасць і правапарадак — аснова моцнай і эфектыўнай дзяржавы, на якой грунтуюцца і эканамічнае развіццё, і духоўны прагрэс грамадства.

Прэзідэнт высока ацаніў дзейнасць прадстаўнікоў рэспубліканскай і мясцовай улады, кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў, банкаў, аб'яднання вынаходнікаў і рацыяналізатараў, устаноў аховы здароўя і адукацыі, прадстаўнікоў мастацтва.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам беларускай журналістыкі — супрацоўнікам Беларускага тэлеграфнага агенцтва. *(На фота.)* Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны начальнік цэнтра сувязі і аўтаматызаваных сістэм Самуіл Рыжэвіч, медалём Францыска Скарыны — вядучы рэдактар галоўнага выпуску Аліна Шрубок. Акрамя таго, Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена галоўнаму рэдактару галоўнага выпуску Аксане Кірыльчык і намесніку рэдактара аддзела рэгіянальнай інфармацыі па Гомельскай вобласці Валерыю Сідорчыку за арганізацыю эфектыўнай работы па аператыўным асвятленні важнейшых грамадска-палітычных падзей, значны ўклад у развіццё сучаснай інфармацыйных тэхналогій. Аляксандр Лукашэнка пажадаў ім поспехаў і народнага прызнання іх працы.

Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт падзякаваў прысутным за рэальны ўклад ва ўмацаванне маладой беларускай дзяржавы і падкрэсліў, што яна ніколі не кіне свой народ сам-насам з цяжкасцямі. «Жыццё падкідвае усё больш і больш выклікаў, не дае засядзецца: то адзін крызіс, то другі, так ці інакш гэтыя хвалі і на нас накочваюць, праўда, разбіваюцца. Аднак дзяржава ніколі свой народ не кідала, і нават калі нам даводзіцца калі-небудзь прымаць нейкія непапулярныя меры, то гэта не таму, што мы хочам дзесьці народ падшыснуць і гайкі закруціць. Законы эканомікі аб'ектыўныя», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка таксама нагадаў аб сваім нядаўнім рашэнні аб гарантаванні дзяржавай вяртання ўсіх укладаў у поўным аб'ёме і ў любой валюце незалежна ад формы ўласнасці банка. Ён, у прыватнасці, заявіў аб гатоўнасці фінансавай сістэмы краіны вытрымаць пры неабходнасці любую нагрузку ў гэтым пытанні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ Ў СУВЯЗІ З ГІБЕЛЛЮ ЛЮДЗЕЙ У ВЫНІКУ АБРУШЭННЯ ШКОЛЫ НА ГАІЦІ

У сувязі з абрушэннем школы на Гаіці, што прывяло да шматлікіх чалавечых ахвяраў, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста накіраваў 8 лістапада спачуванні Прэзідэнту Гаіці Рэнэ Прэвалю, а таксама родным і блізкім загінулых.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

НАЦБАНК БЕЛАРУСІ ПРАДАЎ ГРАМАДЗЯНАМ 4250 БРЫЛЬЯНТАЎ НА $1,1 МЛН

Нацыянальны банк Беларусі ў студзені-кастрычніку гэтага года прадаў насельніцтву 1802 брыльянты агульнай масай 290,11 карата, паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка.

Усяго на 10 лістапада 2008 года было прададзена 4250 брыльянтаў агульнай масай 712,09 карата. Выручка ад іх рэалізацыі склала больш як Br2,4 млрд, або звыш $1,1 млн.

Продаж брыльянтаў ажыццяўляецца як за беларускія рублі, так і за замежную валюту з аплатай у наяўнай і безнаяўнай форме ў адпаведнасці з заканадаўствам. Цэпер для продажу прапануюцца брыльянты розных якасна-колеравых характарыстык ад 0,05 да 2,52 карата класічнай круглай агранкі з 57 гранямі, выраблены па расійскіх стандартах.

В извещении о проведении открытого аукциона по продаже изолированного помещения
общ. пл. 379,8 кв.м (цокольный, 1, 2 и 3 этажи) расположенного в административном здании по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11/7, опубликованном в газете «Звязда» от 17.10.2008 г., вместо: «Начальная цена с НДС – 2 133 000 000 бел. руб.»
читать: «Начальная цена с НДС – 2 998 085 000 бел. руб.».
КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже обращенного в доход государства административного здания с магазином (общ. пл. 149,2 кв.м), расположенного: г. Любань, ул. Социалистическая, 1. Начальная цена снижена на 20 % и составляет 31 990 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.07.2008 г. Аукцион состоится **25.11.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.
Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в интернете: www.rlt.by
КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

«НАКОПЛЕНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ — У НОВУЮ ЭНЕРГІЮ РАЗВІЦЦЯ ЗАКАНАДАЎСТВА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Што для гэтага неабходна зрабіць спачатку? Прааналізаваць напрацоўкі нашых папярэднікаў, узяць за аснову лепшае, праверанае жыццём, і рухацца наперад, накіроўваючы траекторыю развіцця нацыянальнага заканадаўства на высокую якасць юрыдычных нормаў, усебаковае прагназаванне наступстваў іх рэалізацыі, нарматыўнае замацаванне мэтаў нашай дзяржавы не толькі на бліжэйшую, але і больш аддаленую перспектыву.

— У чым вы, Уладзімір Паўлавіч, бачыце рычаг руху наперад у павышэнні якасці законаў?

— У больш цесным узаемадзеянні і супрацоўніцтве з Саветам Міністраў, Адміністрацыяй Прэзідэнта, Саветам Рэспублікі, Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь, міністэрствамі і ведамствамі, рэгіянальнымі органамі дзяржаўнай улады. Пазітыўны вопыт такога ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва напрацаваны парламентам папярэдніх скліканняў. Мы будзем яго нарошчваць. Якім чынам? Перш-наперш, узгадняючы свае пазіцыі на этапе распрацоўкі і так званага «нулявога» чытання найбольш значных законапраектаў. Важным уяўляецца таксама пры іх абмеркаванні разнастаіць практыку шырокай грамадскай экспертызы з удзелам працоўных калектываў, навуковых устаноў і грамадскіх арганізацый. Усё гэта мае асаблівае значэнне ў пошуку шляхоў вырашэння канкрэтных сацыяльных і эканамічных праблем, напаўненні заканадаўства нормамі прамога дзеяння, а таксама пры ацэнцы альтэрнатыўных фармулёвак тых ці іншых прававых новаўвядзенняў.

— Альтэрнатыўныя ідэі могуць быць падтрыманы Палатай прадстаўнікоў?

— Калі яны канструктыўныя, належным чынам абгрунтаваныя і накіраваныя на паляпшэнне жыцця людзей або становішча спраў у пэўнай сферы, то чаму б і не?

— Нават ідэі эканамічнага профілю?

— Забяспечыць далейшы дынамічны рост нацыянальнай эканомікі на фоне глабальнага фінансавага крызісу і эканамічнага спаду ў найбольш развітых дзяржавах Захаду — самае галоўнае. У заканадаўчай базе неабходна зняць тармазы, якія блакуюць нармальны рух краіны па рынкавых рэйках, але падыход тут мне бачыцца вельмі акуратны, узважаны і збалансаваны. Асноватворныя эканамічныя законы дзейнічаюць і даюць, як мы ведаем, добры вынік. Аднак жыццё не стаіць на месцы. Узнікаюць новыя праблемы, вырашэнне якіх вымагае прыняцця новых нарматыўных актаў і своечасовай карэкціроўкі існуючых. Вялікая заканатворчая праца, якая чакае дэпутатаў парламента, павінна быць заснавана, на мой погляд, не толькі на вырашэнні наспелых праблем, але і на стратэгічных прыярытэтах эканомікі, рэспублікі ў цэлым. Пры такім падыходзе далейшыя нашы крокі ў напрамку ўдасканалення падатковага і гаспадарчага заканадаўства, а таксама заканадаўства грашова-крэдытнай і банкаўскай сістэм будуць комплекснымі, сістэмнымі, паслужаць павышэнню інвестыцыйнага рэйтынгу і канкурэнтаздольнасці Беларусі. Канкурэнцыю цікавых ідэй, у тым ліку зыходзячых ад грамадскасці, мы будзем вітаць, але гэтыя ідэі не павінны быць абстрактнымі, адарванымі ад рэалій, контрпрадуктыўнымі. Спрыяць пошуку аптымальных для нашай краіны рашэнняў, якія б працавалі на паляпшэнне якасці жыцця людзей, — вось у чым мне ўяўляецца іх сутнасць.

— Пошук такіх аптымальных рашэнняў вельмі важны і на прававым полі міжнароднага супрацоўніцтва. Якой будзе роля Палаты прадстаўнікоў чацвёртага склікання на гэтым складніку парламенцкай работы і ў абароне нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне?

— Забеспячэнне абароненасці нацыянальных інтарэсаў з'яўляецца для нас першарадным прыярытэтам як ў фарміраванні і абнаўленні заканадаўства, так і ў парламенцкай дыпламатыі. Мы будзем актыўна пашыраць прававую платформу сферы міжнародных адносінаў Беларусі і паслядоўна развіваць узаемадзеянне з замежнымі парламентарыямі і міжпарламенцкімі арганізацыямі, у тым ліку і еўрапейскімі, у рэчышчы знешняй палітыкі нашай дзяржавы.

Нас абнадзейвае, што ў Еўрапейскім Саюзе ёсць нямала палітыкаў і дзелавых людзей, якія разумеюць, што нашы і іхнія інтарэсы не процілеглыя, а ў многім падобныя не толькі таму, што мы суседзі па агульным еўрапейскім доме, але і таму, што не можа быць процілеглым галоўнае для ўсіх народаў — мір, бяспека і дабрабыт. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў спадзяюцца, што ў парламенцкіх асамблеях АБСЕ і Савета Еўропы вызначальную ролю ў дачыненні да беларускага парламента будуць адыгрываць не двайныя стандарты, а прагматызм і проста здаровы сэнс. Мы сумесна з членамі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу прыкладзём свае намаганні для развіцця дыялогу з парламенцкімі інстытутамі ЕС і пошуку ўзаемаразумення. Але павінны быць і крокі еўрапейскіх парламенцкіх інстытутаў насустрач нам.

— Ці застанецца расійскі вектар прыярытэтным для міжнароднай дзейнасці новага беларускага парламента?

— Несумненна. Канструктывізм узаемаадносінаў з расійскімі калегамі прайшоў праверку часам. Неабходна надаць новую дынаміку фарміраванню прававой сістэмы Саюзнай дзяржавы, умацоўваць наша супрацоўніцтва ў міжнародных арганізацыях.

— Уладзімір Паўлавіч, якую атмасферу вы хацелі б бачыць у Палаце прадстаўнікоў?

— У якой бы максімальна рэалізоўваўся інтэлектуальны і творчы патэнцыял дэпутатаў і супрацоўнікаў нашага Сакратарыята.

Мы яе ствараем.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

Абзац

■ 65 гадоў таму, у лістападзе 1943 года, пачала выдавацца падпольная газета «Минский большевик» — орган Мінскага падпольнага гаркама партыі. Выдавалася яна да чэрвеня 1944 г. на рускай мове пры партызанскім спецатрадзе «Мясцовыя», якім камандаваў Станіслаў Ваўпшасаў.

■ **У Мінскім палацы спорту пачаў работу каток са штучным пакрыццём. Усяго сёлетняй зімой у Мінску плануецца заліць каля 170 каткоў агульнай плошчай 4 тыс. кв. метраў.**

■ Упершыню ў Беларусі адбудзецца «Бэбі Рэйс» — забег малых-паўзункоў ва ўзросце да 11 месяцаў. Ён пройдзе 20 лістапада ў рамках выставы-інсталяцыі «Салёнае дзяцінства — Сілуэты» ў сталічным кінатэатры «Перамога». Рэгістрацыя забегу малых — з 11 па 18 лістапада з 14 да 18 гадзін па тэлефоне (017) 259 4883. Удзельнікаў чакаюць, як абяцаюць арганізатары, неверагодныя сюрпрызы і прыемныя падарункі.

■ **Міліцыя шукае зламыснікаў, якія скралі з аўтамабіля БМВ на абочыне дарогі ў Пухавіцкім раёне 20 тысяч долараў і 20 тысяч еўра. Пацярпелыя — харэограф і дырэктар камерцыйнай фірмы. Узбуджана крымінальная справа.**

■ Супрацоўнікі РУУС Кастрычніцкага раёна Мінска затрымалі групу асобаў па падазрэнні ў ажыццяўленні серыі выкраданняў аўтамабіляў у сталіцы ў верасні-кастрычніку гэтага года. Жыхар Мінска, стоячы ў сябе на балконе, убачыў, што чацвёра маладых людзей урэзаліся ў бардзюр тратуара, хутка пакінулі аўтамабіль і зніклі. Аб гэтым ён паведаміў у міліцыю. Былі затрыманы двое, яшчэ двое зніклі. Затрыманыя прызналіся ў 7 эпізодах, спецыялізаваліся яны на крадзежах аўтамабіляў «Нісан». Пасля выкрадання іх або разбіралі на запчасткі або перапрадавалі.

Поўны абзац

■ **Нямецкая паліцыя вышуквае бязрукага злодзея, які незаўважна вынес з магазіна 24-цалёвы тэлевізар. Як высветлілася пазней, двое памагатых выкарысталі спецыяльныя заціскачкі, якімі зафіксавалі тэлевізар на целе злодзея. Персанал магазіна не разумеў, што адбылося, да той пары, пакуль нехта не заўважыў адсутнасць тэлевізара на дэманстрацыйнай стойцы. Затым паглядзелі запісы камеры адсочвання і ўбачылі ўвесь працэс. У паліцыі толькі здзівіліся — як мог вельмі адметны мужчына без рук з прымацаваным да яго даволі вялікім тэлевізарам не прыцягнуць увагі. Аднак гэта адбылося.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Грамадскі савет у сферы масавай інфармацыі дасць магчымасць удасканаліць работу СМІ

Грамадскі каардынацыйны савет у сферы масавай інфармацыі будзе садзейнічаць удасканаленню работы СМІ ва ўмовах дзеяння новага закона аб друку. Такую думку выказаў карэспандэнту БЕЛТА міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч, каментуючы пастанову Савета Міністраў № 1625.

Прапанова аб стварэнні такога грамадскага кансультацыйнага і каардынуючага органа была падрыхтавана згодна з Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня гэтага года «Аб сродках масавай інфармацыі». Раней створаны (у 1997 годзе) грамадскі савет не працаваў на належным узроўні, не выступаў з ініцыятывамі. Сёння ёсць неабходнасць актывізаваць работу гэтага органа. Мінінфармацыі гатова аказаць арганізацыйную і інфармацыйную дапамогу ў дзейнасці новага савета.

У склад грамадскага каардынацыйнага савета ў сферы масавай інфармацыі ўвайшлі аўтарытэтныя, прафесіянальныя людзі, якія ведаюць, што такое журналістыка, адзначыў міністр. Мінінфармацыі не мае намеру ўмешвацца ў работу гэтай структуры, але агучыць сваю пазіцыю. «Новы орган павінен ведаць меркаванне Міністэрства інфармацыі, роўна як і пазіцыю іншых, хто працуе ў інфармацыйным полі. Думаю, што старшыня савета сустрэнецца з прадстаўнікамі ўсіх беларускіх СМІ», — сказаў Уладзімір Русакевіч.

Грамадскі каардынацыйны савет у сферы масавай інфармацыі — самастойны орган. У склад савета ўвайшлі 13 чалавек, старшыня — галоўны рэдактар газеты «Советская Белоруссия» ўстановы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия» Павел Якубовіч.

У адпаведнасці з палажэннем аб грамадскім каардынацыйным савеце ў сферы масавай інфармацыі, зацверджаным Саветам Міністраў, асноўнымі задачамі яго з'яўляюцца: каардынацыя ўзаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў і іншых арганізацый, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у сферы масавай інфармацыі; забеспячэнне правільнага прымянення нормаў закона «Аб сродках масавай інфармацыі»; разгляд спрэчных пытанняў, якія ўзнікаюць пры прымяненні гэтага закона і іншага заканадаўства ў сферы масавай інфармацыі.

Грамадскі савет мае права: даваць ацэнку аб наяўнасці (адсутнасці) у прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, якія выйшлі ў свет, парушэнняў патрабаванняў закона аб СМІ; даваць тлумачэнні па пытаннях, што ўзнікаюць пры выпуску сродкаў масавай інфармацыі; уносіць прапановы ў Мінінфармацыі аб удасканаленні заканадаўства аб СМІ; запытваць у дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацый неабходныя дакументы, якія датычацца пытанняў, што выносяцца на разгляд грамадскага савета; запрашаць на пасяджэнне савета кіраўнікоў юрыдычных асобаў, на якія ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, заснавальнікаў сродкаў масавай інфармацыі, журналістаў і заслухоўваць іх паведамленні па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю гэтага савета.

ПАВЫШАНЫ ВЫПЛАТЫ НА ЎТРЫМАННЕ КАРОЎ У АСАБІСТЫХ ПАДВОРКАХ

У Беларусі ўнесены змяненні ў парадак выплаты ў 2008 годзе сродкаў рэспубліканскага бюджэту на стымуляванне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, што закупляецца ў грамадзян, якія ажыццяўляюць вядзенне асабістых падсобных гаспадарак. Рашэнне аб гэтым змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 1661, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Апараце Савета Міністраў. Пастанова ўступае ў сілу з дня яе афіцыйнага апублікавання.

Змяненні ўнесены ў ранейшы парадак выплаты, зацверджаны пастановай Саўміна № 441 ад 22 сакавіка гэтага года, якой устаноўлена выплата сродкаў на ўтрыманне каровы для грамадзян, што рэалізуюць малако для перапрацоўкі.

Як адзначылі карэспандэнту БЕЛТА ў галоўным упраўленні эканомікі Мінсельгасхарча, аналіз існуючай сітуацыі паказаў, што для стымулявання далейшай здачы малака насельніцтвам неабходна прадоўжыць выплаты на ўтрыманне кароў. Ранейшай пастановай выплаты абмяжоўваліся на ўзроўні здачы малака ад кожнай каровы 2500 кг.

Новым парадкам прадугледжаны выплаты насельніцтву на ўтрыманне адной каровы ад Br30 тыс. да Br500 тыс. у год пры рэалізацыі малака ад 500 да 5 тыс. кг. У прыватнасці, пры рэалізацыі малака базіснай тлустасці на 1 карову ад 500 да 999 кг прадугледжана выплата на ўтрыманне 1 каровы ў памеры Br30 тыс., ад 1000 да 1499 кг — Br68 тыс., ад 1500 да 1999 кг — Br120 тыс., ад 2000 да 2499 кг — Br180 тыс., ад 2500 да 2999 кг — Br230 тыс., ад 3000 да 3499 кг — Br280 тыс., ад 3500 да 3999 кг — Br330 тыс., ад 4000 да 4499 кг — Br390 тыс., ад 4500 да 4999 кг — Br450 тыс., ад 5000 кг і вышэй — Br500 тыс.

Паводле слоў спецыялістаў Мінсельгасхарча, устаноўленыя выплаты дадуць магчымасць закупіць у насельніцтва малако ў тых аб'ёмах, якія прадугледжаны прагнознымі паказчыкамі на гэты год. Згодна са статыстыкай, у 2008 годзе ўжо намецілася станоўчая тэндэнцыя па закупцы малака ў насельніцтва. Так, у студзені — верасні гэтага года закупкі павялічыліся на 4,4 працэнта і склалі 388 тыс. тон.

Прычым закупкі малака ў насельніцтва павялічыліся ва ўсіх рэгіёнах краіны. У Гомельскай вобласці яны павялічыліся на 10 працэнтаў, у Магілёўскай — на 7, у Мінскай і Віцебскай — на 4 працэнты ў кожнай, у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях адпаведна — на 2 і 3 працэнты. У той жа час колькасць кароў на падворках сялян знізілася. Павелічэнню аб'ёму здачы малака садзейнічала больш актыўнае матэрыяльнае стымуляванне ўладальнікаў асабістых падворкаў, лічаць у Мінсельгасхарчы. Гэты парадак выплат на ўтрыманне адной каровы дасць магчымасць павялічыць рост аб'ёму закупак малака ў насельніцтва, а таксама павышае адказнасць за работу з насельніцтвам сельскіх выканкамаў.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже земельного участка общей площадью 0,2103 га в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Новый Двор Роговского сельсовета Минского района. Начальная цена – 15 877 650 белорусских рублей. В непосредственной близости имеются сети электроснабжения, газопровод. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.07.2008 г. Аукцион состоится **27.11.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.
Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.
УНП 690324015

Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

АБ ВЫБРАННІ ПАСТАЯННАЙ КАМІСІІ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ЗАКАНАДАЎСТВЕ І СУДОВА-ПРАВАВЫХ ПЫТАННЯХ

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць Пастаянную камісію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях у наступным складзе:

Старшыня камісіі
Самасейка Мікалай Леанідавіч
Члены камісіі
Андрайчук Мікалай Канстанцінавіч
Кляшчук Інэса Анатольеўна
Лукашонак Валянціна Мікалаеўна
Міхалевіч Анфім Іванавіч

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. АНДРЭЙЧАНКА
31 кастрычніка 2008 г., г. Мінск. № 11-П4/I

АБ ВЫБРАННІ ПАСТАЯННАЙ КАМІСІІ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕЦЫ

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць Пастаянную камісію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай бяспецы ў наступным складзе:

Старшыня камісіі
Гумінскі Віктар Аляксандравіч
Члены камісіі
Ваньковіч Анатоль Сцяпанавіч
Васіленка Уладзімір Мікалаевіч
Кот Алег Іванавіч
Місурагін Ігнат Арцёмавіч

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. АНДРЭЙЧАНКА
31 кастрычніка 2008 г., г. Мінск. № 12-П4/I

АБ ВЫБРАННІ ПАСТАЯННАЙ КАМІСІІ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДЗЯРЖАЎНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ, МЯСЦОВЫМ САМАКІРАВАННІ І РЭГЛАМЕНЦЕ

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць Пастаянную камісію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце ў наступным складзе:

Старшыня камісіі
Байкоў Васіль Міхайлавіч
Члены камісіі
Грыцкевіч Генадзь Паўлавіч
Зазуля Аляксандр Іванавіч
Ісачанка Таццяна Мікалаеўна
Казура Эдуард Пятровіч
Кузняцова Ларыса Фёдараўна
Орда Міхаіл Сяргеевіч
Пішч Святлана Сяргееўна
Папкоў Аляксандр Андрэевіч

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. АНДРЭЙЧАНКА
31 кастрычніка 2008 г., г. Мінск. № 13-П4/I

АБ ВЫБРАННІ ПАСТАЯННАЙ КАМІСІІ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА АГРАРНЫХ ПЫТАННЯХ

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць Пастаянную камісію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрных пытаннях у наступным складзе:

Старшыня камісіі
Крыжэвіч Сяргей Іванавіч
Члены камісіі
Богуш Піліп Піліпавіч
Гур'янаў Васіль Паўлавіч
Маёраў Уладзімір Сяргеевіч
Розганаў Аляксандр Іванавіч
Сцяпура Васіль Ігнатавіч
Эльяшэвіч Леанід Уладзіміравіч

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. АНДРЭЙЧАНКА
31 кастрычніка 2008 г., г. Мінск. № 14-П4/I

АБ ВЫБРАННІ ПАСТАЯННАЙ КАМІСІІ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА АДУКАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ, НАВУЦЫ І НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫМ ПРАГРЭСЕ

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць Пастаянную камісію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе ў наступным складзе:

Старшыня камісіі
Здановіч Уладзімір Мацвеевіч
Члены камісіі
Жгун Мікалай Анатольевіч
Казак Мікалай Станіслававіч
Кульша Ніна Герасімаўна
Ласякін Аляксандр Міхайлавіч
Новік Алена Аляксандраўна
Анішчук Ганна Тарасаўна
Сухавей Святлана Іванаўна
Шацько Аляксандр Віктаравіч
Юргялевіч Галіна Мікалаеўна

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. АНДРЭЙЧАНКА
31 кастрычніка 2008 г., г. Мінск. № 15-П4/I

АБ ВЫБРАННІ ПАСТАЯННАЙ КАМІСІІ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА, НАЦЫЯНАЛЬНЫХ АДНОСІНАХ І СРОДКАХ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць Пастаянную камісію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі ў наступным складзе:

Старшыня камісіі
Юшкевіч Аляксандр Мікалаевіч
Члены камісіі
Адашкевіч Уладзімір Сцяпанавіч
Глаз Анатоль Ціханавіч
Давыдзька Генадзь Браніслававіч
Казлоў Аляксей Максімавіч
Мельнікаў Яўген Аляксандравіч
Асмалоўская Таццяна Сяргееўна

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. АНДРЭЙЧАНКА
31 кастрычніка 2008 г., г. Мінск. № 16-П4/I

АБ ВЫБРАННІ ПАСТАЯННАЙ КАМІСІІ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА МІЖНАРОДНЫХ СПРАВАХ І СУВЯЗЯХ З СНД

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць Пастаянную камісію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і сувязях з СНД у наступным складзе:

Старшыня камісіі
Маскевіч Сяргей Аляксандравіч
Члены камісіі
Белкіна Тамара Аляксееўна
Бірукова Марыя Міхайлаўна
Бусько Віталь Леанідавіч
Карпенка Ігар Васільевіч
Кавалёва Валянціна Іванаўна
Корап Раман Леанідавіч
Кужанаў Уладзімір Іванавіч
Лявіцкая Ганна Віктараўна
Левоненка Валянціна Сцяпанаўна
Лузіна Валянціна Міхайлаўна
Ціханская Раіса Аляксандраўна

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. АНДРЭЙЧАНКА
31 кастрычніка 2008 г., г. Мінск. № 17-П4/I

АБ ВЫБРАННІ ПАСТАЯННАЙ КАМІСІІ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПРАБЛЕМАХ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ КАТАСТРОФЫ, ЭКАЛОГІІ І ПРЫРОДАКАРЫСТАННІ

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць Пастаянную камісію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні ў

АДКАЗНАСЦІ РАСПІСКА НЕ ЗАМЕНІЦЬ

Тэхніка бяспекі — рэч сур'ёзная. І пакаранні за яе парушэнні адпаведныя. Таму раз-пораз у кіраўнікоў з'яўляюцца ідэі: папрасіць работнікаў напісаць распіску. Маўляў, калі што раптам здарыцца — я вінаваты сам... Крок арыгінальны. Толькі вось ці законны — пытанне ўжо іншае. Прынамсі, варта заўважыць: у выпадку няшчаснага здарэння адказваць усё роўна давядзецца. І ў любым выпадку ніякай юрыдычнай сілы падобная распіска мець не будзе.

Між тым, як узяць некалькі дзён адпачынку «за свой кошт», якая працягласць водпуску ў чарнобыльскай зоне, хто можа змяніць групу інваліднасці і калі могуць звольніць маладога спецыяліста? Гэтыя і іншыя «пікантныя» пытанні сталі тэмай чарговай «выязной прыёмнай» Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, што была наладжана днямі для жыхароў Брагінскага і Хойніцкага раёнаў.

За свой кошт. І без наступстваў

Работніца вырашыла паступаць у тэхнікум. Як мае быць, пакінула ў аддзеле кадраў заяву на 2 дні водпуску без захавання зарплаты і паехала ў іншы горад падаваць дакументы. Аднак па вяртанні раптам высветлілася — заяву ніхто не падпісаў. І работніцу звольнілі за прагул.

— На жаль, гэта вельмі распаўсюджаная з'ява, таму, каб не патрапіць у непрыемную сітуацыю, варта памятаць наступнае, — кажа намеснік начальніка ўпраўлення прававога забеспячэння і кантролю Дэпартамента дзяржінспекцыі працы Вадзім Браташ. — Водпуск без захавання зарплаты можа прадастаўляцца толькі па ўзаемнай дамове паміж работнікам і наймальнікам. Прычым такая дамова «падмацоўваецца» пісьмовым загадам ці распараджэннем, з якімі работнік павінен пазнаёміцца «пад роспіс». Пакідаць жа сваё працоўнае месца без падобнага азнаямлення, скажам, пасля вуснага абяцання, вельмі неабачліва. Гэта сапраўды можа закончыцца звальненнем за прагул. Да слова, аспрэчыць такое рашэнне надалей можна будзе толькі праз суд. Пры гэтым падаць заяву туды неабходна на працягу месяца.

На часткі толькі са згоды

З 26 студзеня працягласць асноўнага працоўнага водпуску ў Беларусі складае 24 каляндарныя дні. Плюс магчымыя «надбаўкі» — скажам, па кантракце або за шкодныя ўмовы працы. Гэта правіла з'яўляецца агульным. Разам з тым у ім ёсць пэўныя выключэнні — у прыватнасці, яны датычацца «чарнобыльскай» зоны.

— Варта нагадаць, што паводле пастановы Савета Міністраў ад 24 студзеня гэтага года № 100, працягласць асноўнага водпуску работнікаў, якія занятыя ў зонах эвакуацыі, першачарговага і наступнага адсялення пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС складае 44, а работнікаў, якія занятыя ў зонах з правам на адсяленне, — 37 каляндарных дзён, — падкрэслівае Вадзім Браташ. — Прычым гэта пастанова датычыцца работнікаў арганізацый усіх формаў уласнасці, а таксама дзяржслужачых.

Тым часам яшчэ адна цікавая акалічнасць. Ужо ў хуткім часе, да 5 студзеня, неабходна вызначыць графікі водпускаў на наступны год. Ці можа быць запісана ў гэтым графіку, што работнік атрымае свой водпуск не цалкам, а часткамі?

Зрэшты, адказ тут просты — можа. Аднак трэба памятаць: падзяліць водпуск на часткі магчыма толькі са згоды самога работніка.

Максімум ніхто не гарантуе

Працоўная дамова — перш за ўсё. Аднак і тут бываюць варыянты. Скажам, у кантракце пазначана: надбаўка за складанасць і напружанасць працы складае 50, а прэмія — да 60 працэнтаў акладу. Ці можа наймальнік зменшыць гэтыя выплаты?

— Калі ў кантракце зроблены канкрэтны запіс, што надбаўка за складанасць і напружанасць складае 50 працэнтаў, то спробу яе змяншэння трэба разглядаць як істотнае змяненне ўмоў працы, — заўважае Вадзім Браташ. — Таму наймальнік абавязаны не пазней чым за месяц пісьмова папярэдзіць аб сваім намеры работніка. І калі работнік з новаўвядзеннем пагадзіцца — ён працягне працаваць на новых умовах. А калі не пагадзіцца — кантракт будзе скасаваны з выплатай двухтыднёвай выхадной дапамогі.

Крыху іншы выпадак — запіс аб прэміі да 60 працэнтаў акладу. Па сутнасці такім чынам у кантракце вызначана толькі максімальная планка выплат. Адпаведна, планка мінімальная можа быць меншай або ўвогуле «нулявой». Тут усё залежыць ад пэўных вытворчых паказчыкаў работніка. Прычым, за якія канкрэтна паказчыкі і наколькі прэміруецца супрацоўнік, павінна быць вызначана ў лакальных прававых актах кожнай арганізацыі — звычайна такімі дакументамі з'яўляюцца палажэнне аб прэміяванні, палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні ці палажэнне аб аплаце працы.

Як лічыцца «паўночны» стаж?

Пенсійная тэма асобная. Чалавек адпрацаваў у «савецкі» час 16 гадоў на Поўначы, меў там вельмі добрыя заробкі, але ў 1989 годзе вырашыў вярнуцца ў Беларусь. Чаму летась, калі прызначалася пенсія, яе памер аказаўся вельмі блізкім да сярэдняга па нашай краіне — каля 300 тысяч рублёў?

— «Паўночны» стаж і заробкі ўлічваюцца, прычым калі да 1992 года чалавек адпрацаваў на Крайняй Поўначы больш за 15 або ў прыроўненых да яго раёнах больш за 20 гадоў, ён захоўвае «савецкую» льготу — магчымасць выхаду на заслужаны адпачынак на 5 гадоў раней за агульны ўзрост, — заўважае галоўны спецыяліст упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Хойніцкага райвыканкама Ірына Казмірчук. — Аднак што да памеру пенсіі, то тут малюнак такі. Сёлета індывідуальны каэфіцыент заробку вылічваецца за любыя 14 гадоў запар з апошніх 24 гадоў работы, летась працавала формула «13 з 23», пазалетась — «12 з 22» і г.д. Такім чынам, у перыяд, за які разлічваецца каэфіцыент, паўночная работа ўвайшла далёка не цалкам. А з-за меншых заробкаў у Беларусі пасля 1989 года агульны паказчык каэфіцыенту аказаўся ніжэйшым. Адпаведна, сама пенсія атрымалася амаль такой, як і ў сярэднім па краіне.

Не хочаш — не пашлюць

Працаваць ці не на «групе» — кожны выбірае сам. Галоўнае — атрымаць дазвол медыкаў. Тым часам вось сітуацыя: чалавек мець работу не супраць. Але з прычыны здароўя не можа выконваць адзін са «стандартных» абавязкаў — ездзіць у камандзіроўкі...

— Наконт гэтага хвалявацца не варта: наша заканадаўства забараняе накіраванне ў службовыя камандзіроўкі інвалідаў без іх асабістай згоды, — зазначае Вадзім Браташ. — Да слова, зноў-такі толькі з асабістай згоды дазваляецца прыцягваць інвалідаў да звышурочных, работы ў начны час, па выхадных і дзяржаўных святах. І да таго ж пры ўмове, што такія работы не забараняюцца медыкамі.

Звольніць амаль нерэальна

Таксама няпросты выпадак. Са службовымі абавязкамі цяжка справіцца інваліду, які... з'яўляецца маладым спецыялістам і прыехаў па размеркаванні. Ці могуць такога работніка звольніць?

— Трэба працягваць спакойна працаваць і памятаць, што да заканчэння тэрміну размеркавання «пазбавіцца» ад маладога спецыяліста амаль нерэальна, — падкрэслівае Вадзім Браташ. — Да таго ж маладому спецыялісту нельга прызначыць выпрабавальны тэрмін, маладога спецыяліста нельга перавесці на іншую, не звязаную з яго спецыяльнасцю і кваліфікацыяй, работу — за выключэннем выпадкаў, калі такі перавод адбываецца паводле рэкамендацый МРЭК.

Звольніць або перавесці на іншае, не звязанае са спецыяльнасцю і кваліфікацыяй месца, супрацоўніка па размеркаванні можна толькі пры ліквідацыі арганізацыі, па стане здароўя, за сістэматычнае невыкананне працоўных абавязкаў (калі раней за гэта ўжо накладалася дысцыплінарнае спагнанне), знаходжанне больш за 4 месяцы на «бальнічным», за прагул, распіццё ў працоўны час ці на працоўным месцы спіртных напояў і іншыя «вінаватыя» дзеянні. Апроч таго, скасаваць кантракт з маладым спецыялістам можна па абставінах, якія не залежаць ад волі бакоў, — пры прызыве на тэрміновую ваенную службу, уступленні ў сілу прыгавору суда, які забараняе займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, пры парушэнні правілаў прыёму на работу або аднаўленні на месцы маладога спецыяліста работніка, які выконваў гэтыя абавязкі раней.

Дарэчы, можна заўважыць, што з іншага боку цяжка знайсці падставу для датэрміновага звальнення пасля размеркавання і самому маладому спецыялісту. Законных шляхоў тут усяго некалькі — пераход на выбарную пасаду, прыняцце рашэння ўстановай адукацыі аб перараз меркаванні або аб самастойным размеркаванні, паступленне на дзённую форму ў магістратуру ці аспірантуру, а таксама парушэнне наймальнікам заканадаўства аб працы, працоўнага або калектыўнага дагавора. Праўда, вызначыць, што падобныя парушэнні адбыліся, павінен не сам малады спецыяліст — гэта мусяць зрабіць дзяржінспекцыя працы, прававая інспекцыя прафсаюзаў або суд.

Хто змяняе групу?

Пенсіянерка цяжка захварэла і перанесла некалькі складаных аперацый. Цяпер значная частка пенсіі «ідзе» на лекі. Таму каб атрымаць скідкі па іх аплаце, жанчына вырашыла звярнуцца па групу інваліднасці. Групу насамрэч далі. Але толькі трэцюю. А яна, як вядома, права на льготы не дае. Прычым рашэнне аб прызначэнні III групы і міжраённая, і абласная медыка-рэабілітацыйныя камісіі прынялі нягледзячы на тое, што ў свой час жанчына брала ўдзел у ліквідацыі наступстваў на Чарнобыльскай АЭС.

— Змяніць групу ці звязаць інваліднасць з чарнобыльскімі наступствамі могуць толькі медыкі, — заўважае Вадзім Браташ. — Таму каб аспрэчыць рашэнне міжраённага і абласнога МРЭК, застаецца толькі адно — звярнуцца ў медыцынскую арганізацыю больш высокага ўзроўню. І, у прыватнасці, у Міністэрства аховы здароўя.

Сяргей ГРЫБ.

Мінск—Брагін.

АРАТЫЯ

Горацкая ралля а-ля Жан Марэ

Знакаміты французскі акцёр не мае дачынення да раллі, і да горацкай у прыватнасці. Размова ідзе пра французскага фермера і чэмпіёна свету па ўзворванні Жана Марэ, які, дарэчы, прыязджаў дэманстраваць сваё майстэрства і ў Беларусь. Менавіта на яго бездакорную працу раўняліся 8 лістапада горацкія механізатары, якія бралі ўдзел у традыцыйным конкурсе аратых.

У чыстым полі каля вёскі Сураўцова — яркая пляміна на восеньскім жоўта-карычневым фоне. У рад стаяць 17 трактароў «Беларус» — чырвоных і блакітных. Кожная сельская гаспадарка Горацкага раёна вылучыла сваіх лепшых механізатараў на конкурс аратых, які штогод арганізоўваюць мясцовыя ўлады і райкам прафсаюза АПК.

Поле падзелена на загоны: на ворыва адводзіцца гадзіна. Галоўны суддзя конкурсу Якаў Яроцкі, дырэктар Магілёўскага абласнога цэнтра кансультавання і аграрнай рэформы, настройваў удзельнікаў конкурсу: спачатку чытаў ім Сяргея Ясеніна пра веліч працы аратага, а потым паведамляў строгія крытэрыі судзейства.

— Ворыва — хітрая навука, — нагадаў спецыяліст. — Мы будзем ацэньваць якасць узворвання. Важны знешні выгляд раллі: ён павінен быць як пасля ручнога ворыва плугам. І таксама прамалінейнасць руху: як кажуць, каб з баразны можна было б стрэліць.

Першы намеснік старшыні Горацкага райвыканкама Анатоль Дуцько прывітаў лепшых аратых раёна і зазначыў, што ад іх працы у вялікай ступені залежыць будучы ўраджай.

Узрост удзельнікаў розны: ад 25 да 50 гадоў, ад спрытнай моладзі да вопытных і заслужаных працаўнікоў сельскай гаспадаркі. Браць удзел у конкурсе аратых і ганарова, і прыбыткова. Усім яго ўдзельнікам, незалежна ад занятага месца, будуць цэлы год плаціць за ворыва на 10 працэнтаў болей. Прызавое месца дазваляе атрымаць яшчэ большую прыбаўку: самым лепшым даюць 40 працэнтаў плюс да заробку. Акрамя гэтага, Горацкі райвыканкам забяспечыў прыстойныя прэміі пераможцам: ад 8 да 13 базавых велічынь.

Лепшы араты Горацкага раёна — Юрай КАЛЬЧЭЎСКІ.

Яркая пляміна на восеньскім полі — трактары на Дні аратага.

У адрозненне ад гледачоў і балельшчыкаў, якія мерзлі на халодным ветры, механізатарам, якія вярталіся з поля, ад працы было спякотна. Пакуль строгае журы аглядала вынікі ворыва, удзельнікам конкурсу прапанавалі гарачы абед: маўляў, хто добра есць — той добра працуе. А таксама цёплыя жарты і спевы ад жаночага ансамбля народнай песні «Суседкі» Паршынскага цэнтра культуры.

У чаканні вынікаў трактарысты нервова ўсміхаліся і абменьваліся ўражаннямі. Валерый Забяркоў з СВК «Каменская ніва» ў конкурсе аратых бярэ ўдзел не першы год: на гэты раз 7-гадовая дачка Насця прыстасавала ў кабіне талісман на шчасце — сваю любімую ляльку.

У Аляксандра Афанасьева з вытворчага ўчастка «Сава» РАПТа іншы талісман — падкова. Прычапіў яе на трактар ранейшы ўладальнік трактара «Беларус», але Аляксандр чакае ўдачы і для сябе. Летась ён не заняў прызавога месца, але і 10 працэнтаў прыбаўкі да заробку аказаліся зусім не лішнімі.

Аляксандр Канцавой з СВК імя Калініна не марнаваў часу на размовы, а старанна праціраў свайго «чырвонага каня». Вялізны трактар «Беларус-3022» у такога дбайнага гаспадара шыкоўна блішчыць на сонцы. Канцавы ўжо выйграваў конкурс аратых: на памяць пра перамогу на сцяне ў гасцёўні дома вісіць прыгожы дыван, набыты на прэмію.

Пераможца леташняга конкурсу аратых Юрый Кальчэўскі з племзавода «Леніна» на першае месца не прэтэндаваў — не верыў, што можна двойчы выйграць. Хоць на ўсякі выпадак старанна трэніраваўся напярэдадні: «Усю ноч араў!»

І менавіта ён, ужо ў другі раз, атрымаў галоўны прыз «Вышэйшае майстэрства механізатара»: стужку «Лепшы па прафесіі», грамату, прэмію і словы падзякі за добрую адказную працу!

— Я ўсё свядомае жыццё працую на трактары, а гэта больш за 15 гадоў, — расказаў шчаслівы Кальчэўскі. — Гэта нармальная праца, а мінулы год пасля конкурсу я з надбаўкай атрымліваў у сярэднім 700 тысяч рублёў. Як і летась, прэмію аддам сям'і: сыну патрэбны грошы на рэпетытараў, бо ён хутка будзе паступаць у навучальную ўстанову, а дачцэ-прыгажуні — на новае моднае адзенне.

З рук старшыні Горацкага райвыканкама Міхаіла Анікеева атрымалі прызы і іншыя пераможцы: два першыя месцы занялі Валянцін Крысін з СВК «Каменская ніва» і прадстаўнік УКСП «Горацкае» Юрый Мяцеліца.

Паводле агульнага меркавання, з Дня аратага атрымалася добрае і карыснае свята.

— Цяпер прыходзіць эпоха дакладнага земляробства, калі трактарам і плугам можна кіраваць праз касмічныя спадарожнікі, — расказаў Якаў Яроцкі. — Але з новымі тэхналогіямі не справіцца, калі няма элементарных навыкаў працы. Таму галоўная задача конкурсаў — навучыць аратых працаваць граматна і пазнаёміць іх з перадавымі ідэямі. Якія, напрыклад, ёсць у чэмпіёна свету па ворыве Жана Марэ.

— Год ад году нашы механізатары шліфуюць сваё прафесійнае майстэрства, — упэўнены кіраўнік Горачшыны Міхаіл Анікееў. — Удзельнікі конкурсу падцягваюць астатніх. І ведаеце, ад гэтага ёсць вынікі: на працягу апошняй пяцігодкі Горацкі раён плюсуе ў раслінаводстве, а таксама і ў жывёлагадоўлі, 10-15 працэнтаў штогод. Мы робім усё магчымае, каб нашы людзі жылі лепей і багацелі.

Ілона ІВАНОВА.

Горацкі раён.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЛЮДЗЕЙ НА АТАМНАЙ ПАДЛОДЦЫ ЗАБІЛА АЎТАМАТЫКА

8 лістапада на новай атамнай падводнай лодцы «Нерпа», яшчэ не прынятай у склад ВМФ Расіі, падчас заводскіх хадавых выпрабаванняў адбылося несанкцыянаванае ўключэнне аўтаматызаванай сістэмы пажаратушэння. У выніку аварыі загінулі 20 чалавек, з іх трое вайскоўцаў, 17 грамадзянскіх, у тым ліку члены здатачнай каманды завода-вытворцы.

Акрамя таго, пацярпеў 21 чалавек. Падлодка сваім ходам прыбыла на базу. Праводзіцца расследаванне інцыдэнту.

У ЧЭХІІ СУТЫКНУЛІСЯ ПАСАЖЫРСКІ І ТАВАРНЫ ЦЯГНІКІ

За сотню кіламетраў ад Прагі 10 лістапада адбылося сутыкненне таварнага і пасажырскага цягнікоў.

У выніку аварыі пацярпелі 13 чалавек, дзесяць з іх шпіталізаваныя, двое знаходзяцца ў цяжкім стане. Сутыкненне адбылося прыкладна ў гадзіну дня побач з горадам Ждзірац над Дубравай.

ЕЎРАСАЮЗ ПРАВЯДЗЕ ВАЕННА-МАРСКУЮ АПЕРАЦЫЮ СУПРАЦЬ САМАЛІЙСКІХ ПІРАТАЎ

Еўрапейскі саюз зацвердзіў рашэнне аб правядзенні першай у сваёй гісторыі ваенна-марской аперацыі, якая будзе накіраваная супраць піратаў у раёне ўзбярэжжа Самалі. Такое рашэнне прынята ў панядзелак на сустрэчы міністраў замежных спраў і абароны 27 дзяржаў супольнасці.

Аперацыя, якая атрымала назву «Аталанта», прадугледжвае адпраўку да берагоў Самалі ад шасці да дзесяці караблёў. Яны будуць каардынаваць свае дзеянні з вайскоўцамі НАТА і ЗША. Нагадаем, у раёне Афрыканскага рога знаходзяцца і ваенныя караблі РФ, якім таксама дазволена ўжываць сілу для барацьбы з піратствам.

Паводле звестак Міжнароднага марскога бюро, сёлета піраты здзейснілі 81 напад на замежныя судны. 11 суднаў разам з экіпажамі, якія налічваюць у агульнай складанасці каля 200 чалавек, па-ранейшаму знаходзяцца ў руках піратаў.

БЕСПРАЦОЎЕ Ў ЗША ВЫРАСЛА ДА РЭКОРДНАГА ЎЗРОЎНЮ

Узровень беспрацоўя ў ЗША ў кастрычніку 2008 года склаў 6,5 працэнта. Гэта самы высокі паказчык за апошнія 14 гадоў.

У мінулым месяцы працадаўцы скарацілі колькасць працоўных месцаў на 240 тысяч. З пачатку года эканоміка краіны пазбавілася 1,2 мільёна працоўных месцаў.

На працягу толькі аднаго тыдня з 25 кастрычніка па 1 лістапада колькасць амерыканцаў, якія ўпершыню звярнуліся па дапамогу па беспрацоўі, склала 481 тысячу чалавек.

ПЕНСІЯНЕР УПАЎ У ШАХТУ ЛІФТА...

У мінулы чацвер на другой лініі Мінскага метрапалітэна на некалькі хвілін давялося прыпыніць рух цягнікоў з-за няшчаснага выпадку: на рэльсы ўпаў 47-гадовы рабочы.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама на пачатку пятай гадзіны вечара ў мужчыны на станцыі метро «Каменная Горка» пачаўся прыступ эпілепсіі і ён зваліўся на пуці. Пацярпелы дастаўлены ў бальніцу.

У гэты ж дзень у доме па праспекце Ракасоўскага, медыкі ўжо нічым не змаглі дапамагчы 61-гадоваму пенсіянеру. Стары, які пражываў у гэтым доме, па неасцярожнасці ўпаў з 7 паверха ў шахту ліфта. Пенсіянер загінуў на месцы здарэння. А ў суботу ў сталіцы на будоўлі загінуў 24-гадовы муляр. Мужчына працаваў на трэцім паверсе жылога дома адкулі і зваліўся. З адкрытай чэрапна-мазгавой траўмай цяжкай ступені ён быў дастаўлены ў бальніцу, аднак урачы не змаглі выратаваць яму жыццё.

Ігар ГРЫШЫН.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

26 ноября 2008 г. проводит открытый аукцион № 05-Сф-08 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Вид аукциона: открытый (на повышение цены продажи).
Предмет аукциона: право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляются 2 земельных участка, расположенные в районе малоэтажной застройки в границах пр. Победителей — проезда Дрозды — р. Свислочь (застройка жилого квартала № 2) для строительства одноквартирных (блокированных) жилых домов:

Лот №	№ участка по ген-плану	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.
1	12	500000000007004268	0,0911	528 975 871	52 897 590	Участок свободен от застройки и насаждений	2 156 707
2	13	500000000007004269	0,0884	513 298 211	51 329 830	Участок свободен от застройки и насаждений	2 112 475

Земельные участки находятся в водоохранной зоне водных объектов г. Минска.
Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона: своевременное внесение победителем аукциона платы за соответствующие земельные участки; возмещение им расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона и формированием этих земельных участков, учитывая их государственную регистрацию.
Справочно: - в течение 2-х месяцев после принятия Минским горисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельных участков соответствующие имущественные права на них должны быть зарегистрированы в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;
- техническая документация и разрешение на строительство жилого дома получается владельцами земельных участков в установленном порядке;
- победители аукциона заключают с Минским городским исполнительным комитетом договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений);
- собственникам земельных участков необходимо завершить возведение одноквартирного (блокированного) жилого дома не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации прав на земельный участок.
Аукцион состоится **26 ноября 2008 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.
Для участия в аукционе необходимо:
внести задаток в размере 10 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 795, УНП 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома;
представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:
заявление на участие в аукционе установленной формы;
заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере;
подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, победивший в торгах, либо которому земельный участок предоставляется по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, обязан произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение в размере 1 % от цены продажи соответствующего земельного участка.
Дополнительно представляется:
гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;
представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.
При подаче документов на участие в аукционе граждане и представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Прием документов для участия в аукционе начинается с **09.00 12 ноября 2008 года** и заканчивается в **17.00 20 ноября 2008 года**.
Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.
Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:
внести плату за земельный участок;
возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
произвести оплату организатору торгов за подготовку и проведение аукциона, включающую возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, в размере 1 процента от цены продажи земельного участка;
выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.
После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает выписку из решения о предоставлении земельного участка в частную собственность.
Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.
В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.
Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе, осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 4, 6.

Контактные телефоны: + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.

Дополнительная информация о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов www.mgcn.by.

УНП 190398583

БАТЭ пакрыўджаны «Зенітам» і крыўдзіцца на несумленных фанатаў

У матчы чацвёртага тура групавога этапа Лігі чэмпіёнаў барысаўскі БАТЭ саступіў піцерскаму «Зеніту» 0:2. Мяркую, што многія балельшчыкі беларускага клуба лавілі сябе на думцы, якую выказаў у пасляматчавым інтэрв'ю нападаючы Віталь Радзівонаў: «Ніколі не думаў, што калі-небудзь буду перажываць з-за таго, што мы прайгралі «Зеніту». Сапраўды, гэтым летам і восенню барысаўская каманда даказала, што нават саступаючы ў класе і прайграючы ў клубным бюджэце, можна выйграваць у жаданні і самааддачы, і апошняе ніколькі не менш уплывае на вынік.

Дарэчы, што датычыцца клубнай «касы», то перад пачаткам групавога этапа БАТЭ з бюджэтам у 5 мільёнаў долараў лічыўся самым танным клубам з 32 удзельнікаў турніру. Дзякуючы выступленню ў Лізе чэмпіёнаў, каманда зарабіла больш, чым складаў увесь яе бюджэт. Сёлетні турнір прынясе камандзе сама менш 6 мільёнаў еўра. Нічыя ў другім туры групавога турніру з «Ювентусам», гадавы бюджэт якога, дарэчы, ацэньваецца ў 300 мільёнаў еўра, прынесла барысаўскаму клубу 300 тысяч у еўрапейскай валюце. Столькі ж паклалі ў клубную скарбонку футбалісты і за нічыю з «Зенітам» (бюджэт газпрамаўскай каманды — 140 мільёнаў еўра). Да таго ж за сам выхад у групавы этап кожная каманда атрымлівае па тры мільёны еўра, плюс па 400 тысяч еўра за кожны матч, а іх усяго шэсць.

Пасля паядынка галоўны трэнер БАТЭ **Віктар ГАНЧАРЭНКА** падзяліўся меркаваннем, што каманда хоць і прайграла, але набыла неабходны вопыт. «У футболе так: калі дзесьці фарціць, то потым фартуна паварочваецца да цябе іншым месцам. У першым матчы ў «Зеніта» галявых момантаў было больш, чым сёння, але тады была нічыя. А цяпер пры роўнай гульні мы прайгралі». Галоўны трэнер барысаўчан таксама звярнуў увагу на тое, што пасля першага тайма статыстыка фалоў была 2 супраць 19 на карысць «Зеніта» і зазначыў, што яго каманда гуляла з непатрэбнай павагай да сапернікa. Піцерцы ж дзейнічалі даволі жорстка — па меншай меры так здавалася з трыбуны. Паўабаронца БАТЭ **Ігар СТАСЕВІЧ** у пасляматчавым каментарыі адзначыў, што сапернік не гуляў надта жорстка, хоць часам і біў спадцішка. **Віталь РАДЗІВОНАЎ** таксама выказаў меркаванне, што зенітаўцы гулялі не груба, а «разумна».

Вынікам стала даволі цяжкая траўма, якую атрымаў Уладзімір Ржэўскі. У 21-гадовага барысаўскага абаронца пералом ладыжкі, адразу пасля матча яму наклалі гіпс. Гульнявы сезон на гэтым для футбаліста скончаны. Да траўмы Ржэўскі правёў у складзе БАТЭ ўсе матчы Лігі чэмпіёнаў, уключаючы кваліфікацыйныя.

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Беларусі **Бернд ШТАНГЕ** пракаментаваў матч паміж БАТЭ і «Зенітам» наступным чынам: «Вынік заканамерны. Беларускаму клубу было складана выканаць задачу і перамагчы ў гэтым матчы. Нашым гульцам не хапае класа, яны яшчэ не навучыліся выціскаць максімум з рэалізацыі стандартных палажэнняў. У гэтым матчы паміж БАТЭ і «Зенітам» і нацыянальнымі зборнымі Беларусі і Англіі падобныя. Шанцы на перамогу былі, але клас сапернікa аказаўся вышэйшым. Тыя, хто кажа, што БАТЭ можа разлічваць на трэцяе месца, — аптымісты. Рэальна наша месца — апошняе».

Капітан расійскага клуба **Анатоль ЦІМАШЧУК** пасля гульні зазначыў, што выстаяць удзесяцярых пасля выдалення каманда здолела, дзякуючы падтрымцы сваіх балельшчыкаў. А іх і сапраўды было надзвычай многа. Толькі паводле афіцыйных даных ГУУС Мінгарвыканкама, на матчы прысутнічала 4,8 тысячы расіян. Усяго ж паядынак на трыбунах стадыёна глядзела каля 28 тысяч балельшчыкаў. Футбольны клуб БАТЭ збіраецца прыняць меры, каб прызначаныя беларускім балельшчыкам білеты не траплялі ў рукі прыхільнікаў камандаў-саперніц. У звароце да балельшчыкаў на сваім афіцыйным сайце БАТЭ канстатуе, што «фанатаў расійскай каманды на стадыёне было значна больш, чым ім было выдаткавана білетаў і прапускоў згодна з міжклубным пагадненнем». «У свой час па рэкамендацыі футбольнага клуба БАТЭ барысаўскаму гарадскому стадыёну было прадстаўлена каля дзевяці тысяч білетаў для іх распаўсюджвання ў Барысаве, — гаворыцца ў звароце. — Мы вельмі разлічвалі, што яны трапяць у рукі прыхільнікаў каманды, якія пасапраўднаму падтрымаюць нашых хлопцаў. Але якім жа было наша здзіўленне і які шок мы адчулі, калі ў сектарах, білеты ў якія прадаваліся ў Барысаве, ільвіная доля месцаў аказалася занятай балельшчыкамі «Зеніта». Гэта азначае, што значная колькасць квіткоў яўна не без дапамогі нячыстых на руку барысаўчан была перапраўленая ў Санкт-Пецярбург, замест таго, каб аказацца ў тых, хто па-сапраўднаму перажывае за БАТЭ».

Далей адзначаецца, што аналагічная сітуацыя склалася і з запаўненнем лож. Пропускі ў іх выдаткоўваліся кіраўніцтвам ФК БАТЭ спонсарам, партнёрам, блізкім клубу людзям. Аднак прадстаўнікі «Зеніта» былі і тут. Перадачу, продаж сваіх запрашальных білетаў прыхільнікам санкт-пецярбургскай каманды БАТЭ расцэньвае як «подлы ўдар у спіну» і не мае намеру мірыцца з гэтым.

Трэба адзначыць, што праз касы барысаўскага стадыёна і стадыёна «Дынама» рэалізоўвалася менш за палову ўсіх білетаў на матч. Большая іх частка распаўсюджвалася праз кампанію «АБФФ-Падарожжа» па заяўках прадпрыемстваў. Верагодна, схема названай кампаніі па распаўсюджванні і дае збоі.

Паводле паведамленняў інтэрнэт-рэсурсаў, двое піцерскіх балельшчыкаў былі затрыманыя ў ноч з 5 на 6 лістапада ў Мінску. Судом Цэнтральнага раёна сталіцы яны асуджаныя на сем сутак зняволення. Паводле слоў балельшчыкаў «Зеніта», фанаты былі «затрыманыя супрацоўнікам ДАІ за парушэнне правілаў дарожнага руху, лаянку з прахожымі і вадзіцелямі».

Алена АЎЧЫННІКАВА.

90 ГАДОЎ, ЯК АДЫШЛА Ў НЯБЫТ ВЯЛІКАЯ ЕЎРАПЕЙСКАЯ ВАЙНА

Сёння юбілейная дата. Роўненька 90 гадоў таму, 11 лістапада 1918 года, у 5.10 раніцы ў Камп'енскім лесе, у чыгуначным вагоне паблізу французскай станцыі Рэтонд было заключана мірнае пагадненне паміж Германіяй з аднаго боку і Францыяй, Вялікабрытаніяй, ЗША і іншымі дзяржавамі з другога боку. А 11-й гадзіне раніцы пагадненне набыло моц — і насельніцтва планеты ўздыхнула з палёгкай: вайна завершана. Вялікая Еўрапейская вайна. Ці, як мы прывыклі называць, Першая сусветная.

Так, менавіта сёння споўнілася 90 гадоў з моманту заканчэння Першай сусветнай вайны. Каля паўгода таму мы на старонках нашай газеты закранулі тэму гэтай забытай вайны, і было вельмі прыемна, калі высветлілася, што Першую сусветную нельга назваць поўнасцю забытай, лепей — амаль забытай. Здавалася б, за савецкім часам, за жудаснымі падзеямі Другой сусветнай памяць пра Першую сусветную вайну павінна сысці ў нябыт. Ат не! Яна жыве і сёння сярод нас у выглядзе ўспамінаў пра родзічаў, крыжоў і камянёў на могілках рускіх і нямецкіх салдат, пазірае на нас з пустых бойніцаў бетонных дотаў... Мы атрымалі лісты ад вас, нашых чытачоў, з аповедамі пра вашых блізкіх, якія былі непасрэднымі ўдзельнікамі вайны. Вельмі добра, што вы падтрымліваеце ініцыятыву «Звязды» і робіце пасільны ўнёсак у скасаванне «забытасці» вайны. Вось і сёння мы раскажам пра лёсы беларусаў у той вайне — друкуем ліст ад Зоі Вікенцьеўны Голікавай, якая таксама не хоча, каб Першую сусветную вайну называлі забытай.

Цікава, што тэма Першай сусветнай аказалася неабыякавай і для чыноўнікаў. Тут газетнай ініцыятыве дапамагло пасяджэнне Камісіі па імплементацыі міжнароднага гуманітарнага права на чале з міністрам юстыцыі Віктарам Галаванавым, якое адбылося сёлета ў лістападзе. Шэраг рашэнняў, прынятых на гэтым пасяджэнні, былі разасланыя па міністэрствах і рэгіянальных органах кіравання, і, здаецца, пра памяць ахвяраў Першай сусветнай загаварылі і ў большменш высокіх кабінетах. Прынамсі, я праглядаў пісьмовыя адказы з абласных выканкаманаў і з радасцю заўважаў фразы накшталт «асаблівую ўвагу рэкамендавана надаць пахаванням Першай сусветнай вайны». Ёсць і пэўныя прапановы: унесці змены у КаАП у частцы забеспячэння цэласці вайсковых пахаванняў, удасканаліць шэраг дакументаў па пошуку пахаванняў і ўвекавечанні памяці ваяроў, заснаваць нагрудны знак Міністэрства абароны «За актыўны пошук» і нават увесці рэгістрацыю металашукальнікаў... Ці ператворацца гэтыя прапановы ў змены заканадаўства — пакажа час, але галоўнае, што рухавік закруціўся!..

Здаецца, нават вырашаецца набалелае пытанне з брацкімі могілкамі салдатаў Першай сусветнай вайны ў раёне мінскай Старажоўкі.

Былыя брацкія могілкі ахвяраў Першай сусветнай вайны ў раёне Старажоўкі

Перад выхаднымі завітаў туды: месца абгароджана, працуюць некалькі адзінак спецтэхнікі, на рагу вуліц Веры Харужай і Чарвякова ўсталяваны стэнд з надпісам «Добраўпарадкаванне тэрыторыі былых брацкіх могілак ахвяраў Першай сусветнай вайны» з камп'ютарным малюнкам таго, як гэтая тэрыторыя будзе выглядаць праз нейкі час. Працы павінны скончыцца на працягу 2009 года, калі верыць шыльдзе «пашпарт аб'екта», якая вісіць з боку Старавіленскага тракта. Дарэчы, што за мемарыяльная кампазіцыя будзе ўсталявана на былых брацкіх могілках — пакуль невядома, бо якраз цяпер праходзіць адкрыты конкурс на праект гэтага мемарыяла. І любы ахвотны да 17 гадзін 22 снежня 2008 года можа прадаставіць сваё бачанне ўшанавання памяці ахвяраў Першай сусветнай вайны, а пасля 10 студзеня 2009 года мы даведаемся пра вынікі конкурсу...

Над тэмай Першай сусветнай вайны папрацавалі і беларускія архівісты: да сённяшняга юбілею яны правялі «рэвізію» дакументаў, што датычацца той вайны. На жаль, дакументы і матэрыялы, якія звязаны з непасрэдным ходам баявых дзеянняў на франтах Першай сусветнай вайны, у нашых архівах адсутнічаюць. Па гэтай тэматыцы дакументы захоўваюцца ў Расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве. Але і ў беларускіх архіўных фондах ёсць шмат чаго цікавага — у асноўным гэта дакументы, звязаныя з дзейнасцю тылавых арганізацый, установ і прадпрыемстваў, дакументы асабістага паходжання, дакументы ўстаноў на акупаванай немцамі тэрыторыі і розныя фотадакументы. Усе гэтыя паперы яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў, і хто ведае, якія таямніцы адкрыюць праз дзесяцігоддзі!.. Дарэчы, цэлы шэраг дакументаў, што нідзе раней не публікаваліся, можна пабачыць на выставе «Апошняя вайна Расійскай імперыі ў дакументах архіваў Беларусі», якая адкрылася якраз сёння ў будынку Міністэрства юстыцыі (Мінск, вул. Калектарная 10). Супрацоўнікі Дэпартамента па архівах і справаводстве паабяцалі, што прапускная сістэма турнікетаў у міністэрстве не стане перашкодай, і наведаць выставу змогуць усе ахвотнікі.

Што ж, віншую ўсіх з гэтай юбілейнай датай — 90-годдзем завяршэння Вялікай Еўрапейскай вайны. Але гэта не значыць, што пасля сённяшняга нумара мы зноў забудземся пра яе. Ні ў якім разе. Мы і надалей будзем друкаваць публікацыі і лісты, звязаныя з Першай сусветнай. Напярадзе — 100-гадовы юбілей. І мы маем права і нават павінны ведаць пра лёсы нашых суайчыннікаў, што мерзлі ў акопах і гінулі пад кулямі. Мы не можам пра іх забыць. І не забудзем. Давайце зараз памаўчым хвілінку ў іх гонар...

Павел БЕРАСНЕЎ.

Школа падаткаплацельшчыка

Кошт білетаў — даход, што абкладаецца падаткам

Рэдакцыя працягвае адказваць на самыя актуальныя пытанні нашых чытачоў. Сёння чарговую кансультацыю даюць спецыялісты галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах.

— Мая сяброўка, грамадзянка Расіі, цяпер жыве ў адной з арабскіх краін. Яна запрасіла мяне на вяселле і згадзілася аплаціць білеты, кошт якіх складае каля 900 долараў. Ці трэба мне падаваць падатковую дэкларацыю з гэтых даходаў, атрыманых з-за мяжы ў натуральнай форме, і ў якія тэрміны? Калі я вярну сяброўцы кошт білетаў наяўнымі грашыма, то якія дакументы мне патрабуюцца?

Антаніна Іванаўна, *г. Мінск.*

— Сума грашовых сродкаў, атрыманых вамі ад сяброўкі з-за мяжы (не ад блізкага сваяка), з'яўляецца даходам, які абкладаецца падаткам.

Пры атрыманні даходаў з крыніц за межамі Беларусі фізічная асоба павінна пасля заканчэння каляндарнага года падаць у падатковы орган не пазней як 1 сакавіка падатковую дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе. Указаныя даходы абкладаюцца падаходным падаткам па стаўках згодна з артыкулам 18 Закона «Аб падаткаабкладанні фізічных асобаў». Падатковыя стаўкі ў лічбавым выкладанні размешчаны на сайце www.nalog.by.

Факт вяртання грашовых сродкаў можна пацвердзіць распіскай ці іншымі дакументамі, афармленымі ў адпаведнасці з заканадаўствам той краіны, на тэрыторыі якой яны былі складзеныя.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

РУП «Белспецконтракт» проводит 13-й открытый аукцион объектов республиканской собственности 12 декабря 2008 г.

Лот	Наименование объекта (местонахождение объекта, общая площадь (кв.м)	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Начальная цена права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания объектов (руб.)	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Площадь отчуждаемого участка (га)
1	2	3			4	5
1	Здания, сооружения и благоустройство военного городка № 2, г. Орша, ул. Московская, 1а земельный участок 242400000001000507 земельный участок 242400000001003343	4 495 000 000	320 000 000 3 000 000	4 818 000 000	481 800 000	11,8017 0,1084

Тип помещений: Здания в аренде не находятся.

Окончательное решение об отводе земли принимается местными органами власти. Аренда земельных участков на 50 лет.

Аукцион состоится в 11.00 12 декабря 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17 часов 10 декабря 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604 предприятия.

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 12 декабря 2008 года.

2. Произвести оплату стоимости объекта до 25.12.2008 года.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.**

Справки по тел.: (017) тел./факс 224 88 05.

Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com; e-mail: info@belspeckontrakt.com

Вайне канец, а жыццё — працягваецца...

Вельмі ўдзячна журналістам «Звязды», што ўспомнілі пра Першую сусветную вайну. Вельмі шкада, што мы не ведаем і не помнім людзей, якія сваёй крывёю і жыццём баранілі гэтую зямлю. Палітыка часам брала верх над праўдай. Сумна і крыўдна за тых, хто быў удзельнікам падзей больш чым 90-гадовай даўнасці.

Ну а цяпер бліжэй да справы. Хачу напісаць пра сваіх родзічаў, якія былі ўдзельнікамі той вайны. Я не прэтэндую на дакладнасць, бо ведаю пра падзеі тых дзён з успамінаў, якія чула ў дзіцячыя гады, калі старэйшыя былі жывыя. Мой бацька, яго родны брат, два стрыечныя браты майго бацькі і яшчэ два мае дзядзькі былі непасрэднымі ўдзельнікамі Першай сусветнай вайны. Адны з іх былі ў арміі генерала Брусілава і ўдзельнічалі ў вядомым прарыве ў Галіцыі. Часта ўспаміналі Перамышль і маленькую вёску Підкамінне, жыхары якой частавалі іх мамалыгай, успаміналі свайго камандзіра штабс-капітана Глушкова. Другія былі ў арміі генерала Самсонава і ў раёне Мазурскіх азёраў былі акружаныя і трапілі ў палон да немцаў. А адзін дзядзька перажыў газавую атаку і на ўсё жыццё страціў здароўе.

Хачу напісаць пра свайго бацьку, Дразда Вікенція Кліменцьевіча. Быў ён чалавекам ураўнаважаным і вялікім аптымістам. Пражыў доўгае жыццё і памёр на 95-м годзе, і як я цяпер разумею, жыццё ў яго было нялёгкім, але без вялікіх сямейных трагедый. Бацька нарадзіўся 28 жніўня 1893 года ў мястэчку Глыбокае Дзісненскага павета Віленскай губерні. Сям'я была сялянская, вялікая і дружная. Акрамя майго бацькі, былі яшчэ два браты і дзве сястры. Усе дзеці вучыліся ў школе, а самая малодшая закончыла настаўніцкую семінарыю. Мой бацька закончыў прыходскую школу і народнае вучылішча, быў даволі адукаваным чалавекам. Захаваліся пасведчанні аб заканчэнні вучобы з выдатнымі адзнакамі. Напярэдадні Першай сусветнай вайны быў прызваны ў армію і служыў ва Уладзівастоку. Любіў апавядаць, як яны ехалі каля возера Байкал, праз шматлікія тунэлі, як выглядаюць сопкі і тайга і шмат іншага.

Дрозд Вікенцій Кліменцьевіч з сябрам.

Калі пачалася Першая сусветная вайна, бацьку і яго саслужыўцаў паслалі на заходні фронт. Бацька любіў успамінаць пра падзеі вайны. Расказваў ён і пра цяжкія пераходы ў гарачыню, калі салдаты нават гінулі ад сонечнага ўдару. Ваяваць яму давялося ў раёне Аўгустоўскага канала і Смаргоні, дзе былі вельмі цяжкія баі. Часта ўспамінаў вёску Укропенку (дарэчы, яна ёсць і цяпер), дзе яны ўсю зіму трымалі лінію абароны ў вельмі цяжкіх умовах — жылі ў акопах і траншэях, прыкрытых брызентавымі палаткамі. За ўдзел у гэтых баях быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжам, які давалі за храбрасць.

Бацька быў высокі, стройны і прыгожы. Улічваючы яго франтавыя заслугі і знешнія даныя, яго залічылі ў Георгіеўскі батальён, які ахоўваў цара Мікалая II падчас яго знаходжання ў стаўцы галоўнага камандавання заходнім фронтам ў Магілёве. Бацька распавядаў, як выглядаў Мікалай II і наследнік прастола Аляксей. Калі ў лютым 1917 года пачалася рэвалюцыя і ад цара запатрабавалі адрачэння ад прастола, бацька быў у ліку аховы цара і суправаджаў яго да станцыі Дно, дзе цар і падпісаў адрачэнне. Пасля гэтага ахова была знятая і бацька вярнуўся ў Магілёў. У арміі і краіне пачаліся развал і неразбярыха. Армія развалілася і бацька хутка вярнуўся дадому.

У 1920 годзе Глыбокае апынулася ў складзе Польскай дзяржавы. Галоўным сродкам існавання сям'і была сельская гаспадарка. Акрамя заняткаў земляробствам бацька разводзіў пчол, займаўся конегадоўляй. Ён вельмі любіў коней, быў членам гуртка конегадоўлі і атрымліваў дыпломы і прэміі. У нас быў добры сад — гэта яшчэ адно захапленне бацькі. Бацька падтрымліваў сувязь з вядомым садаводам Сікорай. Яшчэ ён сябраваў з мастаком Язэпам Драздовічам, які часта бываў у нас і нават некаторы час жыў у нашай хаце.

У гады Вялікай Айчыннай вайны мае бацькі спачувалі партызанам і падпольшчыкам. Памятаю, як аднойчы ў нас спыніўся абоз з трох фурманак, што везлі з Мінска медыкаменты і ўрача Серыкаву Алену ў Шаркаўшчыну ці Германавічы да партызан.

Пасля вайны пачалася калектывізацыя, і бацькі ўступілі ў калгас. У калгасе, які называўся «Бальшавік», была створана садаводча-гароднінная брыгада. Бацька стаў яе брыгадзірам і працаваў на гэтай пасадзе да выхаду на пенсію ў 1963 годзе ва ўзросце 70 гадоў. Пад кіраўніцтвам бацькі быў пасаджаны калгасны сад. Яшчэ вырошчвалі памідоры, агуркі, кабачкі, цыбулю. Усё гэта было сыравінай для кансервавага завода. Бацьку вельмі паважалі, з яго меркаваннем лічыліся. Ён быў вельмі працавіты. Два разы быў удзельнікам сельскагаспадарчай выставы ў Маскве, двойчы ўзнагароджаны медалямі, атрымліваў падзякі.

Яшчэ ён быў добрым бацькам. Нас, сваіх дзяцей, імкнуўся выхаваць працалюбівымі, даць адукацыю, хоць матэрыяльна гэта было нялроста. Мы, дзеці, гэта разумелі. Усе мы паступілі ў Мінск, сталіся атрымліваць стыпендыю, бо ведалі, што ў бацькоў лішніх грошай няма. Я і сястра сталі педагогамі, а брат — інжынерам.

Зоя ГОЛІКАВА, *г.п. Расоны.*

Паўмільёна — за канцэрт

МАГІЛЁЎСКІЯ МАЛАДЫЯ МУЗЫКАНТЫ САБРАЛІ ГРОШЫ ДЛЯ ДЗІЦЯЧАГА ХОСПІСА

У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя Аркадзя Куляшова 4 лістапада прайшоў дабрачынны канцэрт «Белыя крылы» на карысць цяжкахворых дзяцей. Яго арганізаваў універсітэцкі цэнтр аўтарскай песні «Верталёт».

На канцэрце бясплатна выступілі 9 вядомых магілёўскіх аўтараў песень: Мікіта Емяльянаў, Алёна Каўкова і іншыя.

— Мы аб'явілі ўваход па сумленні, умоўная плата — добраахвотны ўзнос для дзяцей хоспіса, — паведаміў кіраўнік цэнтра Цімафей Яровікаў. — Сабраліся на канцэрт у невялікай харавой аўдыторыі болей за сотню чалавек, месцаў усім не хапіла — людзі сядзелі ў праходах, на прыступках. Мы проста паставілі скрыню для грошай і былі вельмі здзіўленыя вынікам.

Як паведаміла старшыня дабрачыннай грамадскай арганізацыі «Магілёўскі дзіцячы хоспіс» Лілія Судзілоўская, на канцэрце ўдалося сабраць 520 тысяч рублёў. «Мы дзякуем за дапамогу неабыякавым людзям!» — сказала жанчына.

Сёння хоспіс дбае пра 12 дзяцей, якія пакутуюць на цяжкія анкалагічныя захворванні. Усе сем'і, дзе ёсць хворыя дзеці, маюць патрэбу ў дапамозе. Неадкладная падтрымка патрэбна дзяўчынцы, бацькоў якой пазбавілі правоў. Грошы на паліва выдаткуюць сям'і, якая жыве і даглядае хворага хлопчыка ў доме без выгодаў.

Ілона ІВАНОВА.

ЗРАБІЛА АБГОН І...

Каля в. Тартакі, праз якую пралягае аўтамагістраль Баранавічы—Слонім, «Мазда-626» паспрабавала зрабіць абгон, але сутыкнулася з аўтамашынай «Рэно-Магнум», якая рухалася насустрач. У выніку аварыі загінулі жанчына-вадзіцель «Мазды», яе маці-пенсіянерка і сын — вучань 8-га класа, а васьмігадовая дачка апынулася ў бальніцы.

Кар. «Звязды».

Прэс-канферэнцыі

БЕЛАРУСКІ СПАДАРОЖНІК БУДЗЕ ЗАПУШЧАНЫ Ў КАНЦЫ 2009-га

Новы беларускі касмічны апарат, які плануецца падрыхтаваць да запуску на арбіту да канца 2009—пачатку 2010 года, будзе лягчэйшым за свой папярэднік, які летась быў запушчаны няўдала, яго вага будзе каля 400 кілаграмаў. Пра гэта паведаміў выканаўчы дырэктар праграмы «Космас-НТ» Аркадзь Краўцоў. Аднапультавы цэнтр кіравання мяркуецца размясціць у Беларусі, запасны цэнтр на экстранныя выпадкі будзе знаходзіцца ў Расіі. Аднак працэс стварэння, тэсціравання і запуску няпросты, нягледзячы на адпрацаваную на папярэднім апараце тэхналогію, і патрабуе больш за 1,5 года. Запуск таксама патрабуе спрыяльных умоў — як надвор'я, так і адпаведнага знаходжання Зямлі.

У межах стварэння адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы паміж Расіяй і Беларуссю з 1999 года паступова выконваліся тры касмічныя праграмы Саюзнай дзяржавы: «Космас-БР», «Космас-СГ», «Космас-НТ». Як расказаў намеснік кіраўніка Прадстаўніцтва Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Павел Куземчак, больш за 70 мільёнаў расійскіх рублёў было выдаткавана з бюджэту Саюзнай дзяржавы на першую праграму «Космас-БР», на другую — 587 мільёнаў. Трэцяя праграма «Космас-НТ», выкананне якой пачалося сёлета ў верасні, разлічана на 1 мільярд 420 мільёнаў расійскіх рублёў. Першая касмічная праграма была невялікай і яе асноўнай мэтай было аднаўленне страчаных падчас развалу СССР сувязяў паміж навукоўцамі і прадпрыемствамі. З беларускага боку ў ёй бралі ўдзел 12 прадпрыемстваў, з расійскага — 17. За гэты час былі выпрацаваны прыярытэтныя для нашай краіны напрамкі, якія патрэбна было развіваць. Найперш гэта прыборабудаванне — распрацоўкай прыбораў для касмічных апаратаў займаліся беларускія прадпрыемствы і ў савецкія часы. Другі напрамак — дыстанцыйнае зандзіраванне Зямлі (фатаграфаванне з космасу), якое сёння выкарыстоўваецца ў розных галінах народнай гаспадаркі, у прыватнасці падчас лясных пажараў, у сельскай гаспадарцы для прагназавання ўраджаю, пры пошуку карысных выкапняў, вызначэння несанкцыянаваных высечкі, а таксама хваробаў лесу. Яшчэ адзін з прыярытэтных напрамкаў — навігацыя (месцавызначэнне любога рухомага і нерухомага аб'екта). Гэты напрамак надзвычай актуальны для Беларусі, праз якую праходзяць шматлікія транспартныя калідоры. У сучасных умовах, калі большасць аўтафургонаў абсталявана навігацыйнымі прыладамі, абсталяваць імі плануецца і большасць міжнародных аўтамагістраляў, якія праходзяць і праз нашу краіну.

Яшчэ адным вынікам працы беларускіх навукоўцаў разам з расійскімі калегамі была распрацоўка прыстасаванняў траекторных вымярэнняў, якія патрэбны падчас запуску ракет (калі ракета адхіляецца ад траекторыі, то гэтыя прыборы дазваляюць яе вярнуць на заданы шлях). З савецкіх часоў такія прыстасаванні выраблялися менавіта на беларускіх прадпрыемствах, аднак з таго часу маральна састарэлі. Мадэрнізаваныя прыборы былі ўстаноўлены на Байкануры і паспяхова працуюць.

Яшчэ адзін цікавы праект другой праграмы — вызначэнне па касмічных здымках месцазнаходжання нафты ў раёне Аршанскай упадзіны. Звычайныя геалагаразведачныя метады надзвычай дарагія, касмічныя здымкі дапамагаюць вызначыць месцы найбольш верагоднага залягання і пры гэтым значна зэканоміць сродкі. У Беларусі былі створаныя і прыборы для выпрабоўвання матэрыялаў для адкрытага космасу.

Праграма «Космас-НТ» стартавала сёлета. Яна прадугледжвае стварэнне адзінага банка касмічных даных, які збярэ інфармацыю, што знаходзіцца часткова ў Маскве, часткова ў Мінску, і дасць магчымасць карыстання ёй праз камунікацыйныя сеткі. Спачатку гэта паслуга будзе распаўсюджвацца на міністэрствы, арганізацыі і ведамствы, праз нейкі час мяркуецца, што доступ да здымкаў з касмічных апаратаў атрымаюць усе ахвотныя. У межах новай праграмы будзе весціся работа па стварэнні мікраспадарожнікавай платформы, якая дазволіць выводзіць на арбіту спадарожнік з вялікімі функцыянальнымі магчымасцямі вагой да 150 кілаграмаў. Таксама гэта і запуск беларускага і расійскіх спадарожнікаў, якія будуць забяспечваць інфармацыяй абедзве краіны. Праграма «Космас-НТ» будзе завершана ў 2011 годзе.

Алена КРАВЕЦ.

ПАДШЭФНАЯ ШКОЛА Ў ГАСЦЯХ У СПЕЦСЛУЖБЫ

Фота Арлура СТРЭХА.

У межах акцыі «Органы дзяржбяспекі тваёй краіны» намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь Мікалай Смаленскі сустрэўся з вучнямі падшэфнай Цясноўскай сярэдняй школы Стаўбцоўскага раёна.

На гэты раз каля 40 дзяцей і настаўнікаў упершыню наведалі гісторыка-дэманстрацыйны цэнтр КДБ, сустрэліся з ветэранамі органаў дзяржбяспекі, пабачылі ўзоры зброі і спецсродкаў, што знаходзяцца на ўзбраенні антытэрарыстычных падраздзяленняў. Выдатнікі вучобы і спорту, выкладчыкі школы, якія ўнеслі значны ўклад у патрыятычнае выхаванне моладзі, атрымалі памятныя падарункі і граматы.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Ну і ну!

ПЯЦЬ СТРЭЛАЎ У ЧАЛАВЕКА. ЗАПАР

Гэта адбылося на лесвічнай пляцоўцы паміж першым і другім паверхамі шматкватэрнага дома ў Гомелі, што па праспекце Касманаўтаў. Малады чалавек, які (гэта выявілася пазней) быў раней судзімы, выцягнуў з кішэні прадмет, падобны на пісталет і адкрыў у перапалоханага хлопца страляніну. Той застаўся жывым, не атрымаўшы сур'ёзнага ранення, бо пісталет быў пнеўматычны. Хуліган будзе пакараны.

Тое ж самае будзе і з 18-гадовымі вадзіцелем КСУПа імя Чапаева Кармянскага раёна і навучэнцам Гомельскага ПТВ-152. Мішэнню для стрэлаў з пнеўматычнага пісталета «МП-654К» яны выбралі вокны хаты жыхаркі гэтай вёскі. Чым бы дзіця ні цешылася?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
объекта долевого строительства

7-этажного 27-квартирного жилого дома **№ 3** (по генплану) объекта: **«Жилые дома №№ 2, 3, 4 (по генплану) в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Комаровское кольцо – Гало. Жилой дом № 2 (по генплану). Жилой дом № 3 (по генплану)».** Общество с ограниченной ответственностью «Студенческий дом» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства.

Информация о застройщике

ЗАСТРОЙЩИК (заказчик) – ООО «Студенческий дом».

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от **07.09.2000 № 1030** в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за **№ 100037170.**

Сертификат соответствия удостоверяет, что система менеджмента качества **управления инвестиционным проектом в строительстве соответствует требованиям СТБ ИСО 9001-2001.**

Зарегистрирован в Реестре национальной системы подтверждения соответствия Республики Беларусь под **№ BY112 05.01.021 0958.**

Специальное разрешение (лицензия) № 02250/0462564 на право осуществление деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений 1 и 2 уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей».

Адрес застройщика: 220040, г. Минск, ул. Восточная, д. 39, помещение 1Н, кабинет № 16, телефон/факс: 292 53 67.

Режим работы: понедельник–пятница с 8:45 до 17:30, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение предыдущих трех лет предприятие построило:

- многоэтажный жилой дом по ул. Восточная, 39;
- многоэтажные жилые дома по ул. Есенина;
- многоэтажный жилой дом по ул. Беды, 29.

Информация о проекте

Цель строительства – исполнение инвестиционного проекта по строительству объекта: **«Жилые дома №№ 2, 3, 4 (по генплану) в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Комаровское кольцо – Гало».**

Договоры долевого строительства будут заключены на строительство 13 квартир в 7-этажном 27-квартирном кирпичном жилом доме № 3 с помещением товарищества собственников (количество двухкомнатных квартир – 7; трехкомнатных квартир – 2; четырехкомнатных квартир – 4).

Стоимость 1 кв.м квартир на 01.10.2008 составляет 3 327 233 белорусских рубля.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридор, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, помещение товарищества собственников, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Застройщиком получены:

- решение Мингорисполкома от 28.06.2007 № 1452;
- решение Мингорисполкома от 09.03.2006 № 384;
- разрешение на производство строительно-монтажных работ Инспекции департамента Госстройнадзора по г. Минску от 16.08.2007 № 2-207Ж-054/07;
- заключение КУП «Белгосэкспертиза по городу Минску» от 13.02.2007 № 1614-8-2006;
- заключение КУП «Белгосэкспертиза по городу Минску» от 15.06.2007 № 0374-8-2007;
- заключение государственной экологической экспертизы Минского городского комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды от 26.04.2007 № 253-2007;
- свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельных участков: № 500/304-2802; № 500/304-2801; № 500/304-2844; № 500/304-2803; № 500/304-2843; № 500/304-2842; № 500/304-2804.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию строящегося дома IV квартал 2008 года.

Генеральным подрядчиком по строительству объекта является ОАО «Беллегпромпроект», договор от 20.05.2008 № 146с/08.

Ознакомление дольщиков с объектом долевого строительства и условиями заключения договоров на строительство производится по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 39, тел. 292 96 56.

УНН 100037170

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

РУП «Белспецконтракт» проводит 12-й открытый аукцион объектов республиканской собственности 21 ноября 2008 г.

Лот	Наименование объекта (местонахождение объекта, общая площадь (кв.м)	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Площадь отчуждаемого участка (га)	Форма проведения торгов
1	2	3	4	5	6
2.	Здание казармы с крыльцами, военный городок № 65, г. Гомель (канализация, кабельная линия, тепловая сеть, водопровод, пристройка). Инв. № 65/1, 1956 г.п., 719 кв. м.	480 000 000	48 000 000	0,5021	Без условий
6.	Здание кафе с подвалом, военный городок № 76а, д. Новая Гожа Гродненского р-на (асфальтобетонное покрытие, бортовой камень). Инв. № 76а/29, 1981 г.п., 638,2 кв. м.	73 000 000	7 300 000	0,0847	Без условий
9.	Здание поликлиники, военный городок № 1 «Крепость» г. Бобруйск. Инв. № 1/39, 1840/1993 г.п., 652 кв. м.	1 406 220 000	140 622 000	0,2368	Без условий
10.	Здание контрольно-технического пункта, в т.ч. мастерские с асфальтовым мощением. Военный городок № 5 «Авиагородок», г. Бобруйск. Инв. № 5/306, 177 кв. м.	83 500 000	8 350 000	0,0386	Без условий
11.	Здание не отапливаемого гаража, в/г № 5 «Авиагородок», г. Бобруйск (асфальтовое мощение). Инв. № 5/305, 1196 кв. м.	160 000 000	16 000 000	0,2692	Без условий
12.	Здания: КПП (инв. № 1), АЗС (инв. № 6), склада ГСМ (инв. № 7), ограждение железобетонное (инв. № 8), асфальтобетонное покрытие (инв. № 9), ограждение деревянное на деревянных столбах (инв. № 10), ограждение деревянное на железобетонных столбах (инв. № 11), место для хранения угля (инв. № 12), кабельные линии электропередач пласт. оболоч. (инв. № 13), наружные сети водопровода стл. (инв. № 14а), наружные сети водопровода чугун. (инв. № 14б), наружные сети связи в грунте (инв. № 15а), наружные сети связи в канализации (инв. № 15б), наружные сети канализ. чугун. (инв. № 18а), наружные сети канализ. керамические (инв. № 18б) в/г № 96 «Чепино» г. Витебск.	102 000 000	10 200 000	2,2441	Без условий

Тип помещений: отдельно стоящие. Здания в аренде не находятся.

Окончательное решение об отводе земли принимается местными органами власти.

Аукцион состоится в 11.00 **21 ноября 2008 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17 часов 19 ноября 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604 предприятия.

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 21 ноября 2008 года.

2. Произвести оплату стоимости объекта в течение 30-ти календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.**

По ранее проведенным торгам извещения публиковались в газете «Звязда» 1 и 20 декабря 2007 года, 6 августа (Лоты № 10, № 11, № 12), по всем указанным Лотам 12 сентября 2008 года, 21 октября 2008 (по лотам № 2, № 3, № 6, № 8, № 9, № 10, № 11, № 12).

Справки по тел. (017) тел./факс 224 88 05.

Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com; e-mail: info@belspeckontrakt.com

Крымінал

УЧАСТАК — ЗА $5 000

У Светлагорску супрацоўнікі падраздзялення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнай злачыннасцю Гомельскага ГУУС і РАУС затрымалі 53-гадовага мясцовага жыхара, які раней быў судзімы за махлярства.

На гэты раз мужчыну падвяло «пад манастыр» зямельнае пытанне, а дакладней — спроба абысці закон у яго вырашэнні. Ён падбухторваў 23-гадовага непрацуючага да дачы хабару ў памеры 5 тысяч долараў: маўляў, тады можна будзе без праблем атрымаць зямельны ўчастак для індывідуальнага будаўніцтва дома. Апошні, дарэчы, уручыў палову ад запатрабаванай сумы свайму «дабрадзею». Аднак калі «здзелка» адбылася, у справу ўмяшаліся праваахоўнікі...

Ігар ГРЫШЫН.

Мужчынскае здароўе

А ВЫ ЗДАЛІ КРОЎ НА ПРАСТАТСПЕЦЫФІЧНЫ АНТЫГЕН?

Анкаўралогія адасобілася ад уралогіі літаральна два дзесяцігоддзі таму і развіваецца сёння надзвычай імкліва. Абумоўлена гэта адным — нарастаннем праблемы, ростам колькасці пухлін нырак, мачавога пухіра, прастаты і яечак.

— Самая рэдкая — дзесьці 120 выпадкаў у год па ўсёй рэспубліцы — і адначасова агрэсіўная ў гэтым спісе — злаякасная пухліна яечак, — расказвае *загадчык аддзялення анкаўралогіі Мінскага клінічнага анкалагічнага дыспансэра, урач-анколаг-хірург вышэйшай катэгорыі Ігар МАСАНСКІ.* — Доўгія гады яна была асноўнай прычынай лятальнасці мужчын ва ўзросце да 35 гадоў. Праўда, у апошні час, дзякуючы прымяненню новай хіміятэрапіі, лячэнне стала значна больш эфектыўным...

Рак ныркі таксама часцей сустракаецца ў мужчын, а ў цэлым сярод насельніцтва фіксуецца да 15 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва з тэндэнцыяй да росту ў апошнія гады, што абумоўлена ў першую чаргу палепшанай дыягностыкай. Лячэбная дапамога пры гэтым раку стала таксама больш адэкватнай, што дазваляе гаварыць пра ўзрост. Не сакрэт, што ва ўзросце пасля 50 гадоў мужчыны пераважаюць гарманальную перабудову. Праўда, у адных працэс адбываецца ў межах нормы, а ў другіх працякае паталагічна, з пэўнымі зменамі метабалізму гармонаў. Лічыцца, што гарманальная перабудова можа аказваць значны ўплыў на ўзмацненне дзялення клетак у прастаце.

Сярод іншых фактараў, якія ўплываюць на развіццё раку прастаты, даследчыкі называюць незбалансаванае харчаванне. Падмечана, што японцы, якія жывуць і харчуюцца ў сябе на радзіме, хварэюць на рак прастаты ў 100 разоў менш, чым тыя, што эмігравалі ў Злучаныя Штаты. Ёсць меркаванне, што адным з метадаў прафілактыкі ў дадзеным выпадку могуць быць фітаэстрагены — рэчывы, якія ўтрымліваюцца ў раслінай ежы, зяленіве, сої. Шырока вядома і пра спрыяльнае ўздзеянне на прастату лікапінаў, на якія багатыя памідоры.

Няма пакуль дакладных навуковых звестак адносна сувязі раку з актыўнасцю сэксуальнага жыцця. Заўважана толькі, што ў амерыканскім штаце Юта, дзе распаўсюджана мнагажэнства, мужчыны часцей пакутуюць ад раку прастаты, хоць дакладная сувязь паміж інтэнсіўнасцю палавога жыцця і з'яўленнем злаякасных клетак не ўстаноўлена.

Іншая справа, сувязь працяглага ўстрымання з развіццём прастатыту — запалення прастаты, якое можа быць абумоўлена не толькі мікробамі, але і... адсутнасцю палавога жыцця. У такім выпадку прастатыт яшчэ называюць застойным.

Як і ў выпадку з адэномай, рак прастаты можа развівацца цалкам паралельна з прастатытам, хоць некаторыя даследчыкі адносяць прастатыт да фонавага анкалагічнага захворвання.

Дарэчы, лячэнне прастатыту — асобная праблема. Аднымі антыбіётыкамі тут не дапаможаш. Хворы павінен перагледзець увесь лад свайго жыцця — ад харчавання, дрэнных звычак да нармальнага сэксуальнага жыцця і жадання быць актыўным у процістаянні праблеме, паколькі давядзецца шмат чаго выконваць: хадзіць на фізіятэрапію, масаж, піць прэпараты для паляпшэння кровазвароту, а па завяршэнні аднаго курса лячэння быць гатовым да другога. Да таго ж, неабходна будзе знайсці паразуменне з боку партнёршы. Усё ж такі чым мацней развілося захворванне, тым больш будзе праблем з рэалізацыяй сэксуальнага жадання.

Самае важнае, што павінен зрабіць сярэдняга ўзросту мужчына, у якога выяўлены прастатыт або адэнома — абследавацца далей, каб не прапусціць злаякаснае ўтварэнне. І ні ў якім разе не займацца самалячэннем!

Сёння ў нашай краіне 50-60 працэнтаў пацыентаў трапляюць у поле зроку спецыялістаў не на пачатковых стадыях раку прастаты. А значыць, у такой колькасці выпадкаў не даводзіцца гаварыць пра эфектыўнасць лячэбнай дапамогі. Дзеля як мага больш ранняга выяўлення раку прастаты ўролагі рэкамендуюць любому мужчыну, які нават не скардзіцца на работу органа, але дасягнуў 50-гадовага ўзросту, праходзіць дыягностыку на прастатычны спецыфічны антыген (ПСА). Менавіта гэты аналіз з высокай доляй верагоднасці дазваляе западозрыць развіццё раку. Тым, у каго з падобнай праблемай сутыкаліся бліжэйшыя сваякі, дыягностыку трэба прайсці пасля 45 гадоў. Раней за вышэйпамянёны ўзрост рак прастаты развіваецца вельмі рэдка. Сярэдні ўзрост такіх анкалагічных пацыентаў — 75 гадоў. Амерыканскія вучоныя сцвярджаюць, што прыкметы злаякасных перараджэнняў прастаты маюць 75-80 працэнтаў 80-гадовых мужчын.

— У Берліне, напрыклад, дзе пражывае 3,4 мільёна жыхароў, дзейнічае 13 уралагічных клінік, якія займаюцца ў тым ліку праблемай раку прастаты, — удакладняе Ігар Леанідавіч. — Захворванне выяўляецца на ранніх стадыях, і таму там выконваецца 1200 прастатэктамій у год, а ў Мінску з 2-мільённым насельніцтвам — толькі 100-120. Гэта таму, што выдаленне прастаты на позніх стадыях не прыносіць вылечвання...

Здаць аналіз на ПСА можна і па ўласным жаданні, тым больш, што ён часцей платны. Па растлумачэнне выніку лепей за ўсё звярнуцца да ўролага ў паліклініцы або ў тым жа Мінскім клінічным анкалагічным дыспансэры — па накіраванні з паліклінікі. Уролаг не толькі правядзе неабходныя дадатковыя даследаванні, але і растлумачыць іх вынікі. Справа ў тым, што павышэнне ПСА можа назірацца на фоне прастатыту, адэномы і нават нейкіх маніпуляцый, праведзеных на прастаце. Калі гэтыя фактары выключаны, павышаны ўзровень ПСА будзе паказаннем для пункцыйнай біяпсіі пад ультрагукавым даследаваннем — амбулаторнай працэдуры, падчас якой выконваецца не менш як восем праколаў. Аднаго толькі ўльтрагукавога даследавання не дастаткова для дыягностыкі, таму што кожная чацвёртая пухліна невялікага памеру не «праглядаецца» на ім. Канчатковы дыягназ робіцца толькі па выніках біяпсіі.

Як адзначае доктар Масанскі, лячэнне залежыць не толькі ад стадыі захворвання, але і ад узросту пацыента. Напрыклад, калі яму 80 гадоў, і праблема выяўлена на ранняй стадыі, а паказчык ПСА не надта высокі, то рак можна проста назіраць у такіх спецыялістаў, як анколаг ці ўролаг. У шэрагу выпадкаў у сталым узросце хваробе паводзіць сябе неагрэсіўна і можа развівацца вельмі працяглы. Лячэнне ж можа пагоршыць якасць жыцця і не працягнуць яго пры гэтым.

Па асабістых паказаннях шэрагу пацыентаў падыходзіць прамянёвая тэрапія, якая можа даваць добрыя вынікі лячэння. 50-70-гадовым пацыентам, а часам і старэйшым з добрым здароўем і на ранніх стадыях можна рабіць уласна прастатэктамію. Гэта можа быць як паласная аперацыя, так і эндаскапічная, хоць апошняя ў нас прымяняецца досыць рэдка. Хіміятэрапія прымяняецца звычайна пасля правядзення гарманальнай тэрапіі.

Эфектыўнасць лячэння раку прастаты, працягласць жыцця пасля лячэння напрамую залежаць ад стадыі, на якой выяўлена захворванне, нагадвае Ігар Масанскі. Таму не забывайце, шаноўныя мужчыны «залатога» ўзросту, раз на год наведваць уролага і выяўляць узровень прастатспецыфічнага антыгену.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Школьнікі Давыд-Гарадка.

Інфарм-укол

Дзясятак парад для «залатых» мужчын

Першую суботу лістапада з нядаўніх часоў лічаць Сусветным днём мужчын. Што ж, яно і правільна. Жанчынам — легкадумная вясна, мужчынам — пладаносная восень. І не проста восень, а лістапад, калі ўсе плады сабраныя (моцнымі мужчынскімі рукамі), і наспеў час падумаць пра трывіяльнае — аб сабе. Давайце падумаем разам. І падумаем над тым перыядам у жыцці мужчыны, калі ён проста вымушаны даведацца, дзе знаходзіцца паліклініка і патраціцца... не, не на піва.

Мужчынскую менапаўзу называюць яшчэ андрапаўзай. Яе сімптомы могуць праяўляцца мышачнай слабасцю, дэпрэсіўным настроем, прыбаўкай у вазе і нават так званымі «прылівамі» — раптоўным павышэннем тэмпературы цела. Усе гэтыя непрыемнасці тлумачацца падзеннем узроўню тэстастэрону, што ў некаторай колькасці мужчын мае клінічныя праяўленні. Справіцца з сітуацыяй дапамагае ўролаг або андролаг, які прызначае спецыяльнае гарманальнае лячэнне.

Спецыялісты рэкамендуюць усім мужчынам пільна сачыць за сваім здароўем і своечасова абследавацца. Шэраг даследаванняў звязваюць нізкі ўзровень тэстастэрону з атлусцяннем і дыябетам.

Нягледзячы на тое, што мужчыны значна меней схільныя да наведванняў урачоў, яны часцей курацца і пакутуюць ад алкагольнай і наркатычнай залежнасці, мала цікавяцца самім паняццем «здаровы лад жыцця», паспрабуем усё ж такі яшчэ раз заклікаць іх да якаснага і працяглага жыцця.

1. Піце дастатковую колькасць вады. Смага сведчыць аб крызісе, які наступіў у арганізме.

2. Знайдзіце тысячу прычын, каб адмовіцца ад ужывання алкаголю ў бліжэйшы раз. Не злоўжывайце «жаночым» напоем — півам, аддавайце перавагу келіху сухога белага або чырвонага віна.

3. Кіньце курыць ужо сёння.

4. Не галадайце і не пераядайце. Калі вы не спартсмен, не будаўнік і ваша работа не звязана з велізарнымі фізічнымі нагрузкамі, скарачайце ўжыванне бачных тлушчаў — сала, сметанковага масла, каўбас. Штораз, калі ясце мяса ці рыбу, кладзіце на талерку як мага болей зяленіва, а таксама памідоры, капусту і буракі. Ешце ўсе віды каш, якія гатуе ваша жонка для сябе. Дарэчы, пра жонку.

5. Калі хочаце пражыць як мага даўжэй, развівайцеся з адзінотай — будзьце ў пары, нават калі папярэднія шэсць шлюбаў былі шчаслівымі, і вы прытаміліся ад такой колькасці шчасця.

6. Прымушайце сябе наведваць паліклініку, праходзіць пэўнае абследаванне і вытрымліваць рэкамендацыі ўрача. Паверце, аднойчы ўсё роўна давядзецца звярнуцца да медыкаў, але на той момант вы можаце вельмі і вельмі шкадаваць, што не зрабілі гэтага некалькі месяцаў таму.

7. Не забывайцеся на рэгулярную фізічную нагрузку. Гуляйце з дзецьмі, ездзьце на велатрэнажоры, будуйце дачу, наведвайце басейн... Рабіце што-небудзь, каб траціць з'едзенае.

8. Знайдзіце спосаб (акрамя злоўжывання алкагольнымі напоямі) пазбягаць псіхалагічнага напружання. Будзьце мужнымі і адказнымі, але не дазваляйце сям'і прымушаць вас адчуваць віну за «неідэальныя» ўмовы жыцця. Ідэальных ніколі не будзе.

9. Сачыце за гігіенай — ад утрымання цела да таго, што вы паглынаеце. Не карыстайцеся чужымі кубкамі, не піце ні з кім з адной бутэлькі і г.д.

10. Майце на ўвазе, што сэксуальныя расстройствы часам сігналізуюць аб наяўнасці вельмі сур'ёзных захворванняў. Беражыце сваё сэксуальнае здароўе, пачынаючы з дасканалага адбору партнёрак і заканчваючы абследаваннем у тэрапеўта і венеролага.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПЛАТНЫЯ ПАСЛУГІ — «РУХАВІК» ДЛЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ СТАМАТАЛОГІІ

Ці можа дзяржаўная стаматалогія заставацца адначасова і даступнай для насельніцтва, і якаснай, і пры гэтым не адставаць ад сучасных тэхналогій? Гэтае пытанне нельга назваць рытарычным, таму што працуючы на састарэлым абсталяванні з выкарыстаннем маральна састарэлых матэрыялаў дасягнуць добрага выніку наўрад ці магчыма. Між іншым, штогод у Беларусі фіксуецца да 15 мільёнаў наведванняў стаматолагаў у год, а гэта значыць, што стаматалагічная дапамога самая запатрабаваная і самая масавая ў сістэме аховы здароўя.

— Пашырэнне ў дзяржаўных медыцынскіх установах платных стаматалагічных паслуг дазволіла нам апошнім часам істотна абнавіць парк стаматалагічнага абсталявання, — паведаміў на IV спецыялізаваным форуме «Стаматалогія Беларусі» **галоўны пазаштатны стаматолаг Міністэрства аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук, прафесар Сямён НАВУМОВІЧ.** — За апошнія чатыры гады мы выканалі план па закупках абсталявання на 290 працэнтаў і змаглі набыць 790 новых стаматалагічных установак. Да таго ж у праекце Праграмы развіцця першаснай медыка-санітарнай дапамогі ў раздзеле «Стаматалогія» прадугледжваецца таксама цэнтралізаваная закупка для нашай службы яшчэ 270 новых стаматалагічных установак, але ўжо за кошт бюджэтных сродкаў.

Зразумела, што павелічэнне ў дзяржаўным сектары аб'ёмаў аказання платных стаматалагічных паслуг звыш гарантаванага аб'ёму бясплатнай стаматалагічнай дапамогі змяншае залежнасць нашай службы і ад рэспубліканскага, і ад мясцовага бюджэтаў, і фарміруе канкурэнтаздольнае асяроддзе на рынку аказання платных стаматалагічных паслуг. У агульным аб'ёме платных медыцынскіх паслуг, што аказваюцца ў дзяржаўным сектары, на долю стаматалогіі прыпадае зараз 48-50 працэнтаў. Кожны год мы павялічваем свой «уклад» прыкладна на 1 працэнт.

Напрыканцы верасня Міністэрствам аховы здароўя быў зацверджаны новы прэйскурант на стаматалагічныя паслугі для дзяржаўных арганізацый: цэны былі павышаны прыкладна на 8-10 працэнтаў, на артапедычныя паслугі — на 19,5 працэнта. Гэта вымушаная мера, і ўсё ж такі цэны, устаноўленыя цяпер у дзяржаўных арганізацыях, ніжэйшыя, чым у прыватным сектары, і ў большай ступені адпавядаюць узроўню даходаў пераважнай часткі нашага насельніцтва.

Налета для Рэспубліканскай стаматалагічнай паліклінікі плануецца закупіць дэнтальны камп'ютарны тамограф. Увогуле на рэспубліканскім і абласным узроўнях справы з укараненнем перадавых тэхналогій куды больш аптымістычныя. Але нароўні канкураваць па сваёй тэхнічнай аснашчанасці і прымяняемых тэхналогіях з прыватнымі стаматалагічнымі цэнтрамі і фірмамі могуць пакуль што не ўсе дзяржаўныя стаматалагічныя арганізацыі.

— Мы павінны паўсюдна ўкараняць новыя бяспечныя дыягнастычныя метады, — падкрэсліў Сямён Навумовіч. — Нам даўно ўжо трэба адмаўляцца ад прыцэльных дэнтальных здымкаў і не нагружаць нашых пацыентаў дадатковай і зусім непатрэбнай ім рэнтгеналагічнай нагрузкай. Я маю на ўвазе панарамную тамаграфію, радыёвізіяграфію, тэлерэнтгенаграфію, камп'ютарную і магнітна-рэзанансную тамаграфію. Трэба больш актыўна ўкараняць лазерныя тэхналогіі, метады імплантацыі і г.д. У Мінску і абласных цэнтрах выкарыстанне сучасных канструкцый у артапедыі мы ўжо давялі да 50 працэнтаў, у Рэспубліканскай стаматалагічнай паліклініцы па выніках мінулага года выйшлі на 69 працэнтаў. Аднак нашы пацыенты яшчэ не заўсёды гатовыя аплаціць нават цэльналітое пратэзаванне. Дастаткова сказаць, што каля 80 працэнтаў людзей, якія раней мелі льготы на зубапратэзаванне, у пачатку гэтага года пазбавіліся сваіх ільгот. А льготнікі былі фактычна нашым дзяржзаказам. З 2003 па 2007 год дзяржава выдаткоўвала на зубапратэзаванне льготнай катэгорыі пацыентаў ад 2 да 11 мільёнаў долараў у год.

Цяпер 65,7 працэнта пломбаў у дзяржаўным сектары мы выраблям з сучасных матэрыялаў. Гэта вельмі добры паказчык. Але ці вытрымае такія выдаткі бюджэт? Між іншым, наша прапанова ўвесці дзяржаўныя мінімальныя сацыяльныя стандарты ў галіне стаматалагічных паслуг, каб вызначыць дакладна, якія віды стаматалагічнай дапамогі могуць аказвацца пацыентам бясплатна, а якія — толькі на платнай аснове, пакуль не знайшла падтрымкі ва Урадзе.

На думку Сямёна Навумовіча, у дзяржаўных арганізацыях раённага ўзроўню неабходна арганізоўваць кабінеты або рабочыя месцы для ўрачоў-стаматолагаў агульнай практыкі. Такія спецыялісты на раённым узроўні вельмі неабходныя, але пакуль што для іх эфектыўнай работы не створана ні матэрыяльная, ні нарматыўная база.

Галоўны пазаштатны стаматолаг Міністэрства аховы здароўя звярнуў увагу таксама на неабходнасць больш жорсткага кантролю за дзейнасцю прыватных стаматалагічных структур. Апошняя праверка 59 суб'ектаў паказала, што заўвагі па выкананні ліцэнзійных патрабаванняў і правядзенні лячэбна-дыягнастычных мерапрыемстваў былі прыкладна ў 80 працэнтах праверяных арганізацый.

— Я лічу, што трэба ўводзіць кваліфікацыйны экзамен пры атрыманні ліцэнзіі на аказанне стаматалагічнай дапамогі ў медыцынскіх структурах недзяржаўнай формы ўласнасці, — агучыў сваю пазіцыю Сямён Навумовіч. — Мяркую, што з цягам часу мы ўсе будзем здаваць такі экзамен, незалежна ад формы ўласнасці арганізацый, у якіх мы працуем, а ад катэгорый калі-небудзь адмовімся.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Доктар адкажа

На «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць дзяжурыць:

11 лістапада — галоўны ўрач 20-й мінскай гарадской паліклінікі Андрэй Вітальевіч ЗЕЛЯНКО.

12 лістапада — галоўны ўрач 17-й мінскай гарадской паліклінікі Сяргей Барысавіч САРОКІН.

13 лістапада — галоўны ўрач 1-й мінскай гарадской клінічнай бальніцы Мікалай Сяргеевіч СЕРДЗЮЧЭНКА.

14 лістапада — галоўны ўрач 8-й мінскай дзіцячай паліклінікі Расціслаў Міхайлавіч ФІЛАНОВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь извещает о проведении открытого аукциона по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций открытого акционерного общества «Инженерно-технический центр».

Аукцион состоится **23 декабря 2008 г.** в 10.00 по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Продавец – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Для участия в аукционе в срок до 16.00 2 декабря 2008 г. по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный,12, каб. 401 предоставляются следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенная копия выданной Министерством финансов Республики Беларусь лицензии на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности на рынке ценных бумаг (профессиональными участниками рынка ценных бумаг);

представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенная доверенность;

юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не более чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

представителями физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность;

представителями юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность или иные легализованные в установленном порядке документы, подтверждающие полномочия представителя;

документ, подтверждающий согласие антимонопольного органа на совершение сделки, в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц представляют копию паспорта или иного документа, удостоверяющего личность, и предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для заверения его копии лицом, принимающим документы.

Не допускается одновременное участие в аукционе заинтересованных лиц: физических лиц, состоящих в родственных отношениях или браке; юридических лиц, участниками которых выступают одни и те же физические и (или) юридические лица; юридических лиц, в уставном фонде которых одно и то же юридическое или физическое лицо имеет долю в размере двадцати и более процентов; юридических лиц, одно из которых в соответствии с законодательством признается дочерним или зависимым по отношению к другому.

Для участия в аукционе уплачивается задаток в сумме 11 620 900 (одиннадцать миллионов шестьсот двадцать тысяч девятьсот) белорусских рублей на счет № 3642974000028 в филиале № 529 «Белсвязь» АСБ «Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Задаток уплачивается в срок до 17 декабря 2008 г. согласно договору о задатке, заключаемому с Фондом государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь при регистрации заявления на участие в аукционе.

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее за пакет акций (лот) наиболее высокую цену.

Договор купли-продажи акций заключается с участником аукциона, выигравшим торги, в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Участники аукциона оплачивают фактические затраты на подготовку и проведение аукциона согласно выписанному каждому счету-фактуре в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Участник аукциона, выигравший торги, дополнительно оплачивает затраты на проведение рыночной оценки акций согласно счету-фактуре в течение 3 рабочих дней со дня его получения.

Получить более подробную информацию об ОАО «Инженерно-технический центр», ознакомиться с проспектом эмиссии и годовой бухгалтерской отчетностью акционерного общества по состоянию на 1 января 2008 г., проектом договора купли-продажи акций можно по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 401.

Контактные телефоны:

Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь

(017) 284 89 36, 284 85 62.

Департамент ценовой политики Министерства экономики (017) 200 68 45, 222 67 17, 222 67 72.

Полное и сокращенное наименование открытого акционерного общества, его адрес	Уставный фонд, шт. акций	Номинальная стоимость акции, рублей	Доля государства в уставном фонде		Предлагается для реализации		Начальная цена		Лот № 1		Информация о владельцах крупных пакетов акций
			кол-во акций, шт.	в % к УФ	кол-во акций, шт.	в % к УФ	акции, рублей	пакета акций, рублей	количество акций в лоте, штук	начальная цена лота, рублей	
Открытое акционерное общество «Инженерно-технический центр» (ОАО «Инженерно-технический центр»), Минская обл., г. Молодечно, ул. Машерова, 10	1069	18 482	535	50,05	535	50,05	217 213	116 208 955	535	116 208 955	Два физических лица (7,48 % УФ; 5,33 % УФ)

«ПАРАШКОВЫЯ» ПРАБЛЕМЫ

Штодзень мы карыстаемся сродкамі для мыцця посуду, пральнымі парашкамі, пастамі і гелямі для чысткі кафлі і сантэхнікі. Пры гэтым вельмі рэдка задумваемся над тым, што кожны раз падвяргаем скуру рук сур'ёзнаму выпрабаванню, у выніку якога яна становіцца шурпатай, абязводжваецца, на ёй з'яўляюцца маршчынкі і нават трэшчынкі.

У ЧЫМ ПРЫЧЫНА?

Прыродная асаблівасць будовы скуры рук такая, што яна сама сябе абараніць не можа. На тыльнай паверхні рук змешчана вельмі мала сальных залозаў, а на далонях іх увогуле няма. Да таго ж эпідэрміс гэтай зоны ўтрымлівае вады ў 4—5 разоў менш, чым скура твару.

ШТО ПАГРАЖАЕ АМАТАРАМ ЧЫСЦІНІ?

Алергічны кантактны дэрматыт (чырвоныя плямы, трэшчынкі, прышчыкі на скуры рук) — гэтыя сімптомы знаёмыя многім хатнім гаспадыням і прафесійным прыбіральшчыцам. Часцей за ўсё іх прычына — алергічная рэакцыя на сродкі бытавой хіміі.

Часам на скуры з'яўляюцца **пухіркі**, з якіх выдзяляецца празрыстая вадкасць. Знешне гэта нагадвае экзэму, аднак вінаваты тут таксама звычайны пральны парашок.

Задзірыны: кутыкула, тонкая палоска далікатнай адчувальнай скуры вакол пазногця, нярэдка запаляецца і ацякае ў тых, хто мые адзенне або посуд уручную, без выкарыстання якіх-небудзь ахоўных сродкаў.

Пазногці, якія расслойваюцца, — праблема жанчын, якія пастаянна «палошчуць» рукі ў вадзе з дабаўленнем няякаснага гаспадарчага мыла або сродку для мыцця посуду.

Трэшчыны на кончыках пальцаў: «хімія» сушыць скуру, якая пачынае лушчыцца, а затым і трэскацца.

ЯК АБАРАНІЦЬ РУКІ?

Аказваецца, дэрматолагамі распрацаваныя спецыяльныя рэкамендацыі для аховы скуры ад негатыўнага ўплыву сродкаў бытавой хіміі. Паспрабуйце прытрымлівацца гэтых простых парад, і вашы рукі заўсёды будуць мяккімі і аксамітнымі.

● Па-першае, пры ўзнікненні любога раздражнення скуры пастарайцеся звесці да мінімуму кантакт рук з пральнымі парашкамі, мыйнымі сродкамі і няякасным мылам. У выпадку моцнага запалення абавязкова звярніцеся да ўрача.

● Пры выбары мыйных сродкаў варта аддаваць перавагу прэпаратам з дабаўкамі, якія ахоўваюць скуру рук. Гэта можа быць алоэ, гліцэрына, рамонак, хвоя і інш. (Звычайна фірмы-вытворцы асабліва падкрэсліваюць іх утрыманне.)

● Калі вы схільныя да алергічных рэакцый, адмоўцеся ад прымянення сінтэтычных губак, а замяніце іх губкамі з прыродных матэрыялаў. Сурвэткі таксама павінны быць з натуральных тканін — бавоўны ці фланэлі.

● Кожны раз, калі вы мыеце посуд або чысціце кафлю, адзявайце гумавыя пальчаткі.

● Калі вам не падабаецца спраўляцца з хатнімі справамі ў гумавых пальчатках, паспрабуйце скарыстаць зручную вынаходку — крэм-«пальчатку» (ахоўны крэм). Ён утварае на паверхні скуры тоненькую, але вельмі стойкую плёнку, якая засцеражэ скуру ад уздзеяння хімічных рэчываў. Наносьце такі крэм кожны раз перад мыццём посуду або бялізны.

● Пасля прымянення «хіміі» старанна мыйце рукі з мяккім мылам і выцірайце іх насуха.

● Калі пасля кантакту са сродкамі бытавой хіміі ў вас запаліласа кутыкула, паспрабуйце змазваць яе абясколераным растворам ёду, які акажа бактэрыцыдны і загойвальны эфект.

● Каб папярэдзіць або пазбавіцца ад трэшчын на кончыках пальцаў, на працягу дня (калі з'яўляецца магчымасць) уцірайце ў іх крыху тлустага пажыўнага крэму для рук або нейтральнай гігіенічнай губной памады.

● Раніцай наносьце на скуру ўвільгатняльны крэм для рук, абнаўляючы слой на працягу ўсяго дня. Абавязкова змазвайце рукі крэмам пасля любога кантакту з вадой.

● Калі скура на руках стала сухой і патрэскалася, перад сном нанясіце на яе шчыльны слой пажыўнага крэму і надзеньце на ноч тканыя (махровыя або баваўняныя) пальчаткі. Раніцай вашы рукі зноў будуць мяккімі і далікатнымі.

● Ну і, вядома ж, найлепшы варыянт аховы скуры — выкарыстанне пральных і пасудамыйных машын.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Ачышчальная ванначка

На 1 л цёплай вады вазьміце 1 ч. лыжку пітной соды, 1 ст. лыжку вадкага мыла, 1 ст. лыжку гліцэрыны, 1/2 ч. лыжкі нашатырнага спірту. Трымайце рукі ў гэтым растворы 10 хвілін. Затым насуха вытрыце і змажце тлустым крэмам.

Травяны крэм

Прыгатуйце настой з рамонку, календулы, трыпутніку, ваўчкоў: 1 ст. лыжку сумесі заліце шклянкай кіпеню. Пакіньце яго пад накрыўкай на паўгадзіны. Працадзіце. 50 г сметанковага масла разатрыце з 1 ч. лыжкай мёду, дадайце 1 ч. лыжку травянога настою і ўсё старанна перамяшайце. Крэм эфектыўны пры трэшчынах і раздражненні скуры.

Мазь з ільняным алеем

Вазьміце сок лімона, ільняны алей, жаўток і мёд, усе інгрэдыенты змяшайце і змазвайце скуру рук, каб зменшыць лушчэнне і сухасць.

Маска з кабачка

Невялікі кабачок (пажадана не вельмі спелы, з тонкай лупінай) надзярыце на тарцы. Змяшайце кабачковую кашку з 2 ч. лыжкамі здробненых аўсяных шматкоў. Дадайце 1 ст. лыжку свежага малака і 2 ст. лыжкі смятаны. Усё добра разатрыце. Нанясіце маску на рукі і пакіньце на 20—25 хвілін, змыйце халоднай вадой.

Кампетэнтна пра набалелае

«ТАВАРЫШЫ АЛКАГОЛІКІ, ДАРМАЕДЫ...»

На выхадныя да мяне прыехаў знаёмы з вёскі. Спыніўшыся на святлафоры, праз шкло аўтамабіля прыкмеціў мужчыну гадоў 45, які ледзь стаяў на нагах, моцна абхапіўшы адной рукой слуп ля абочыны дарогі. «Што, і ў сталіцы алкаголікі ёсць?..» — здзівіўся нячасты мінскі госць.

Паводле слоў **урача-нарколага Гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансэра Юрыя КУДРАЎЦАВА**, у Мінску на ўліку стаіць каля 50 тысяч алкаголікаў. І гэта толькі адна дзясятая частка ад усіх хворых.

— На якім этапе хваробы трэба звяртацца па дапамогу да нарколага?

— Чым раней, тым больш шанцаў на станоўчы вынік. Калі чалавек толькі пачынае злоўжываць спіртнымі напоямі, сям'і ўжо трэба задумацца, да чаго гэта можа прывесці. Бо спачатку, як правіла, «сто грамаў» бывае толькі па святах. А пасля... І заўважыць не паспее, як трапляе ў залежнасць ад алкаголю. Дарэчы, алкаголь з'яўляецца адным з прадстаўнікоў групы псіхаактыўных рэчываў (сюды адносяцца таксама наркотыкі, таксічныя лятучыя рэчывы, тытунь), якія выклікаюць хранічнае псіхічнае захворванне. У першую чаргу пакутуе галаўны мозг, а пасля ўжо і ўсе астатнія органы. У людзей, залежных ад алкаголю, прынамсі, разбураецца печань, што прыводзіць да яе цырозу, які не паддаецца лячэнню. Праўда, цяпер у нашай краіне пачалі аперыраваць гэты орган. Але на такую дапамогу не ўсе алкаголікі могуць разлічваць, бо аперацыя па замене печані каштуе нямала. І наўрад ці чалавек, які злоўжывае алкаголем або яго родныя змогуць аплаціць яе.

— Які спіртны напой самы бяспечны?

— Любы спіртны напой, які ўтрымлівае спірт, рана ці позна прыводзіць да залежнасці. І памылковым з'яўляецца меркаванне, што слабаалкагольныя напоі менш шкодныя. Напрыклад, у Англіі людзі не співаюцца ад прыёму віскі, бо яно дорага каштуе і не кожнаму па кішэні. А п'юць эль, які якраз і прыводзіць да алкагалізму. У нас таксама сапраўдныя алкаголікі п'юць не гарэлку і тым больш не каньяк ці джын, а ўжываюць «чарніла, «барматуху», піва. Якія, у сваю чаргу, значна хутчэй чым моцныя алкагольныя напоі, прыводзяць да алкагольнай залежнасці і да разбурэння цэнтральнай нервовай сістэмы і ўнутраных органаў. У піве, напрыклад, утрымліваецца прадукт, які пры перапрацоўцы ў печані ператвараецца ў кадаверын — разнавіднасць трупнага яду. Гэта прыводзіць да больш хуткага цырозу печані. А ён, у сваю чаргу, да смерці.

— Ведаю чалавека, які штовечар выпівае бутэльку піва, пры гэтым ходзіць на працу і не п'е моцных напояў...

— Гэта ўсё вельмі індывідуальна. Але з цягам часу, у большасці выпадкаў, такія людзі, як правіла, ад піва пераходзяць да больш моцных напояў ці павялічваюць колькасць выпітага піва. Вось у нас на ўліку стаіць маладая дзяўчына. Пачынала яна, як і ўсе, з паўлітра. Маці яе прывяла да нас, калі яна пабіла ўсемагчымыя рэкорды. Студэнтка за вечар выпівала 10 паўтарачак — 15 літраў хмельнага напою.

— Калі пераняць вопыт Швецыі і пачаць прадаваць усе спіртныя напоі ў спецыяльна адведзеных месцах па дарагім кошце, то гэта вырашыць праблему алкагалізму?

— Думаю, не. З менталітэтам змагацца складана. А забаронены плод — салодкі. Наш народ вынаходлівы, што-небудзь прыдумаюць. Будуць піць шклоачышчальнік — гэта ж тэхнічны спірт. Пяройдуць на самагон. Але тут ёсць таксама рызыка. Сёння ў нас праходзіў медагляд вадзіцель. Ён толькі што вярнуўся з гасцей з Краснадарскага краю. Яго маці скардзіцца, што нядобрасумленныя самагоншчыкі, якія жывуць у суседняй вёсцы, гоняць самагон і дадаюць у яго наркотык — каноплі, якіх там шмат расце. Такім чынам, выклікаючы залежнасць не толькі ад алкаголю, але і больш моцную — ад наркотыка, прыручаюць да сябе кліентуру.

— Мала хто хоча звяртацца да нарколага. «Я не алкаголік. Я не хворы. Чаму я пайду ў бальніцу?»

— Алкагалізм, паўтараю, гэта хранічнае псіхічнае захворванне, ад якога пакутуе галаўны мозг. А калі пакутуе галаўны мозг, самакрытыка ў чалавека парушаецца. Ён не можа ацаніць сваіх магчымасцяў. Паказваем на малюнку, якім ён можа стаць. «Ды не, што вы?.. Да такога стану я не дакачуся». Мы яму гаворым: давайце падшыем ці закадзіруем. А ён: «Я сам спынюся». Ніколі сам не спыняецца. Пасля прыходзіць ці ў горшым выпадку жонка прыводзіць пад рукі, бо ў яго ўжо ногі перастаюць дзейнічаць.

Адзін наш пацыент дапіўся да таго, што калі яго медсястра пакінула на хвілінку ў кабінеце, ён украў 35 тысяч, пайшоў і зноў напіўся. А перад гэтым таксама казаў, што ён сам справіцца. Вось што значыць адсутнасць самакрытыкі ў чалавека.

У такім стане моцнае ўздзеянне на чалавека аказваюць псеўдаарытэты з сінім носам. Калі ты не п'еш, то цябе лічаць непаўнацэнным чалавекам, над табой пасмейваюцца. У такой кампаніі трэба быць, як усе, тады цябе будуць любіць, а калі ты скоцішся ніжэй, нікому ты, акрамя маці і жонкі, і то не заўсёды, не будзеш патрэбны.

— А ці можна прымусіць алкаголіка лячыцца?

— У адпаведнасці з законам у нас дазваляецца толькі добраахвотнае лячэнне. Я лічу, што гэта няправільна. Бо чалавек кажа: я не пакутую. Правільна, ён радуецца жыццю, а пакутуюць навакольныя, у першую чаргу сям'я, дзеці.

Добры варыянт так званага прымусовага лячэння дзейнічае толькі ў выглядзе лячэбна-працоўных прафілакторыяў. Там п'яніцы знаходзяцца ў закрытай зоне, працуюць і ім не даюць піць. Паўгода без алкаголю прыводзяць да таго, што чалавек кідае піць.

— Які самы эфектыўны спосаб лячэння?

— Комплексны. Гэта медыкаментознае і псіхатэрапеўтычнае ўздзеянне, і псіхалагічная дапамога. Толькі медыкаментамі дабіцца выніку немагчыма. І лячыць трэба не толькі самога алкаголіка, але і яго акружэнне (аказваць псіхалагічную дапамогу). Маці і жонка трапляюць у сузалежнасць ад алкаголіка: спрабуюць яго абмежаваць не толькі ад сабутэльнікаў, але што нярэдка бывае, і ад урачоў-нарколагаў таксама.

Але трэба мець на ўвазе, што цяпер псіхатэрапеўтычным уздзеяннем — кадзіроўкай — займаюцца не толькі высокакваліфікаваныя медыцынскія работнікі, але і людзі далёкія ад медыцыны, якія імкнуцца зарабіць грошы на горы людзей. Раней, напрыклад (даведаліся ад пацыента), на Кульман кадзіраваў слесар-сантэхнік з вялікім гаечным разводным ключом.

— Што вы можаце сказаць аб жаночым алкагалізме ў нашай краіне? Кажуць, што жаночы алкагалізм невылечны.

— Дык і мужчынскі таксама. Гэта хранічнае псіхічнае невылечнае захворванне, як і ўсе хранічныя хваробы. Зараз у горадзе працуе, не лічачы Навінак, сем наркалагічных аддзяленняў. У тым ліку адно жаночае на 20 ложкаў, і яно заўсёды забітае. Не хапае месцаў, каб размясціць усіх ахвотных жанчын.

Уладзімір САЦЮК, начальнік міліцыі грамадскай бяспекі РУУС адміністрацыі Савецкага раёна горада Мінска.

— Якія санкцыі прымяняюцца органамі аховы парадку ў дачыненні да нецвярозых вадзіцеляў?

— У першую чаргу, яны нясуць адміністрацыйную адказнасць з абавязковым пазбаўленнем вадзіцельскіх правоў. Паўторнае ж знаходжанне за рулём у нецвярозым стане цягне за сабой крымінальную адказнасць і штраф, які можа дасягаць 1000 базавых велічынь. Суд рэкамендуе накладаць максімальны штраф, які быў бы супастаўляльным з коштам аўтамабіля злачынцы. Я думаю, што калі каб заплаціць штраф, чалавеку трэба будзе прадаць машыну, то наступны раз ён задумаецца: садзіцца за руль у п'яным выглядзе ці не.

У асноўным затрымліваюцца такія злачынцы ў вячэрні і начны час. У Савецкім раёне штоночы працуюць два нарады міліцыі па выяўленні асобаў, якія знаходзяцца за рулём у нецвярозым стане. Наша асноўная задача — не толькі выявіць парушальніка, але і забяспечыць непазбежнасць пакарання. Толькі сёлета было ўзбуджана 26 крымінальных спраў на тых вадзіцеляў, якія не сталі на шлях выпраўлення, а зноў напіліся і селі за руль без права кіраваць транспартным сродкам.

— А як змагаецеся з п'янымі пешаходамі на дарозе?

— Перыядычна праводзім комплексныя мерапрыемствы па барацьбе з парушэннямі правілаў дарожнага руху пешаходамі, у тым ліку тымі, якія знаходзяцца «падшафэ». Нашы супрацоўнікі стаяць на праблемных пешаходных пераходах, прыцягваюць злосных парушальнікаў да адказнасці. Акрамя таго, штодзень нарады супрацоўнікаў міліцыі дастаўляюць у медвыцвярэзнік ці РУУС, у залежнасці ад ступені ап'янення, ад 15 да 20 чалавек. Такім чынам, ідзе барацьба не толькі з п'янымі пешаходамі, але і паралельна прафілактыка іншых відаў злачынстваў. Бо калі п'яны чалавек знаходзіцца на вуліцы, ён з'яўляецца патэнцыяльнай ахвярай злачынства (у яго што-небудзь могуць скрасці) ці патэнцыяльным злачынцам (можа, нічога не ўсведамляючы, з кім-небудзь пабіцца, пахуліганіць, стаць віноўнікам дарожна-транспартнага здарэння).

— Наколькі дзейснай з'яўляецца такая мера прымусовага ўздзеяння, як лячэбна-працоўныя прафілакторыі (ЛПП)?

— На мой погляд, гэта самы эфектыўны сродак прыструніць п'яніцу. Бо ў прафілакторый мы адпраўляем не таго, хто спакойна п'ецца віно перад тэлевізарам, а алкаголіка, які стаіць на ўліку ў наркалагічным дыспансэры і сістэматычна парушае грамадскі парадак ці правы іншых грамадзян. На такога парушальніка рыхтуецца хадайніцтва ў суд, які і выносіць рашэнне аб ізаляцыі такога чалавека ў ЛПП. Магчыма, ён вернецца і будзе працягваць піць. Тым не менш на год-паўтара, пакуль ён знаходзіцца там, сям'я адпачывае ад п'яніцы. Бо не сакрэт, што алкаголь — гэта праблема не самога выпівохі: ён выпіў і яму добра. Гэта праблема ў першую чаргу сям'і, пакутуюць навакольныя: суседзі і проста незнаёмыя людзі на вуліцы. Але ёсць і такія факты, калі нават хранічны алкаголік вяртаецца адтуль зусім іншым чалавекам. Уладкоўваецца на працу, нармальна жыве. Сёлета каля 40 чалавек (у тым ліку 7 жанчын) мы адправілі ў ЛПП. Работа працягваецца, ёсць яшчэ каго адпраўляць. Асабліва ў мікрараёне Зялёны Луг.

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

На слыху

«Расплаціўся» 50 мільёнамі

Кошт залатых вырабаў, якія былі канфіскаваныя ў індывідуальнага прадпрымальніка з Лагойска за парушэнне правілаў аб здзелках з каштоўнымі металамі і камянямі, склаў больш за 50 мільёнаў рублёў.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» оперупаўнаважаны па асабліва важных справах галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнай злачыннасцю МУС Вераніка Пасмещцева, затрымалі гандляра з больш як паўкілаграмам залатых ювелірных вырабаў супрацоўнікі віцебскай міліцыі. 116 вырабаў з каштоўнага металу, што страціў жыхар Лагойска, не мелі прабірнага кляйма. Як высветлілася, свой тавар «бізнэсмен» набываў у Расіі: за 1 грам золата ён плаціў 20 долараў ЗША. А вось рэалізоўваў залатыя вырабы ў Віцебскай вобласці пастаянным пакупнікам у два разы даражэй.

За студзень-жнівень праваахоўнікамі за парушэнне правілаў аб здзелках з каштоўнымі металамі і камянямі ўзбуджана 209 крымінальных спраў і канфіскавана ў парушальнікаў 10 кілаграмаў золата, 16 — серабра, амаль 60 грамаў — тэхнічнай плаціны і каля 950 прыродных камянёў.

Ігар ГРЫШЫН.

«Пажартаваў»

Гаворка пойдзе пра 27-гадовага жыхара Жлобіна, які нідзе не працаваў, бо лічыў, што ад работы і коні здыхаюць. Таму і шукаў лёгкае жыццё, за што аднойчы і сядзеў на лаве падсудных. Апошнім жа часам яго пацягнула на жарт. А палове чацвёртай ночы ён пазваніў у раённую дзіцячую бальніцу і заявіў, што будынак замініраваны. Прайшло паўгадзіны, і ён зноў узяўся за тэлефон. На гэты раз званок раздаўся на пульце адміністрацыі гасцініцы «Юбілейная». Паведамленне было, скажам прама, трывожнае: у аднаго насельніка гасцініцы ў чамадане выбуховае ўстройства. Зламысніка-гультая, як кажуць, за белыя ручкі павялі ў следчы ізалятар.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Калі прымаеш гасцей — не спі ў шапку?

Бо яны зробяць нешта брыдкае. Напрыклад, пазайздросцяць, што маеш нейкую дарагую рэч і прыладзяць да яе ногі. Або сцібраць грошы, якіх, маўляў, у гаспадара ці гаспадыні кватэры або дома куры не клююць.

У Жлобінскім раёне ў пасёлку Лукі, напрыклад, 28-гадовая дзяўчына пасля прыёму госця, які, вядома ж, не абышоўся без чаркі, пазбавілася двух мільёнаў рублёў. У самім райцэнтры чалавек прымаў наглядна знаёмую дзяўчыну, і той да такой ступені спадабаўся яго сотавы тэлефон, што яна паклала ў сваю сумачку. У Мазыры ў мужчыны нехта з гасцей прысвоіў яго скураную куртку, а ў Светлагорску ў мужчыны зніклі два залатыя пярсцёнкі.

Дарэчы, іншым разам і госці, як гаворыцца, ловяць варон. Так, грамадзянін Чэхіі, які гасціў у Гомелі, так і не знайшоў 800 тысяч рублёў разам з партманетам. Ці яшчэ. Варта было дзвюм жанчынам з горада Веткі вечарам на 20 хвілін зазірнуць да знаёмай і пакінуць свае веласіпеды ў пад'ездзе дома, як тых і след прастыў. Тое ж самае адбылося і ў Жлобіне, калі жанчына пакінула веласіпед у калідоры інтэрната, а пасля не знайшла яго.

Адным словам, прымаеш гасцей ці сам едзеш у госці, памятай пра тое, аб чым сказана ў загаловку заметкі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Авохці мне...

Менавіта з такімі словамі і адпаведным настроем звярнуліся ў праваахоўныя органы двое жыхароў Гомельскай вобласці. У першым выпадку 23-гадовы хлопец з Добрушскага раёна заявіў, што ў яго падчас сну ў зале чакання абласнога аўтавакзала знік залаты пярсцёнак. Было гэта днём. Трэба ж была чалавеку такога храпака даваць, што ён нічога не адчуваў!

Здзівіў міліцыю і 19-гадовы гамяльчанін, калі звярнуўся да яе з просьбай такога кшталту. Знайдзіце, калі ласка, зламысніка, які «ў неўстаноўленым месцы, пры невядомых абставінах» украў у яго 70 тысяч рублёў. Ён выявіў гэта ў... медыцынскім выцвярэзніку, у які трапіў. Што тут сказаць? Бываюць на свеце дзівакі. Авохці мне...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Не туды энергетык «прыклаў» рукі...

Супрацоўнікам Гомельскай аблінспекцыі паведамілі, што на Дняпры паблізу населенага пункта Смычак Буда-Кашалёўскага раёна незаконна здабываюць рыбу з дапамогай электралавільных прыстасаванняў.

На месцы інспектары знайшлі «прыхаваны» аўтамабіль. Праз некалькі гадзін у яго селі парушальнікі, але былі затрыманы. Адзін з пасажыраў з блокам ад прыстасавання паспрабаваў збегчы ў лясны масіў, аднак яго «перахапілі». У аўтамабілі і на прылеглай мясцовасці былі знойдзены гумавая лодка, акумулятар, падсак з замацаванымі правадамі і рыба. Урон прыродным рэсурсам ад незаконнай яе здабычы быў ацэнены на суму больш за 29,6 мільёна рублёў (848 базавых велічынь). Затрыманымі аказаліся энергетык КСУП «Бальшавік» і вадзіцель Гомельскага гаррайпаліва. Праводзяцца следчыя дзеянні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«Проста не заўважыў...»

28-гадовы вадзіцель аўтамабіля «Рэно-19, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення, выехаў на паласу сустрэчнага руху на плошчы Бангалор і стаў віноўнікам лабавога сутыкнення з аўтамабілем «Хундай». У выніку ДТЗ машыны атрымалі значныя пашкоджанні, абодва вадзіцелі — цялесныя пашкоджанні.

— Парушальнік патлумачыў, што ён напярэдадні ўжываў піва, і проста не заўважыў дарожнага знака, які дазваляе рух толькі направа, — адзначыла старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе Савецкага РУУС горада Мінска Вольга Суворава. — Але гэта не пазбаўляе вадзіцеля «Рэно» ад адказнасці. Яму пагражае: за кіраванне ў стане алкагольнага ап'янення — штраф да 35 базавых велічынь і пазбаўленне права кіраваць транспартным сродкам тэрмінам на тры гады; за здзяйсненне ДТЗ — штраф да 30 базавых велічынь ці пазбаўленне права кіравання транспартным сродкам да двух гадоў.

Надзея ДРЫЛА.

ЛАЗЕНШЧЫК: ЗНАЎЦА ЛАЗНЕВАЙ ПАРЫ І ЧАЛАВЕЧАЙ НАТУРЫ

Раней рэдка калі чалавек мог дазволіць пабудаваць для сваёй сям'і асобную лазню. Лазня была адна (максімум — дзве) на цэлую вёску і мыліся ў ёй па чарзе: спачатку мужчыны, а затым жанчыны з дзецьмі. У горадзе таксама будавалі толькі грамадскія лазні. Але так было раней. Сёння нават у вёсцы няшмат знойдзецца падворкаў, у якіх не было б уласнай лазні. А ў горадзе і пытанняў не ўзнікае — у кожнага даўно кватэра з выгодамі.

Але лазні існуюць.

Пашукаўшы парад у інтэрнэце, скажу шчыра — быў здзіўлены такому патоку інфармацыі пра лазню, куды ўвайшлі шматлікія рэкамендацыі і прапановы наконт парання і нарыхтоўкі веніка. Гэта раней я думаў, што лазня — яна і ў Афрыцы лазня. Ат, не. Лазні ёсць рымскія і фінскія, рускія і японскія. Ды і венік — гэта не проста збор пруткоў. Аказваецца, ад таго, з галінак якога дрэва ён будзе складзены, у многім залежыць і якасць парання. Таму і існуюць

* * *

Лазня № 1 г. Мінска працуе з 1954 года. І за гэты час тут памылася і аздаравілася столькі народу, што і падлічыць цяжка. За апошні год, да прыкладу, лазню наведала больш як 142 тысячы чалавек. А сёлета за дзевяць месяцаў, па словах **загадчыцы лазні Наталлі КІСЛАЙ**, наведвальнікамі лазні сталі ўжо 111 тысяч 707 чалавек. «Тыднёвы расход вады ў нашай лазні вагаецца ў межах 920—960 м^3, — працягвае мая суразмоўца Наталля Рыгораўна. — Акрамя звычайных паслуг, непасрэдна звязаных з памыўкай і парэннем, існуюць і дадатковыя. Карыстанне сушуарам (адмысловы прыбор для сушэння валасоў), выклік таксі, карыстанне паслугамі цырульніка, манікюр, педыкюр... У нашай лазні 50 кабінак мужчынскіх, 48 жаночых і 12 душавых. У агульных аддзяленнях працягласць памыўкі складае дзве гадзіны, таму продаж білетаў спыняецца ў дваццаць адну гадзіну».

«Ну, што? Пойдзем паглядзім», — прапанавала Наталля Рыгораўна і мы рушылі рабіць абыход. Мне паказалі нумары люксы (невялікія аддзяленні на 3-5 чалавек), адметнасць гэтых нумароў — міні-басейны, мяккія дываны і нават адмысловыя кухні. Паказалі мне і душавыя кабіны. Іх прывабнасць у тым, што за 45 хвілін, якія табе даюцца на памыўку, ты плаціш толькі тры тысячы. Але і не маеш магчымасці наведаць месца, дзеля якога многія і прыходзяць у лазню, — парыльню. Парное аддзяленне ёсць у агульнай лазні. Менавіта сюды, у агульнае аддзяленне, я і быў накіраваны вучнем-стажорам.

«Калі ласка, — даючы мне белы халат, які тут лічыцца спецадзеннем, працягвала Наталля Рыгораўна. — Апранайце, а я зараз выклічу нашага лазеншчыка». Жанчына набрала некалькі кнопак на тэлефонным апараце, і праз некалькі хвілін у лазню зайшоў лазеншчык... Мая працоўная змена пачыналася.

У ЛАЗНЮ ЯК НА ПРАЦУ

Святаслаў Антонавіч лазеншчыкам працуе не першы год. І хоць мужчына ўжо на пенсіі, працу не кідае.

Паглядзеўшы на мяне, мужчына ўздыхнуў і ўсміхнуўся. Сапраўды, у белым халаце я быў падобны больш на практыканта-медыка, чым на рабочага грамадскай лазні... Давялося падкасаць джынсы і пераабуцца ў лёгкія тапкі, якія мне з шафы дастаў Святаслаў Антонавіч.

Блізіліся тры гадзіны дня, і гэта азначала, што трэба здаваць змену. І зразумела — мяняліся лазеншчыкі. У адмысловым журнале выдачы венікаў і прасцін мужчына распісаўся і пазначыў, колькі чаго атрымаў, колькі здаў і колькі чаго засталося. Пасля ён зноў акінуў вокам пакойчык лазеншчыкаў: ці ўсё ў парадку. На маё пытанне, ці цяжкая спецыфіка працы, Антонавіч адказаў проста: «Увогуле, дзень на дзень не прыходзіцца. Але памятай — у нашай працы ва ўсім трэба мець пільнае вока. Але што я табе кажу: вечарам сам убачыш, што як». Мужчына паціснуў мне руку і выйшаў. Пакуль мае новыя напарнікі Анатоль і Юрась, якія прынялі змену, пра нешта ажыўлена гаманілі, я злавіў сябе на думцы, што ад слоў Святаслава Антонавіча мне стала чамусьці зусім нявесела. Але сабраўшыся з сіламі, вырашыў не адступаць.

«Наша праца — гэта пастаянныя стасункі з людзьмі», — пачаў уводзіць мяне ў курс спраў лазеншчык Юрась. Жвавы, кампанейскі і працавіты, у мінулым — спартсмен, саракагадовы мужчына не цураецца ніякай працы. «Ва ўсіх прафесіях ёсць свае адметнасці. Працаваў грузчыкам у магазіне — пасадзіў здароўе, цяпер вось тут — у лазні. І хоць заробак тут невялікі, працаваць можна», — аптымістычна настройваў мяне на рабочы лад калега.

Распраналыня. Мужчыны-наведвальнікі заходзяць у парыльню белымі, як палярныя мядзведзі, а выходзяць чырвонымі, як ракі, адпачываюць і пасля зноў вяртаюцца ў парыльню. Падчас такіх вось «пасядзелак» у распраналні ў перапынках паміж заходамі ў парылку — гамоняць, нешта абмяркоўваюць, жартуюць. Што мяне здзівіла: у мужчынскім агульным аддзяленні ля ўваходу стаяць адмысловыя вагі. І што вы думаеце, ледзь не кожны сваю вагу правярае! А яшчэ кажуць, што мужыкам усё роўна, колькі яны важаць...

«Во сістэма! Пасля кожнага заходу ў парылку скідваю 10 грамаў», — радасна падзяліўся сваімі назіраннямі з намі, з лазеншчыкамі, малады мужчына.

Колькі ж важыць сярэднестатыстычны мужчына, які наведвае лазню? 78, 85, 92... Розныя лічбы высвечваліся на электронным табло вагаў. Асабліва распаўсюджанымі былі параўнальныя ўзвешванні: адзін 76 кг, а сябар — 108 кг.

«Ты, брат, нешта здаў, — пасяброўску засмяяўся адзін з мужчын. 76 кг — дык столькі ж я ў дзявятым класе важыў». Сябры засмяяліся і зноў у парыльню.

Другая змена лазеншчыка доўжыцца восем гадзін — з трох дня да дваццаці трох. Праца — тыдзень першай змены, тыдзень — другой. Першая змена — з васьмі ранку да трох дня. У першую змену працуе адзін лазеншчык, у другую — два.

«Нам бы яшчэ аднаго чалавека, было б самы раз. Але ж не хочуць ісці. Так усё задавальняе іх, а як пачуюць пра заробак — тут жа адмаўляюцца», — уздыхае другі мой напарнік па змене Анатоль. Анатоль пятнаццаць гадоў на пенсіі, а працуе. І ў працы сваёй падобны на добрага дзядулю з дзіцячай казкі: кожнаму наведвальніку, калі той, папарыўшыся, збіраецца сыходзіць, мужчына акрамя слоў «да пабачэння» дадае і такія: «Будзьце здаровыя. Усяго добрага».

«МАША» І «МЯДЗВЕДЗІ»

А народу, між іншым, паступова станавілася ўсё больш. І хоць спачатку месцаў хапала ўсім, але ў хуткім часе ўсе 50 шафаў былі занятыя і ўтварылася чарга. Час пік нашай змены — перыяд з 17.00 да 19.00.

У астатнія гадзіны людзей было менш, але ўсё роўна недзе 20-30 чалавек.

«Вось там — шафы спецыяльна для ветэранаў, — тлумачыць мне Юрась. — А вось у тым баку звычайна спартсмены распраноюцца. Увогуле тут да нас розныя людзі прыходзяць: і выкладчыкі ўніверсітэтаў, і студэнты, і архітэктары, і рабочыя... Некаторыя прыходзяць пастаянна, на працягу некалькіх гадоў, таму многіх наведвальнікаў добра ведаем».

І сапраўды, як паказаў мой рабочы дзень, многія мужчыны не толькі як старыя знаёмыя віталіся з лазеншчыкамі, але і адзін аднаго добра ведалі. Што цікава — многія настолькі прызвычаіліся да таго, што калі яны прыходзяць у лазню ў пэўны час, у пэўны дзень тыдня, то не толькі бачаць там даўніх знаёмых, але нават распранацца прывыклі ў пэўных шафах, якія ў гэты час заўсёды аказваюцца свабоднымі. Падышоў да нас адзін мужчына і паскардзіўся: яму ў парыльні зрабілі заўвагу — маўляў, прыйшоў не ў свой час, мы цябе тут нешта раней не бачылі!

Для большасці, як паказалі мае назіранні, лазня — ужо як сістэма са сваёй традыцыяй і нават цырымоніяй. Хто сыходзіць пасля першага заходу ў парыльню? А ніхто. Чаргуючы душ з парыльняй і сцёбаннем венікам, мужчыны вяртаюцца ў распраналню, дзе, крыху адпачыўшы, часам нават і перакусіўшы, вяртаюцца па новую порцыю лазневай пары.

А падчас такіх вось перапынкаў абмяркоўваюць апошнія навіны і ў палітыцы, і ў навуцы, і нават у асабістым жыцці. Даволі багата можна пачуць жыццёвых гісторый пра тое, як хто машыну разбіў, ці на колькі кілаграмаў патраціў злавіць рыбіну. Лазневая размова — неад'емная частка традыцыі.

«Скажыце, дзядзька, а як трэба правільна парыцца?» — краем вуха пачуў я размову мужчыны гадоў сарака са старэнькім дзядком. «Ведаеш, гэта цэлае мастацтва, — пачаў стары. — Раней гэта традыцыя перадавалася сапраўды з пакалення ў пакаленне: ад дзеда да ўнука. Але сёння традыцыя губляецца. Людзі забываюцца на свае карані. А лазня — гэта таксама частка нашага гістарычнага развіцця...»

...Я ўжо было ледзьве не прыснуў, як раптам адзін мужчына, адчыніўшы дзверы з душавога аддзялення ў распраналыню, суровым голасам спытаў у прысутных: «Хто замачыў бялізну ў маім тазіку?» На хвіліну ў распраналні запанавала нервовая цішыня. Сітуацыя нагадала мне рускую казку, у якой мядзведзь такім жа тонам спрабаваў высветліць, хто еў з яго міскі.

«Машаньку», якая дазволіла сабе скарыстацца чужым тазікам, доўга шукаць не давялося. Юрась, пайшоўшы ў душавое аддзяленне, хутка знайшоў вінаватага.

«Некаторым даводзіцца нагадваць кожны раз, што ў нас тут — не пральня, а лазня, куды людзі прыходзяць мыцца, парыцца, а не бялізну мыць. Але што ты, навучыш яго — сталага мужчыну?»

І тут Юрась узгадаў пра самых праблемных наведвальнікаў. «Увогуле, людзі вельмі розныя: хтосьці піва папіў (піць піва ў лазні дазваляецца — **І.Л.**) і выкінуў пасля пустую бутэльку ў сметніцу, а хтосьці — бутэльку адкрые і нават накрыўку, якая звалілася, не падыме. Вы, маўляў, лазеншчыкі — вы і падымайце. Культура розная.

Тое, што без пільнага вока лазеншчыку нікуды, я ўжо разумеў. Напрыклад, нельга, каб наведвальнікі ставілі шкляную тару на свае шафы. Бо яна можа зваліцца, пабіцца і нарабіць бяды. А раптам хтось параніцца? Вось наведвальнік і накатае тады скаргу на лазеншчыка...

«Тут у нас аднойчы выпадак быў: мужчына адкручваў кран і нейкім чынам умудрыўся парэзацца. Дык што ты думаеш: хуткую вызываў, міліцыю. А ранкі той — не больш сантыметра. Пасаромеўся б — мужчына ўсё ж!»

* * *

Праца лазеншчыка больш псіхалагічная, чым фізічная. Асабліва фізічнай нагрузкі тут няма, а вось псіхалагічнай — хоць адбаўляй. З асабістага вопыту: незадаволеныя наведвальнікі ёсць і тут. І ў лазні такіх можна адразу прыкмеціць. Вось зайшоў мужчына, даў «добры дзень», працягнуў квіток аб аплаце. Усё культурна. А іншы, не паспеў зайсці, нахабным тонам адразу пачынае, «так, каму тут квіткі аддаваць?..»

Калі наш чытач хоць раз бываў у грамадскай лазні, то ведае: адной лазняй наш братка-беларус не абмяжоўваецца. У гэтым я ўпэўніўся, выносячы на двор смецце. Ідзеш, а па кутках сядзяць мужчыны, толькі што з лазні. Сядзяць і перакусваюць. Тут сушаная рыбка з півам, а тут — сальца з агурком... Што яшчэ — самі ведаеце...

Напачатку ўся мая праца абмяжоўвалася назіраннем за распраналняй, пасля дазволілі вынесці смецце. «Сядзі, мы самі ўсё зробім», — упіраліся напарнікі Анатоль і Юрась, усю працу беручы на сябе. Але ў рэшце рэшт маё жаданне ўзяло верх: мне дазволілі падмесці швабрай падлогу.

У канцы змены, падчас уборкі знаходзіш шмат чаго: пакеты, шампуні і нават нацельныя рэчы (сподні).

У ЛАЗНІ МЫЦЦА — НАНОЎ НАРАДЗІЦЦА!

Мой матэрыял быў бы няпоўным, калі б, прапрацаваўшы лазеншчыкам, сам не паспрабаваў лазневага духу. Я і паспрабаваў. А выйшаўшы з парыльні, як і трэба, стаў на вагі. І што вы думаеце: скінуў 20 грамаў! Хоць яны мне, прызнацца шчыра, і не перашкаджалі зусім, але не гэта галоўнае. Галоўнае, я зразумеў, чаму ў XXI стагоддзі лазні па-ранейшаму папулярныя. Вам таксама цікава? Тады шчыра запрашаю ў лазню — пары хопіць на ўсіх! Выпрабавана на сабе.

Ілья ЛАПАТО.

Выпрабавана на сабе

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

СОАО «Минский завод автомобильной комплектации»

ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР ПО ПРИОБРЕТЕНИЮ СТЕНДА ДЛЯ ОЧИСТКИ МАСЛА.

Предложения принимаются в течение 10 дней со дня опубликования по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123, тел./факс 205 86 00, тел. 205 80 72. Г.А. Венцковский. УНН 190050257.

Фонд «Минскоблгосимущество» сообщает следующее

В извещении о проведении аукциона, опубликованном в газете «Звязда» от 6 ноября 2008 г. № 211 о проведении фондом «Минскоблгосимущество» 9 декабря 2008 года в 11.00 аукциона с применением метода понижения начальной цены по продаже объектов государственной собственности и права заключения договора аренды земельных участков, составляющих единый предмет аукциона, графу «Сумма задатка единого предмета аукциона, руб.» изложить в новой редакции:

Сумма задатка единых предметов аукциона, руб.
10 000 000

Сумма задатка является единой для участия в аукционных торгах по любому из пяти лотов.

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания неустановленного назначения с инвентарным номером 500/С-30603 общей площадью 49,0 кв. м, (балансодержатель – РУП «Кварц-авто»), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 3.

Начальная цена – 59 192 000 белорусских рублей.

Отвод земельного участка будет осуществляться в установленном порядке Минской городской землеустроительной и геодезической службой.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 5 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **15 декабря 2008 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **12 декабря 2008 года** до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017)227 48 36.

УНП 190398583.

РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

Простая мова

…Не арыгінальна: што было, — было. Верасень, значыць, вёска, бяседа. Люд за сталамі — лічы, незнаёмы, а слова далі…

Прыйшлося нясмела падняцца, прыйшлося мовіць найперш, што нічога разумнага, а тым болей знячэўку я, відаць, не скажу…

Гаспадар (шчыры дзякуй яму) перабіў вось тут — хітра прыжмурыўшы вока, зазначыў, што, «калі па-беларуску, — то яно і дурное лепей гучыць».

Падахвоціў, карацей, ці нават натхніў — ледзь спынілася потым…

І разгубілася, бо, як высветлілася, сярод застольнікаў, не толькі нашы былі — дзве кабеты з Расіі, сям'я з Украіны. Спытала, ці ўсё ж зразумелі?

— Всі-всі! — залапаталі першыя.

— А кто б сомневался? — здзівіліся другія…

Адкуль — і, мусіць, яшчэ раз? — агульнавядомае, як Божы дзень яснае: няма ніякай патрэбы «ламаць язык» і ледзь што пераходзіць на іншую мову. Пачуецца, зразумеецца, прынясе асалоду наша!

А тым больш — калі гаварыць на ёй штось цікавае, патрэбнае альбо смешнае.

МЕБЕЛЬ — ДРАЙВ!

Анекдот (а мо і насамрэч было): вялікі маскоўскі туз па тэлебачанні выступаў — у прамым эфіры. Ну і «панесла» яго, як Астапа… А час ідзе. Аператар яму давай знакі рабіць: давай па гадзінніку пальцам стукаць, у паветры пальцам кружыць — усё, маўляў, пара закругляцца!..

Госць, малайчына, зразумеў — апошняе. Хоць і па-свойму. Сказаў:

— А зараз — пра набалелае, пра нашу кальцавую дарогу…

І яшчэ на гадзіну…

Я пра яе — Маскоўскую — на жаль, нічога не скажу, бо не ездзіла. А пры нашай, Мінскай, кавярня ёсць — з кідкім (пачуйце!) «Шашлык драйв».

Сугучнае яму «Абувь сити» у цэнтры Мінска…

На іх фоне, згадзіцеся, неяк блякне Лельчыцкі «Свитанок», Калінкавіцкая «Журавинка», Капыльская (здаецца) «Бульбочка»…

І не здзіўляе больш «Мебель тут!».

ПАРАДАК

У багатых свае прывычкі: адзін знаёмы знаёмых на выхадныя ў… Карэлію па баравічкі зганяў, другі — зноў жа на выхадныя — на рыбалку… у Нарвегію.

Наймацнейшае з яго ўражанняў: у глыбінцы, у вёсачцы на дзевяць (іхніх) хат стаіць поўны набор кантэйнераў: асобны — для макулатуры, асобны — для шкла, асобны — для пластыкавых бутэлек, для металу…

І ўсё гэта — рэгулярна вывозіцца.

МЕНТАЛІТЭТ

Восень, маладзік — самы час перасаджваць вазоны, самы час ратаваць, яшчэ і ад холаду: з лоджый уношу іх у пакоі, спрабую размясціць (нешта на падваконнях, нешта — на падлозе ці століках-палічках)…

І ледзь не назаўтра бачу, як пагорала маім гадаванцам, як не спадабалася, як… запратэставалі, зажаўцелі лісцем, запрасіліся назад — туды, дзе болей святла, туды, дзе хоць зрэдку ды пануе сонца…

Раслінкі — можна сказаць, неразумныя, а, бачыш — з норавам, з характарам — змагаюцца… За лепшую долю, за свае правы.

Людзям (а тым болей тутэйшым) уласцівей цярпець, уласцівей прыстасоўвацца і зносіць.

Усё

(Знак прыпынку — клічнік, пытальнік, кропку ці шмат іх — пастаўце самі).

«НАЖНІЦЫ»

…У знаёмца непрыемнасці (яшчэ мякка кажучы) — абязвечылі. І на роўным месцы! Ён з работы ішоў — нікога не чапаў: па люднай вуліцы, не цямком… Атрымаў удар па спіне. Ад болю сцяўся, адхінуўся назад, — атрымаў пад дых… Раз, потым яшчэ і яшчэ.

Згледзеў — білі ўтраіх, маладыя зусім хлапцы, уцякалі — у двор…

Да гонару — міліцыя іх хутка знайшла, узбудзіла крымінальную справу.

Што цікава, падчас следства высветлілася: усе трое — поўнагадовыя, з так званых поўных, цалкам прыстойных (знешне, прынамсі) сем'яў (у аднаго нават маці настаўніца). І не «абкураныя» ў той вечар былі, не п'яныя… Пытанне: «За што і чаму білі?». Адказ: «Хацелі паглядзець, як бейсбольная біта прыстане да спіны ў такога вялікага дзядзькі»…

За «прагляд», як і трэба было чакаць, давядзецца плаціць. Прычым досыць не танна: усім траім цяпер пагражае турма.

Што, зразумела ж, палохае — іх… Яшчэ болей — бацькоў. І таму яны цугам ходзяць за пацярпелым, просяць увайсці ў іх становішча, просяць зразумець, бо ён жа таксама бацька, напрамілы Бог просяць дараваць, не ламаць дурням лёсы, пашкадаваць…

Ён — думае.

І ведае, што як бы ні зрабіў, палюбому, будзе зразумела, па-любому будзе правільна!

І — адначасова — няправільна.

НЕ БЕЗ ТАГО?

Гэты дом як дом — быў калісьці, лічы, у цэнтры Мінска, невялічкі, прыватны.

Але ўвесну яму пашчасціла: мо, стары гаспадар на капейку ўзбіўся, можа, новы з'явіўся, але побач — закіпелі работы. Спярша (цяпер, відаць, завядзёнка такая?) вакол будынка стала ўздымацца высокая мураваная агароджа, потым над ім — яшчэ адзін паверх (пад прыгожым чарапічнам дахам)… А далей — болей: сцены дамка за лічаныя дні «апрануліся» ў прыгожы сайдынг, з'явіліся новыя вокны і дзверы, вароты…

Завяршальны акорд — высокія туі абапал, каваныя ліхтары і балконы…

Цяпер у тым доме жывуць. І, відавочна, у дастатку… Аднак, часцянкім праязджаючы міма, не магла не прыкмеціць — на абодвух з балконаў, ледзь не кожны дзень, нешта сушыцца — бялізна, адзенне…

А, значыць, і ў гэткіх, скажам так, не бедных дамах жанчына застаецца жанчынай: стаіць ля пліты, прыбірае, прасуе, мые…

Хутчэй за ўсё — з дапамогай самых найноўшых машын.

Альбо пакаёвак?

«НАМ НЕ ДАНО ПРЕДУГАДАТЬ…»

Пра Лілю Радзівонаўну Зарэцкую з Пастаўшчыны хіба глухі хто не чуў!..

Шчасце — чуць і яе саму! Адзін маналог — з дыктафона, з яе дазволу.

«…На свяце падышоў да мяне мужчына — салідны такі, прыгожы, ну яўна начальнік. І гарадскі. Просіць — прадайце мне адну сваю навалку. «Сынок, — кажу, — я не прадаю. Нічога… А навалак — і тым больш. У мяне іх пяць штук усяго… Ды і навошта яна табе?». «Глядзець, — кажа, — буду. У мяне мама ўсё жыццё вышывала, а не засталося нічога, — усё панішчылі…». Кажа так і (ці паверыце?) плача! Я яго слёзы як згледзела, — падышла да самай лепшай падушкі, сінціпон з яе выдрала, на калене злажыла, «на», кажу, чалавек… Ён так рады быў! Ну так рады!.. Давай па кішэнях шнарыць — мне грошы даваць. Але я не ўзяла… Ні капейкі… Сказала ж: не прадаю… Пазваніў назаўтра — падзякаваў. Сказаў, што на працу маю цяпер во з жонкай любуецца. І што мне, з удзячнасці — у яго там пасека недзе ёсць — гатовы хоць цэлую бочку мёду прывезці…

Хацела пасмяяцца, сказаць яму, што мне якраз бочку і трэба — на пяцёра дзяцей ды дзесяць унукаў… Але ж неяк стрымалася…

Думаеце, прыехаў і хоць паўлітра прывёз? Не! Ды мне і не трэба — ні грошай яго, ні мёду! Але ж я думала, можа ён пазвоніць калі — спытае, ці жывая я? Можа, на Новы год ці Каляды мне паштоўчку прышле — пажадае здароўя. Можа, помніць будзе… А ён — не, забыўся. Г…ы чалавек! А выходзіць, што я, вось такому, навалку вышыла.

…Заблытана, усё заблытана: робіш (шыеш, вяжаш, варыш, пішаш…), а для каго, — як знаць?

ДОЧКІ-МАЦІ

Байка. У тэму:

— Дзіцятка, як цябе завуць? — пытаюць у дзяўчынкі на вуліцы.

— Жулька, — адказвае яна.

— А ты не блытаеш?..

— Не, Жулька: татка з мамай сабачку хацелі, а нарадзілася я.

Чаму? «Кінаў наглядзелася», — сказала знаёмай акушэркі адна з дзяўчынак-парадзіх.

Запала ў душу і другая. Радзіць прыехала. Але ж папярэдне ў раддоме сталі, так бы мовіць, справу на яе заводзіць — пытаць імяпрозвішча, год нараджэння, адрас… Потым спецыфічныя пытанні пайшлі:

— У якім ўзроце пачаліся месячныя?

— У 13, — кажа дзяўчо.

— З якога ўзросту жывяце палавым жыццём?

— З 14.

— Якія гінекалагічныя хваробы перанеслі?

Задумалася, а потым лічыць:

— Дык мне ж 16 цяпер… Значыць, два гады бясплоддзе было!..

І ўсё гэта — класік праўду пісаў — не столькі смешна, колькі сумна.

ДЗІЦЯ ЧАЛАВЕЧАЕ

Машын гіблота. У Мінску імі (яшчэ мякка кажучы!) забіты усе двары, усе подступы да большменш буйных устаноў і прадпрыемстваў, імі запоўнены вуліцы: вока ды вока трэба, каб на іншы бок перайсці — па «зебры», а ўжо без…

Ля прыпынка немаведама адкуль — старога на дарогу вынесла…. Шчасце, што злева машын не было… Але ж лавіна іх неслася справа…

Абышлося (свят-свят!)… І бачыла, чаму. Таму, што першае ж аўто адразу скінула хуткасць, на пад'ездзе — плаўна спынілася. Пераходзьце, маўляў, усміхнуўся дзядку пажылы кіроўца.

Што здзіўляць не павінна (як быццам…), бо яго ж таксама не ў капусце знайшлі — ёсць, відаць, недзе бацька.

Ці быў…

Альбо… не было. Ніколі.

ПЕРАД ВЫБАРАМ

Сябар пакрыўдзіў. І калі б па драбязе — хто б думаў, хто б што казаў. А так…

Каторы дзянёк перажываю, каторы дзянёк пакутліва «важу», што ж выбраць: застацца з крыўдаю? Значыць, без сябра (калі ён ім быў). Застацца з сябрам? Ну зразумела ж!

А куды падзець тады крыўду?

РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

Гэта сезоннае і чыста жаночае: напрыканцы вясны спарадкаваць і прыняць з-пад рук зімовыя, цёплыя рэчы, на іх месца пакласці летнія (папярэдне, ну, зразумежа ж, замілавана перабраўшы іх, «павітаўшы», абсалютнай большасці — і сабе — паабяцаўшы, што ўжо сёлета абавязкова паносіш (ці хоць бы апранеш) вось гэты шыкоўны сарафан на гузічках, вось гэту белую маленькую спаднічку і гэту — элегантную, доўгую (да яе ж і басаножкі на шпілечках ёсць!)… Вось гэту сукенку яшчэ, бо нельга ж, ну насамрэч, увесь час у джынсах і падбегам! Вось гэты купальнік… Сёлета — кроў з носу — абавязкова трэба з'ездзіць да мора, абавязкова пахадзіць па цёплым пяску…

Гэта сезоннае і чыста жаночае — напрыканцы восені з верхніх паліц у шафе падаставаць зімовыя, цёплыя рэчы. Туды да лепшых часоў — паскладваць летнія.

І (у каторы ж разок?!) з болем заўважыць, што абсалютная большасць іх так і праляжала — каротакае было лета.

Акурат такое ж — жыццё. Напрыканцы яго — калі будзе час азірнуцца — абавязкова ўбачыш, відаць, як мала паспеў (не зрабіў, не з'ездзіў, не ўбачыў, не пачуў, не з'еў, не знасіў), абавязкова зразумееш усе памылкі свае і паабяцаеш, што ўжо ў наступным, у будучым жыцці…

Як у будучым леце.

Валянціна ДОЎНАР.

кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 31 (599)
аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Дом у Капыльскім раёне, 90 км ад Мінска, маецца сад, сажалка, участак 25 сотак.

Тэл. 8 029 381 82 02.

❒ Кватэра 3-пакаёвая, кааператыўная, маецца гараж у райцэнтры г. Гарадок.

Тэл.: 8 0212 48 08 09, 8 029 216 17 09.

❒ Запрашаю да сумеснай будоўлі 2-кватэрнага дома за 10 км ад Брэста сям'ю без шкодных звычак з в/а, усё для будоўлі маецца.

Тэл. 8 029 206 70 61.

❒ «Опель» 2000 г.в., 2,0 ТД або мяняю на трактар або грузавік.

Тэл. 8 029 936 28 09.

❒ Прычэп да МТЗ, акучнік, з/ч, гума да МТЗ, «БМВ» 520і на з/ч.

Тэл. 8 029 161 54 77.

❒ «VW-транспарцёр» 1991 г.в., 2,4 Д, 7+1 месца, добры стан, 6,5 тыс. у.а.

Тэл.: 8 01597 71 697, 8 029 617 16 97.

❒ Газавая пліта «Гефест» 50 х 53 см з электрагрылем, новая, электраплітa «Гефест» 50 х 57 см шклокераміка, 600 у.а.

Тэл.: 8 017 295 96 84, 8 029 115 56 99.

❒ Дзверы з каробкай, б/к з абіўкай, у Салігорску.

Тэл. 8 01742 36 244.

❒ Супермлын, 4 кВт, 2000 кг/гадз, нядорага.

Тэл.: 8 017 253 55 40, 8 029 276 65 15.

❒ Дойныя і маладыя козы зааненскай пароды.

Тэл.: 8 02234 35 646, 8 029 245 51 92.

❒ Акардэон «Weltmeister» поўны, 11 х 5 рэгістраў.

Тэл. 8 029 249 51 83.

❒ Аўтамабільны гаражны пад'ёмнік.

Тэл.: 8 01792 55 724, 648 51 13.

❒ Трактар МТЗ-52, прычэп 2ПТС-4, задні мост Т-40, рухавік УД-2.

Тэл. 8 029 648 21 30.

❒ Мікрахвалевая печка «Самсунг» з наборам посуду, новая, 150 у.а.

Тэл. 8 017 233 33 40.

❒ Бочка ёмістасцю 2 тоны на гумавых колах, б/к.

Тэл. 8 01713 74 654.

КУПЛЮ

❒ Трактар МТЗ.

Тэл. 8 029 655 07 16.

❒ Старадаўняя ўзнагароды, манеты, значкі і інш.

Тэл. 8 029 553 43 66.

У суд Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Мікалая Расціслававіча ВАСЮТЫ**, 25.10.1961 года нараджэння, ураджэнца сяла Нарынск Аўруцкага раёна Жытомірскай вобласці, да восені 2002 года пражываў у вёсцы Новая Папіна Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці, працаваў у камунгасе г. Іванава электразваршчыкам.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб лёсе Мікалая Расціслававіча Васюты і яго месцы знаходжання, паведаміць іх суду Драгічынскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Утерянный представительством № 2 по г. Минску Белгосстраха бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу **серии БЛ № 0614280 считать недействительным.**

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-5

Працягваем гэты класіфікацыйны конкурс заданнем № 9 — пазіцыяй з партыі 42-га завочнага першынства Беларусі (першая ліга):



БЕЛЫЯ (Канстанцін Барэль, Свіслач): a1, a5, c1, c5, d2, g3, h2, h4 (8). ЧОРНЫЯ (Міхаіл Гельман, Мінск): a3, a7, c7, e5, e7, f4, f6, g5 (8). Выйгрыш.

А ў рамках **бліца-41-4** падаём фрагмент партыі вочнага чэмпіянату краіны 2008 года ў жаночай вышэйшай лізе:

БЕЛЫЯ (Святлана Ланцэева): a7, c1, c3, d2, f2, g3, h2 (7). ЧОРНЫЯ (Марыя Лічко): a3, b8, d6, e5, f4, g7, h8 (7). Белыя згулялі 1. cd4 і прайгралі. Чаму?

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рубрыка «Шашкі».

М. Лічко даслала і такі эпізод, але ўжо з першынства СССР 1980 года:

БЕЛЫЯ (М. Лічко): a1, a3, a5, b4, d2, d4, e3, e5, f2, h2 (10). ЧОРНЫЯ (Алена Соркіна): a7, b6, b8, c5, c7, d8, f6, g5, g7, h4 (10). Ход і перамога чорных. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

РАШАЕМ, АДКАЗВАЕМ

Праверце, калі ласка, рашэнні змешчаных раней пазіцый

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-5: **№ 5** (М. Стэфановіч). 1. gh8 2. dc7 3. fg7 4. g:g3 5. hc3 6. ab2x;

№ 6 (Л. Вітошкін). g3, b2, c3 (d4) g5, a7 (b6 A) c5 (e7) b6 (d6) a7 (e5) b8 (d4) f4 (c3) c1x. A (e7) b8 (ed6) a7 (e5) e3 (d6) h6 (d4) f8 (e5) g7x.

БЛІЦЫ: **№ 40/6** (М. Стэфановіч).1. ed6 2. gh2 3. hg3 4. gf8 5. f:a5 6. a1:g7 7. a:e1x і

№ 41/1 (Л. Вітошкін). G7 (a1) h8, d4 (b4) a7 (a3) d2 (b2) c3, g1x.

ПА-ЗА КОНКУРСАМ: М. Стэфановіч. 1. de3 2. fg3 3. ef8 4. f:b8 5. hg5 6. be5 cd2 7. eg3 8. g:c1x; Л. Вітошкін. b8 (g5 A) f8:h6, a5, c3, f4 (c3) c1x. A (f6) c5, h8x.

Заданні класіфікацыйнага-5/1-5 «Пагода ў доме», бліцаў-39/6 і 40/1-6 рашылі: І. Козел (в. Махнавічы Мазырскага раёна), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), У. Сапяжынскі (Рагачоў), М. Трухан (в. Малы Пагост Салігорскага раёна), П. Шклудаў (Наваполацк), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), В. Голас (Любань), Аляксандра Камінская і А. Рогач (Вілейка), І. Астроўскі і А. Сняжкоў (Мінск), Д. Камчыцкі (Магілёў), К. Козел (в. Ласосна Гродзенскага раёна), К. Барэль (Свіслач), А. Кіслы (Узда), В. Ціханенка (Гомель), настаўніца М. Я. Лічко і яе вучні Я. Казлоў, Р. Аль-Карані, К. Рэмез, А. Жур, Дар'я Малашка, Д. Мамедаў, Анжаліка Кашкан, А. і А. Яраховічы (в. Возера Уздзенскага раёна) і інш.

КАСКАД КАМБІНАЦЫЙ

Нядаўна славуты беларускі шашыст-стаклетачнік Анатоль Гантварг адсвяткаў 60-годдзе з дня нараджэння. Ён чатырохразовы чэмпіён свету, міжнародны гросмайстар і заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь. Каб зразумець глыбіню яго таленту, дастаткова прывесці прыклад, які можа ўзнікнуць і ў вашай партыі:



БЕЛЫЯ: 19, 24, 29, 30, 32, 34, 37, 38, 39, 40, 41, 42, 44, 45, 46, 48 (16). ЧОРНЫЯ: 2, 4, 7, 8, 9, 10, 11, 13, 15, 16, 18, 20, 21, 25, 26, 31 (16).

«Малюнак пазіцыі і каскад камбінацый, якія пагражаюць чорным, уласцівы, хутчэй, творчасці кампазітараў, а не варыянтам з партыі», — піша юбіляр у сваёй кнізе «50 паядынкаў на 100 клетках». Вам будзе карысна пераканацца ў гэтым самастойна. Вось адзін з магчымых працягаў: 1. … 18-22 2. 38-33! і на 22-27 ці 2. … 31-36 ідзе 3. 19—14х. «Калі я дайшоў да гэтай пазіцыі, то, на шчасце, спачатку не заўважыў, што пасля 2. … 22-17 3. 19-14 4. 14:1 чорныя не здольны злавіць дамку ходам 2—7, паколькі перашкаджае шашка 10», — працягвае А. Гантварг.— Я вырашыў пашукаць другі шлях і пасля 2. 39-33 31-36 знайшоў прыгожую камбінацыю, якую з задавальненнем хачу паказаць аматарам шашачнага мастацтва: 3. 40-35 4. 19-14 5. 46-41 6. 38-28 7. 29-23! 8. 23:1 9. 38:40 10. 37-31 11. 42:22 12. 1:23". І ўсё гэта майстар бачыў у час гульні, не перастаўляючы фігуры, а разлічваючы версіі, як кажуць, у галаве! Што не выпадкова, бо прыродныя здольнасці шырокамаштабнага мыслення прывялі юнака на матэматычны факультэт Белдзяржуніверсітэта, а там існаваў шашачны клуб, які ўжо займаў значнае месца нават у СССР і якім кіраваў выкладчык Генадзь Драбушэвіч — нястомны энтузіяст старадаўняй гульні, майстар спорту. Клуб з прыходам у яго А. Гантварга хутка стаў вядомым і на ўвесь свет. Навучыў жа Анатоля гуляць у шашкі яго бацька — настаўнік матэматыкі мінскай сярэдняй школы. У Палацы піянераў і Рэспубліканскім шахматна-шашачным клубе першыя папулярныя ўрокі шашак яму давалі майстры Ізраіль Бельскі і Аркадзь Ракітніцкі адпаведна. Прафесійную дапамогу атрымліваў ад Міхаіла Корхава, Юрыя Каладзіева і іншых спецыялістаў. А да яго поспехаў прывяла, як ён і сам падкрэслівае, «самастойная фізічная і разумовая праца, прычым бязмежная».

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Капитальное строение (здание базы электростанции) и право заключения договора аренды земельного участка
Продавец недвижимого имущества	Транспортное республиканское унитарное предприятие «Брестское отделение Белорусской железной дороги», г. Брест, Привокзальная площадь, 1. Тел.: 8(0162) 27 33 12, 27 35 70
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская область, Каменецкий район, д. Оберовщина
Сведения о предмете аукциона	Здание 1-этажное, площадь – 164,4 кв.м, фундамент бутобетонный, стены кирпичные, перекрытие ж/бетонное. Крыша рулонная совмещенная. Электроснабжение. Отопление печное. Земельный участок площадью 0,1260 га, с установлением ограничения в использовании земельного участка на всей площади в связи с его расположением в водоохранной зоне пруда; срок аренды – 99 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	38 263 387
Сумма задатка, руб.	3 826 000
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: (0162) 23 12 63, 23 44 06, 20 87 85, www.brest-region.by*

Аукцион состоится **2 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона организатору аукциона, внести в местный бюджет плату (часть платы – в случае рассрочки) за право заключения договора аренды земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок организации и проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 года № 462.

Более подробная информация размещена в газете «Звязда» от 20.09.2008 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 1 декабря 2008 года включительно.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже одного земельного участка в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирного, блокированного жилого дома.

Организатор аукциона — Столовичский сельский исполнительный комитет Барановичского района Брестской области.

1	Место расположения земельного участка, адрес, кадастровый номер	Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский р-н, Столовичский с/с, д. Столовичи, ул. Зеленая, 5, Кадастровый номер 120489004101000009
2	Характеристика инженерных коммуникаций	Участок свободен от застройки, имеется линия электропередач в радиусе 30 м, водопровод, газопровод
3	Площадь земельного участка, га	0,1491 га
4	Назначение земельного участка	для строительства и обслуживания жилого дома
5	Начальная цена объекта, руб.	243 965
6	Сумма задатка, руб.	24 400
7	Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона, руб.	512 032 кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие по проведению аукциона

1. Аукцион состоится **12 декабря 2008 года** в 15.00 в здании КДЦ (культурно-досугового центра) д. Столовичи, по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, д. Столовичи, ул. Барановичская, 5.

2. Условия аукциона:

— наличие не менее двух участников;

— строительство жилого дома в течение двух лет с момента предоставления земельного участка.

3. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 15%.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

— заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;

— копию документа, удостоверяющего личность, (паспорт) покупателя или его доверенного лица;

— доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет до 6 декабря 2008 года до 14.30 часов на расчетный счет 3600211200008, филиал 802 ОАО АСБ «Беларусбанк» код 150501245 УНП 200018629.

Адрес банка: Брестская обл., г. Барановичи, бульвар Штоккерау, 8а.

Получатель: Столовичский сельский исполнительный комитет, 225312, Брестская область, Барановичский район, д. Столовичи, ул. Поленичицкая, 1.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

7. Победитель аукциона обязан:

оплатить в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка стоимость объекта продажи и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, по оформлению и государственной регистрации создания земельных участков, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи — каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по тел.: 43 52 36, 43 52 86.

9. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

10. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 11 ноября 2008 года в комиссии с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (каб. № 3 сельисполкома). Последний день приема документов — 6 декабря 2008 года с 13.00 до 13.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

11. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести плату за земельный участок; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

на право заключения договоров аренды земельных участков для размещения объектов строительства

Наименование предмета аукциона	Право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта придорожного сервиса (кафе, стоянка для большегрузных и легковых автомобилей, станция технического обслуживания автомобилей, автомобильная заправочная станция, мойка автомобилей, гостиница, торговая точка)
Арендодатель земельного участка	Барановичский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Барановичи, ул. Советская, д. 79 Тел. 8 (01634) 423757, 42 33 98
Адрес земельного участка/ кадастровый номер	250 км автодороги М-1/Е30 Брест-Минск-граница Российской Федерации/ № 120488700001000004
Размер (площадь) земельного участка, га	5,0
Срок аренды земельного участка, лет	99 лет
Целевое назначение земельного участка	для размещения объекта придорожного сервиса (кафе, стоянка для большегрузных и легковых автомобилей, станция технического обслуживания автомобилей, автомобильная заправочная станция, мойка автомобилей, гостиница, торговая точка)
Характеристика земельного участка	Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей уличной сети. Земельный участок свободен от застроек
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, иные условия	- изменения категории земель; - внесения победителем аукциона в установленные сроки платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещения победителем аукциона убытков и упущенной выгоды, причиненных изъятием земельного участка ООО «Агрофирма «Петковичи» в сумме 18905063 руб.; - возмещения расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; - снятия победителем аукциона плодородного слоя почвы и использования его на благоустройство территории и улучшение малопродуктивных земель Петковичского сельисполкома; - заключения победителем аукциона с Барановичским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; - получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающих 2-х лет; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - возмещение победителем аукциона потерь сельскохозяйственного производства в сумме 66 517 300 рублей (в связи с расположением части участкаплощадью 3,1 га на расстоянии более 100 м от оси дороги. Условия РУП «Минсавтодор-центр»: размещение капитальных зданий и сооружений предусмотреть на расстоянии не ближе 50 м от края проезжей части автомобильной дороги М-1/Е30; победитель аукциона в обязательном порядке должен получить тех. условия на проектирование объекта придорожного сервиса, в т.ч. устройства подъездных путей, инженерных коммуникаций в РУП «Минскавтодор-Центр»
Начальная цена предмета аукциона, руб.	8 493 110
Размер задатка, руб.	849 310
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11 тел. (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by*

Аукцион состоится **19 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество». **Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенные банком копии платежных поручений*:*

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107 , УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Предоставляется возможность осмотра земельных участков. Осмотр земельных участков обеспечивает арендодатель.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наибольшую цену. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан: подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

**Заявления

Наш фармат

Бульба як прадукт... натхненне

16 лістапада ў канцэртнай зале Мінск пройдзе першы паказ анімацыйных фільмаў — прызёраў галоўных фестываляў свету. Прадставіць праект «KARTOFFEL», створаны былым удзельнікам барабаннага гурта «Drum Ecstasy» Сцяпанам Бітусам і яго сябрамі. Напярэдадні паказу арганізатары абвясцілі конкурс на лепшае фота на тэму «Бульба», і першыя вынікі не прымусілі сябе чакаць.

Чаму, уласна кажучы, менавіта «Бульба»? Бо гэты год абвешчаны міжнародным годам бульбы, і па ўсім свеце праходзяць шматлікія акцыі з гэтай нагоды. Беларусь, натуральна, бярэ ў іх актыўны ўдзел — напрыклад, у міжнародным фотаконкурсе «Бульба ў аб'ектыве фотакамеры», абвешчаным ААН, беларускі фатограф заняў трэцяе месца. Праўда, вось помнік бульбе ў Мінску ніяк не ўсталююць, хоць праектаў яго было шмат, дый некалькі ідэй увасаблення энтузіясты рэалізавалі.

У падтрымку гэтага міжнароднага мастацкага «бульбянога руху» праект «KARTOFEL» таксама абвясціў конкурс фота, дзе кожны мае шанц выйграць удзел у фотавыставе, якая пройдзе 16 лістапада ў фае КЗ «Мінск», білеты на наступныя мерапрыемствы праекта, а ў якасці галоўнага прыза — бясплатнае наведванне ўсіх гэтых мерапрыемстваў.

«Новы год». *(Адзін з першых прызёраў конкурсу.)*

«Многія людзі захапляюцца фатаграфіяй і робяць неблагія здымкі, але збольшага яны ўпрыгожваюць толькі папку «Мае малюнкі» ў асабістым камп'ютары, — разважае адзін з ініцыятараў праекта Сцяпан Бітус. — Мы ж хочам, каб наша аўдыторыя была больш актыўнай і не баялася фантазіраваць. Удзельнікаў не абмяжоўваем ні ў чым — фота можа быць зробленае нават на тэлефон, галоўнае — ідэя здымка. Выяўляйце свае здольнасці на ўсю катушку! Адзіная ўмова, каб змест фота быў нейкім чынам звязаны з бульбай».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Свая справа

ДЗІЎНЫ САД ВІКТАРА АШУРКЕВІЧА

Гаспадар з Шэлеўшчыны кінуў «грашовую» працу і падаўся ў фермеры

Віктара Ашуркевіча на Валожыншчыне ведаюць многія. Між тым сярод фермераў ён чалавек новы, бо прыйшоў у гэтую справу толькі некалькі гадоў таму. Аднак нават за такі непрацяглы час паспеў стварыць сабе рэпутацыю моцнага гаспадара і надзейнага партнёра. Тыя, хто пабываў на сядзібе Віктара Антонавіча, надоўга застаюцца пад уражаннем ад убачанага. Напэўна, менавіта такой усім і ўяўляецца ў ідэале праца на зямлі — нармальны, перспектыўны бізнэс, здольны забяспечваць спажыўцоў усёй неабходнай прадукцыяй. А гаспадарам прыносіць стабільны прыбытак і задавальненне ад любімай справы.

Віктар АШУРКЕВІЧ ніколькі не шкадуе аб тым, што стаў фермерам.

«Гусіны» вопыт

Ашуркевіч нарадзіўся на Валожыншчыне — у вёсцы Сівіца. Бацькі трымалі вялікую гаспадарку і з маленства Віктар спасцігаў усе тонкасці «зямельнай навукі». Але з вёскай спачатку сваю будучыню звязваць зусім не меў намеру. Пасля заканчэння школы паступіў у тэхналагічны інстытут. Як адвучыўся ў ВНУ, доўгі час працаваў у дарожнай галіне, праўда, у родным раёне. Апошнім часам быў начальнікам участка ў Івянцы.

— Нармальная зарплата, устойлівае становішча ў грамадстве, дом, сям'я — чаго, здавалася б, яшчэ шукаць? — кажа Віктар Ашуркевіч. — Аднак аднойчы ў думках прасачыў усё сваё наступнае жыццё і мне не захацелася такім чынам сустрэць будучыню. Зразумеў, што неабходна нешта мяняць, і... пайшоў у невядомасць. Бацькі яшчэ казалі: «кінуўся ў абсурд». Многім было незразумела, як можна пад сорак гадоў у літаральным сэнсе ўсё пачынаць з нуля. А я адважыўся і дасюль не шкадую аб тым сваім выбары.

Фермерская гаспадарка Ашуркевіча была зарэгістравана 31 сакавіка 2005 года. Так на Валожыншчыне з'явіўся самы сапраўдны «Дзіўны сад» — менавіта такую рамантычную назву прыдумаў прыватнік. Прычым «шыльда» ў поўнай меры адлюстроўвае спецыфіку дзейнасці: Віктар Антонавіч з самага пачатку сур'ёзна займаецца пладаводствам. Вядома, што «як карабель вы назавяце, так ён і паплыве». Напэўна, у адпаведнасці з гэтай прыкметай у фермера ўсё і развіваецца. Як ён сам заўважае: «шмат у чым сапраўды пашчасціла». Па-першае, атрымаў неблагія землі — участак 17,7 гектара (былыя палеткі СВК «Суднікоўскі»), па складзе глеба амаль ідэальна падыходзіць пад сад. Справа ў тым, што павінны быць як мінімум суглінак, на пясках пладаводствам займацца немагчыма. Калі зямля дрэнная, то трэба штучна ствараць урадлівы слой. А гэта вялікія выдаткі, таму прыбытку не атрымаеш. У такім разе які прыватнік пойдзе на заведама пройгрышную справу?

Акрамя добрай зямлі, у якасці своеасаблівага «бонусу» для належнай «раскруткі» Ашуркевіч меў уласныя саджанцы. Гэта толькі з першага погляду ўчынак начальніка ўчастка ДРБУ здаецца авантурным. Насамрэч Віктар Антонавіч свой першы сад пасадзіў яшчэ ў 1995 годзе. Паколькі лічыць, што сядзіба без гэтага «зялёнага элемента» не паўнаважная.

— З тым садам, — усміхаецца фермер, — недарэчнасць атрымалася. Яго... гусі з'елі. Пагадзіцеся, гучыць амаль анекдатычна, аднак мне тады было не да жартаў. Напэўна, гусям пад восень травы стала не хапаць, вось яны не толькі лісце абшчыпалі, але і кару з дрэў злупілі. Такім атрымаўся мой першы вопыт у пладаводстве.

Як канкурыраваць з «паўднёвымі» фермерамі?

Колькі гадоў таму ў Ашуркевіча з'явілася хобі — вырошчванне саджанцаў. Ён чытаў усю неабходную літаратуру і з задавальненнем прымяняў свае веды на практыцы. З цягам часу стала няблага атрымлівацца, вось тады, напэўна, і з'явілася думка наконт уласнай справы. Аднак змяняць лад жыцця заўсёды вельмі няпроста. Таму Віктар Антонавіч нават пасля таго, як зарэгістраваў фермерскую гаспадарку, працягваў працаваць у ДРБУ. Аднак хутка зразумеў, што «на два кавалкі не разарвацца». Так і стаў прыватнікам.

Цяпер у «Дзіўным садзе» па штату лічыцца... адзін чалавек. Пакуль не па сродках трымаць рабочы калектыў, паколькі і сам спраўляецца — плошчы не такія ўжо і вялікія. Ды і сям'я ва ўсім дапамагае. Праўда, жонка пакуль працуе інжынерам па сертыфікацыі на Івянецкай кандытарскай фабрыцы. Кажа, што як толькі здолее муж плаціць добрую зарплату, то адразу пяройдзе ў штат фермерскай гаспадаркі.

Старэйшы сын Дзіма заканчвае школу і рыхтуецца паступаць у медыцынскі ўніверсітэт на хірурга. Каці яшчэ вучыцца ў школе два гады. Дзеці даглядаюць палеткі на роўных з бацькамі. Віктар Антонавіч лічыць, што фермерства — сямейны бізнэс і хацеў бы ў далейшым менавіта дзецям перадаць сваю справу.

За тры з лішкам гады Ашуркевічу ўдалося стварыць стабільную сельскагаспадарчую вытворчасць. Амаль трэцюю частку агульнай плошчы займаюць клубніцы. Пакуль больш чым палова гэтых пасадак — малады ягаднік, таму ўраджаі штогод павялічваюцца на парадак. Калі спачатку прыватнік сабраў літаральна некалькі вёдзер, то сёлета ўдалося рэалізаваць ужо 6,5 тоны. Атрымалася б і больш, аднак ужо з сярэдзіны «клубнічнага» сезона ледзь не штодня ішоў дождж. Таму напрыканцы ўборкі рады літаральна былі чырвоныя ад ягад, якія ападалі.

Але навошта Ашуркевічу займацца клубніцамі, няўжо можна на роўных канкураваць з калегамі з паўднёвых рэгіёнаў?

— Я ніколькі не прайграю фермерам з Брэстчыны, — заўважае Віктар Антонавіч. — Так, калі яны пачынаюць прадаваць клубніцы, то ў мяне іх яшчэ проста няма. Але я выходжу на рынак у той час, калі ў маіх калег пік сезона і ягада змяншаецца ў памерах, губляе таварны выгляд. Я ўжо маю перавагу. Калі ж у брастаўчан адыходзяць клубніцы, то застаюся практычна адзін на рынку. Попыт не змяншаецца, бо многія спажыўцы па нейкіх прычынах не паспелі паесці ягад, а вельмі б хацелі. Яшчэ адна перавага — адлегласць ад Мінска. Мае палеткі знаходзяцца за менш чым 60 кіламетраў ад сталіцы. Таму шлях ад градкі да прылаўка займае каля гадзіны. Я пастаўляю сапраўды свежыя клубніцы — пакупнік гэта бачыць, таму з рэалізацыяй ніякіх праблем не ўзнікае.

Ашуркевіч аддае перавагу гатункам галандскай селекцыі. Тут ёсць некалькі прычын. Гэтыя клубніцы вельмі зручна ўбіраць: толькі падносіш руку да куста, і ягада сама «адшчыквае». У такім разе прадукцыя не губляе свайго выгляду. Ягады буйныя, салодкія, добра пераносяць перавозку. Дарэчы, усе перавагі ацанілі спажыўцы: без усялякай шырокай агалоскі людзі адзін ад аднаго даведваліся пра фермера, самі знаходзілі яго і «затарваліся» клубнікамі. У гэтым годзе нават амаль не давялося выязджаць на рынак. Людзі бралі па 100—200 кілаграмаў ягад.

Пладова-ягадны «канвеер»

Налета Віктар Антонавіч плануе сабраць ужо не менш чым 20 тон клубніц. Увогуле, пры нармальным доглядзе з аднаго гектара можна ў сярэднім збіраць па 10 тон. Але Ашуркевіч прывык лічыць вынік па мінімальным раскладзе. Узрастуць аб'ёмы — значыць, трэба шукаць каналы рэалізацыі. Раней фермер спадзяваўся на рынак, а налета плануе ўстанавіць партнёрскія сувязі са сталічнымі гіпермаркетамі. Віктар Антонавіч упэўнены, што здолее зацікавіць сваёй прапановай вялікія магазіны. Высокая якасць пры адносна невялікай цане — сапраўды прывабны варыянт.

— Імкнуся арганізаваць сваю справу такім чынам, каб утвараўся своеасаблівы пладова-ягадны «канвеер», — заўважае Ашуркевіч. — Пасля таго, як адыходзіць сезон клубніц, пачынаецца пара алычы. Гэта зусім не тая дробненькая ягада, якую ўсе прывыклі сабе ўяўляць. Вырошчваю буйнаплодную алычу, кожная на вазе як вялікая слівa — не менш чым па 40 грамаў. Костачка добра аддзяляецца, водар своеасаблівы — нечым нагадвае пах персіка і абрыкоса. Пасля алычы пачынаюцца яблыкі і грушы, яны пладаносяць аж да позняй восені. Так і замыкаецца гэты смачны канвеер.

Зараз Ашуркевіч удзельнічае ў праграме па развіцці пладаводства. Як заўважае фермер, без дзяржаўнай дапамогі даводзілася б цяжкавата. Мяркуйце самі: за тры гады свайго гаспадарання Віктар Антонавіч пасадзіў усяго 4 гектары саду. А ў адпаведнасці з праграмай да 2010 г. у прыватніка павінна быць ужо 22 гектары. Зразумела, пад канкрэтныя дзяржаўныя выдаткі. Саджанцамі Ашуркевіч сам сябе забяспечвае. Адшуквае перспектыўныя, на яго думку, гатункі, прычым сустракаюцца цікавыя экзэмпляры і сярод «народнай» селекцыі. Спачатку прыватнік саджае адно дрэва, вывучае яго магчымасці. Калі бачыць, што гатунак варты, то павялічвае пасадкі.

Перавага — за грушамі

Пад яблыкі фермер адводзіць толькі 15 працэнтаў плошчы саду. Перавагу будзе аддаваць грушам, паколькі іх на рынку прапануюць не так шмат. Каб заняць сваю нішу, Віктар Антонавіч мяркуе вырошчваць усю «лінейку» гатункаў — ад ранніх да позніх. Дарэчы, апошніх у Беларусі практычна няма. «Беларуская позняя» хоць і нядрэнная па смаку, аднак таварныя якасці ў гэтых груш не на ўзроўні. Прыватнік жа імкнецца, каб прадукцыя была прыгожая і смачная. Мяркуючы па ўсім, гэта ў яго няблага атрымліваецца.

Каб атрымаць неабходныя для развіцця гаспадаркі абаротныя сродкі, Ашуркевіч яшчэ вырошчвае і агародніну — капусту, буракі. Частку прадае на рынку, пэўную колькасць пастаўляе ў сацыяльныя ўстановы — бальніцы, дзіцячыя садкі, школы. У такім разе прадукцыя сур'ёзна правяраецца на якасць, дык, напэўна ж, калі б былі якія адхіленні, то да фермера больш не звярталіся б. А так стабільна робяць заказы.

Пакуль што «вытворчая база» прыватніка каля вёскі Шэлеўшчына невялікая — вагончык ды навес. Але, заўважае Ашуркевіч, гэта толькі пачатак. Пакрысе з'явіцца ўсё неабходнае — плануе рабіць замарозку, а таксама перапрацоўку ягад і садавіны. У перспектыве можна будзе, напрыклад, ціснуць сок, рабіць сухафрукты.

— Галоўнае — прывіваць культуру вытворчасці ў сельскай гаспадарцы, — упэўнены фермер. — Каб у АПК стала перспектыўна працаваць, каб гэта быў нармальны бізнэс. Чым, напрыклад, той жа сад горшы за заводскі цэх? Можа нават і лепш — праца на свежым паветры. Галоўнае — стварыць людзям нармальныя ўмовы.

Мікалай ЛІТВІНАЎ,
Валожынскі раён.

Фота аўтара.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.30	16.16	8.46
Віцебск —	7.25	16.01	8.36
Магілёў —	7.20	16.07	8.47
Гомель —	7.11	16.09	8.58
Гродна —	7.44	16.33	8.49
Брэст —	7.39	16.39	9.00

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Анастасіі, Ганны, Марыі, Аляксея, Андрэя, Віктара, Івана, Кузьмы, Мікалая, Яўгена.*

К. *Анастасіі, Ніны, Барталамея, Марціна, Мацея, Тодара, Эміля, Яна.*

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

11 лістапада

1623 год — 385 гадоў таму адбылося паўстанне гараджан Віцебска супраць Брэсцкай царкоўнай уніі, у час якога быў забіты ўніяцкі архіепіскап Ясафат Кунцэвіч.

1918 год — 90 гадоў таму у Камп'енскім лесе (Францыя) паміж Англіяй, Францыяй, ЗША і іншымі краінамі з аднаго боку і Германіяй, якая пацярпела паражэнне, з другога, было заключана перамір'е, якое завяршыла Першую сусветную вайну.

Цытата дня:

«Кнігі — найлепшыя госці ў доме: ніколі не злуюцца, ціхія, прыемныя, шаноўныя суразмоўцы».

П'ер дэ Рансар (1524—1585), французскі паэт.

ВЫЙСЦІ ЗАМУЖ

У народнай культуры на працягу шматлікіх стагоддзяў існаваў шэраг забаронаў і перасцярог, а таксама рэгламентацый, якія датычыліся магчымасці выйсці ў будучым замуж ці ажаніцца:

- Адразу ж пасля нараджэння дзіцяці неабходна было закапаць «дзіцячае месца». Калі нараджалася дзяўчынка, яго закопвалі пад парогам. Тым самым «праграмавалі» будучае дачкі: каб своечасова «пайшла з хаты», г.зн. замуж выйшла. Калі нараджаўся хлопчык, «дзіцячае месца» трэба было закапаць пад домам з боку чырвонага кута, каб ажаніўся і гаспадыню ў хату прывёў.
- Незамужнім дзяўчатам нельга было плесці косы іншым людзям — сваты не прыйдуць.
- Калі дзяўчыну ці хлопца прасілі прынесці вады (ці іншую рэч), нельга было перадаваць яе цераз парог.
- Па той жа прычыне нельга стаяць ці сядзець на парозе: «продкі ўгневаюцца» і назаўсёды «прымусяць» жыць у адзіноце.
- У правілах народнай культуры ў паўсядзённым жыцці смецце трэба было месці ад далёкай сцяны да дзвярэй, г.зн. са «сваёй» прасторы ў чужую. У адваротным выпадку лічылася, што дачка не выйдзе замуж, а сын не ажэніцца.
- Калі мялі падлогу ў хаце, дзеўкам на выданні нельга было месці вакол сябе венікам, каб не «закрыць» сябе ад жаніхоў.
- Калі малады чалавек доўгі час заляцаўся да дзяўчыны, але не прапаноўваў ёй выйсці за яго замуж, яна магла выканаць наступныя магічныя дзеянні. Калі ён прыходзіў у госці, дзяўчына брала венік і неўпрыкмет замятала яго сляды ад парога да печы ці ў бок чырвонага кута, і хлопец назаўжды «заставаўся» ў гэтай хаце.
- Ад пакалення да пакалення перадаецца забарона біць венікам чалавека ці жывёлу: той, каго б'юць, стане сухім і худым, як венік, будзе пакутаваць ад кароты, дзіця перастане расці, дзяўчына не выйдзе замуж.
- Забаранялі дарыць свайму каханаму нож, нажніцы ці іншыя вострыя рэчы. Лічылася, што яшчэ да вяселля з маладымі можа здарыцца бяда, і яны не будуць жыць разам. Да такіх жа рэчаў адносіліся насоўка, люстэрка, гадзіннік.
- Існавала народная прыкмета, калі дзяўчына што-небудзь (шапку, шалік і г.д.) вязала свайму каханаму, ён абавязкова пакіне яе і пойдзе да другой.
- Нявесту, пасля таго як падзялілі каравай, прасілі пасядзець на новай падушцы. Потым на гэтую ж падушку саджалі тых дзяўчат ці юнакоў, якія па розных прычынах не маглі стварыць сваю сям'ю.
- Каб выйсці замуж і на будучы год стаць цяжарнай, неабходна было сплесці і насіць на сабе на працягу Вербнага тыдня (тыдзень перад Вялікаднем) пояс з галінак вярбы.
- А яшчэ, калі дзяўчына доўга не магла выйсці замуж, ёй раілі стаць хроснай маці для незаконнанароджанага дзіцяці (байструка), як толькі дзіця пойдзе ножкамі, дзяўчына будзе чакаць сватоў.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Блізняты не павінны рабіць тое, што ім не хочацца, а Скарпіёны — прыносіць сябе ў ахвяру

♈ БАВЕН. Будзеце забяспечаныя сімпатыяй і падтрымкай сяброў і аднадумцаў. Рэкамендуецца паменш крытыкаваць калегаў і больш спакойна ставіцца да недахопаў іншых. Для вас гэты тыдзень — час падрыхтоўкі сваіх задум, перыяд выношвання ідэй. Шануйце і паважайце сваю працу, інакш вашым празмерным альтруізмам і прыніжанай ганарлівасцю могуць скарыстацца навакольныя.

♉ ЦЯЛЕЦ. Выдатны тыдзень для творчасці і кар'еры. Ваша працаздольнасць прыемна здзівіць навакольных. Засяроджанасць і дзейнасць будуць адзначаныя, і, магчыма, узнагароджаныя. А вось асабістыя адносіны лепш не высвятляць: будзе цяжка прыйсці да адзінага меркавання. Новая інфармацыя можа абудзіць цікавасць да іншых культур і звычаяў. Вы поўныя сілаў і ідэй. Найболей спрыяльным днём будзе серада.

♊ БЛІЗНЯТЫ. Смела можаце пашырыць сферу свайго ўплыву ў любой галіне, якая вам цікавая. Але пазбягайце рабіць тое, чаго вам рабіць катэгарычна не хочацца. У чацвер і пятніцу не варта залішне турбавацца з-за падзей, якія адбываюцца — усё складзецца найлепшым чынам. Забудзьцеся пра ўсе праблемы і пастарайцеся адагнаць сумныя думкі.

♋ РАК. Аб'ектыўна ацаніўшы становішча, неабходна правільна ўзважыць свае магчымасці і не даймаць сябе залішняй працай, а прысвяціць час карэкціроўцы і наступнаму планаванню дзейнасці. Не фарсіруйце падзеі і не спрабуйце рабіць некалькі спраў адразу.

♌ ЛЕЎ. Тыдзень спрыяльны для стасункаў з блізкімі сябрамі. Паспрабуйце не спатыкнуцца на дробязі ў захапленні звышзадачай. Працы будзе шмат — і яна запатрабуе ад вас добрасумленнасці і засяроджанасці. Перш чым нешта сказаць калегам па працы і блізкім людзям, абдумайце фармулёўку: не факт, што вас правільна зразумеюць.

♍ ДЗЕВА. Спрыяльны час для сур'ёзных пачынанняў. Толькі не аглядайцеся назад. Трэба будзе змагацца за сваю асабістую прастору, адстойваць свае мэты. Цяпер галоўнае — гэта вынікі. Каб паспяхова прасоўвацца наперад, трэба прыслухацца да інтуіцыі. Усе геніяльныя ідэі могуць ажыццявіцца толькі пры падтрымцы навакольных. Нават самыя экстравагантныя з іх знойдуць станоўчы водгук.

♎ ШАЛІ. Вы будзеце настолькі захопленыя чымсьці адным (хутчэй за ўсё — працай), што перастанеце заўважаць усё астатняе, якімі б важнымі ні былі падзеі, што адбываюцца. Вам неабходна часова адысці ад старых стэрэатыпаў і даць магчымасць з'явіцца новаму ў жыцці. Многім можаце не дагадзіць, але суцешыць тое, што ваша крытыка будзе справядлівай.

♏ СКАРПІЁН. Захоўвайце спакой і ўпэўненасць ва ўласных сілах. Прафесійныя справы палепшацца дзякуючы настойлівасці і самаддачы. З'явіцца жаданне змяніць не толькі імідж, але і ўнутраны стан. Толькі не прыносьце сябе ў ахвяру і не дазваляйце зрабіць з сябе казла адпушчэння.

♐ СТРАЛЕЦ. Добры тыдзень для тых, хто прывык добрасумленна працаваць. Пастарайцеся абдумваць кожнае сваё дзеянне, каб не дапусціць непажаданых памылак. У аўторак можна планаваць доўгатэрміновыя мерапрыемствы і завяршыць пачатыя справы. У сераду будзьце асцярожныя ў транспарце, бо павышаецца рызыка крадзяжоў. На пятніцу лепш не планаваць штосьці сур'ёзнае.

♑ КАЗЯРОГ. Пажадана менш часу траціць на навакольных, а больш прысвяціць сабе. Па-першае, вы гэта заслужылі, а па-другое, гэта дазволіць больш-менш адэкватна ацаніць сітуацыю, разабрацца ў якой інакш было б цалкам нерэальна. Наступствам трэнняў з начальствам можа стаць пазбаўленне вас пэўных ільгот.

♒ ВАДАЛЕЙ. Найлепшым чынам будуць давацца задачы, звязаныя з вучобай і развіццём творчага патэнцыялу. Захоўвайце спакой і ўпэўненасць — усё ў вас павінна атрымацца. Можа з'явіцца пахвальнае імкненне дабіцца лепшага месца пад сонцам.

♓ РЫБЫ. Надыходзіць удалы час для далёкіх паездак і адпачынку за мяжой. Творчым асобам задавальненне прынясуць заняткі літаратурнай дзейнасцю. Навакольная рэчаіснасць будзе як люстэрка адлюстроўваць вашу праўдзівую сутнасць. Будзьце больш асцярожнымі, бо не выключаны рознага роду страты.

Муз-news

ГУРТ «THE STOKES» САГРЭЕ СУАЙЧЫННІКАЎ

Ва ўсякім разе, менавіта ў Беларусь хлопцы прывезлі свой новы — а па вялікім рахунку, усяго другі студыйны — альбом «Не замярзай». На дыску 13 песень, але гэта лічба калектыў ніколькі не палохае — наадварот, музыканты лічаць яе шчаслівай.

Больш як два гады музыканты жывуць і працуюць у Маскве. Спачатку, кажуць, давялося прабівацца як і ўсім — шукаць кватэру, выступаць літаральна для трох слухачоў, лавіраваць паміж кабальнымі кантрактамі. Але затое вынік атрымаўся варты — сёлета беларусы пачалі супрацоўніцтва з гуказапісвающчай кампаніяй, якую ўзначальвае бас-гітарыст гурта «Машына часу» Аляксандр Куцікаў. Менавіта ён стаў прадзюсарам гурта і кіраваў запісам альбома, які праходзіў у нязвыклай манеры — 14 гадзін жывога гуку, фактычна вялізны канцэрт у студыі. У падтрымку альбома таксама ў Маскве быў зняты кліп на песню «Навучы мяне», мяркуючы па якім, музыка ў «Стоксаў» амаль не змянілася... Зрэшты, лідар калектыву Аляксей Стокс з такім меркаваннем нязгодны. «Ранейшай засталася наша жыццёвая пазіцыя, аптымізм, вера ў людзей і дабрыня. А вось музыка стала больш упэўненай і значна больш якаснай. Так што людзей, якія ведалі нас раней, мы здолеем здзівіць энергетыкай гучання», — лічыць Аляксей.

У Расіі дыск паступіць у продаж толькі напрыканцы восені, а ў Мінску песні з альбома можна было пачуць жыўцом 6 лістапада — на канцэртнай прэзентацыі ў адным са сталічных клубаў.

ЛІРЫКА БЕЗ ХЭПІ-ЭНДУ

Лінію «пачуцці сагравающь лепш за ўсе іншыя сродкі» вытрымала і спявачка Аня Шаркунова ў сваім новым кліпе на песню «Бегчы». На здымках, дарэчы, дзяўчына ўдзельнічала ў рызыкоўных сцэнах — здымалася аголенай.

«У сцэнарыі ніякіх эратычных сцэн не было! — сцвярджае спявачка. — Але потым рэжысёр Дзяніс Волкаў пераканаў мяне, што ўсё будзе прыгожа, годна і без пошасцяў. Я папрасіла, праўда, каб на пляцоўцы, акрамя рэжысёра і аператара, нікога не было, але здагадваюся, што ўсе, хто хацеў, усё адно падгледзелі». Што атрымалася, да заканчэння мантажу спявачка і сама не ўбачыць, але падазрае, што некаторыя сцэны давядзецца тлумачыць бацькам. Напрыклад, зняты з чацвёртага дубля пацалунак з партнёрам па кліпе — акцёрам тэатра беларускай драматургіі Дзянісам Паршыным. Дый увогуле сам сюжэт — гісторыю кахання спявачкі з фатографам, які ў выніку аказваецца жанаты і з дзіцем...

Зрэшты, выдуманыя страсці былі адыграныя і забытыя, а вось умовы, у якіх праходзілі здымкі, Аня ўзгадвала яшчэ вельмі доўга. Цэлы дзень ёй давялося мокнуць пад дажджом і мерзнуць пры тэмпературы +8 у лёгкай сукенцы, пры тым не забываючы, што на твары павінен быць шчаслівы выраз. Каракаль, за экраннае шчасце давялося расплачвацца хворым горлам і тэмпературай. Але ў жыцці, у адрозненне ад кліпа, хэпі-энд усё ж наступіў — Аня выздаравела і актыўна рыхтуецца да канцэртаў, у тым ліку да сумеснага выступлення з Георгіем Калдуном, якое чакаецца 2 снежня ў Палацы Рэспублікі.

БЕЗ ЛІШНІХ СЛОЎ

Днямі завяршыліся здымкі новага кліпа гурта «Дразды» на песню «Ты далёка». Кампазіцыя гэта сур'ёзная і лірычная, не падобная да асноўнага рэпертуару смяшлівых «Дразду» — магчыма, таму многія слухачы і не вераць у іх аўтарства. Каб пераканаць у гэтым слухачоў, музыканты і вырашылі зрабіць кліп.

Прычым, што адметна, у кліпе гурт не спявае і не іграе — саліст Віталь Карпанаў у ролі аператара проста гуляе па горадзе і здымае прыгожыя пейзажы, будынкі і сустрэчных прахожых. «Звычайна ў кліпах абавязкова ёсць кадры, дзе паказана, як музыканты граюць, саліст — спявае. А мы вырашылі парушыць гэту традыцыю, — расказвае Віталь. — Я не тое што не спяваў (рэжысёр мне гэта забараніла), нават ніводнага слова не сказаў у роліку, там толькі карцінка!». Паколькі песня лірычная, у сюжэце не абышлося без дзяўчыны. Але якую ролю яна выконвае, музыканты расказаць адмовіліся — маўляў, убачыце самі, і будзе вам шчасце.

ХАЛАСЦЯК СПЯЕ З ЧУЖОЙ ЖОНКАЙ

Пасля перапынку ў два гады «заўзяты халасцяк» і «ўзорная жонка» беларускай эстрады — Дзмітрый Врангель і Вольга Плотнікава — вырашылі ўзаконіць свой саюз. Праўда, творчы. І нават прыдумалі свайму дуэту назву — ViP (адкуль што ўзялося, лёгка зразумець. Напісаўшы прозвішчы ўдзельнікаў лацініцай). У гэтым тандэме выканаўцы збіраюцца здзівіць не толькі айчынную публіку, але, калі справы пойдуць удала, і маскоўскую...

Свой ViP-дуэт Вольга і Дзмітрый хочуць прадставіць гучна і заўважна — напрыклад, на «Еўрабачанні-2009». З чаго выканаўцы ўзялі, што менавіта ім пашанцуе на адборы? Лічаць, што прыгожую мелодыю і гармонію песні зразумеюць усе, незалежна ад нацыянальнасці. Практычна няспынна ідзе праца ў студыі, і хоць назва кампазіцыі пакуль што трымаецца ў сакрэце, у выніку абяцаюць прадставіць 100-працэнтны хіт з VIP-якасцю. «Насамрэч мы мецім далёка наперад, і зусім не пакрыўдзімся, калі на гэтым «Еўрабачанні» пераможам, а налета конкурс будзе прымаць Мінск, — аптымістычна разважаюць выканаўцы. — Што датычыцца нумара — ну, як мінімум, Дзіма будзе ў чорнай балетнай пачцы, а Вользе, каб адпавядаць вобразу, мабыць давядзецца пастрыгчыся нагала?». Жарты жартамі, але да адбору спевакі рыхтуюцца вельмі адказна — і, дарэчы, яны адны з першых, хто выказаў і пацвердзіў гарачае жаданне паўдзельнічаць у «ЕўраФэсце». Затое ў ім сёлета не будзе як мінімум дваіх пастаянных удзельнікаў — Гюнеш спрабуе прабіцца на конкурс ад Азербайджана, а гурт «Dali», па чутках, падасць заяўку ў Польшчы.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Усміхнёмся!

— Вовачка, ты картачную пазыку прынёс?

— Прынёс, прынёс, Марыя Іванаўна. Але ўсё-роўна несумленна. Туз вы з рукава дасталі!

— А як жа яшчэ з вас на рамонт школы збярэш?

☺

Госці дзеляцца на два тыпы: адны імкнуцца пайсці дадому крыху раней, а другія затрымацца даўжэй. Як правіла, прадстаўнікі абодвух тыпаў паміж сабой знаходзяцца ў шлюбе.

☺

— Ну і як яна ў пасцелі?

— Не дзяўчына — ураган.

— Наляцела, паклала і ўсю ноч бушавала?

— Не — пашумела, скруціла і ўцякла!

☺

— Доктар, а па якіх прыкметах можна вызначыць развіццё склерозу?

— Я вам гэта ўчора ўжо казаў...

☺

Сядзяць каля каміна Шэрлак Холмс і Місіс Хадсан. Шэрлак Холмс кажа:

— Місіс Хадсан, падайце, калі ласка, брэндзі!

— Бог падасць.

— Бога няма, місіс Хадсан!

— Бог ёсць, містэр Холмс!

— Бога няма!

— Няма Бога — няма брэндзі!

Сардэчна віншуем з 70-гадовым юбілеем любую матулю ***Святлану Васільеўну НІКАЛАЕВУ****.*

Хай будзе шчасце і здароўе, віруюць хай крынічкі сілы.
І кожны дзень, табой пражыты, хай будзе радасным і мілым.

Дочкі і зяці.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадр